№ 2 (456) 13 студзеня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

**Падпішыся сёньня!** Каб гарантавана чытаць «НН»: 1) дашліце ў Рэдакцыю свой дакладны адрас; 2) перакажыце на рахунак «НН» ахвяраваньне на выхад газэты. **Дэталі — старонка 9. Сьпіс ахвярадаўцаў «НН» — старонка 11.**

## Наш у Парыжы

Мілінкевіч у Парыжы — эфэктна. Гэты козыр уладзе няма чым крыць. А яна й ня будзе. «Паліткухня» Аляксандра Класкоўскага. **С. 24**.

Паліттэхналёгіі: хто зь імі найбольш эфэктыўна працуе ў Беларусі? **Старонка 24**.

**Сакрат Яновіч: «Хто пайшоў апроч Мілінкевіча — яны дурні або дывэрсанты»**
...Гэта ня тыя, папярэднія, сярод якіх было страшэнна многа лірыкаў, паэтаў... **Старонка 4.**

## Наш пляцдарм у Эўропе

Спэцыяльны нумар «НН», прысьвечаны Падляшшу. **Старонкі 14—23, 30—36.**

## Звон Свабоды




адліты і мае быць прэзэнтаваны 25 сакавіка на плошчы Свабоды. Старонка 5.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У нумары:

**факты і камэнтары**
Наш у Парыжы. Візыты Аляксандра Мілінкевіча ў Польшчу і Францыю ... 4
Радыё «Апошні момант» ... 4
Сакрат Яновіч аб прэзыдэнцкіх выбарах ... 4
Звон Свабоды адліты ... 5
Казулін далучыцца да Вайтовіча? ... 6
Чаргінца падвяло славалюбства ... 6
Севярынца адправілі на лесапавал 6
Студэнтаў больш не пускаюць за мяжу ... 6
Прыклад братоў-чэхаў ... 6
Курбан-Байрам ... 7

**пішуць чытачы**
Гайсёнак не верабей ... 8
«Менскі вэрнісаж» адышоў да… Камароўкі ... 8

**мы самі**
Геаграфія падпісчыкаў «НН» ... 9
Увазе падпісчыкаў «НН»!!! ... 10
Падзякі ахвярадаўцам ... 11

**хроніка**
Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Сітна і сатана ... 12
Сьціслая хроніка рэпрэсій і супраціву ... 12

**культура**
Г'ю Грант загаварыў па-беларуску ... 14
Курэйчык хоча «без палітыкі» ... 14
Сьмерць на Каляды ... 14
Кінг Конг супраць савецкіх дэсантнікаў. Вынікі кінагоду-2005 ... 15

**Падляскі нумар «НН»**
Зьміцер Дзядзенка. Наш плянцдарм у Эўропе ... 16
Руслан Бацянкоў. Бяз грыфу «сакрэтна» ... 17
Андрэй Скурко. Маленькая скварка ў вялікай кашы. Ці пачнецца зь Беласточчыны праваслаўнае адраджэньне Беларусі? ... 19
Руслан Равяка. Калгасны заробак 500 эўра: як сяляне-беларусы прыстасаваліся да жыцьця ў Эўразьвязе ... 20
Алег Гардзіенка. Арарат беларускіх гісторыкаў ... 21
Андрэй Расінскі. Геаграфічная маргіналія, культурная мэтраполія ... 22

**палітычная кухня**
Аляксандар Класкоўскі. Парыж варты мэсыджу ... 24

**левым вокам**
Лёлік Ушкін. Закон хакею ... 25

**пошта рэдакцыі**
Лісты і водгукі ... 26
Працяг палемікі вакол Фрайбурскай лекцыі акадэміка Міхайлава ... 27

**іншымі словамі**
Віталь Тарас. Цені зьнікаюць ... 28

**паэтычны аглядальнік**
Белы крумкач на сьнезе. Аляксандар Фядута пра новыя кнігі Алеся Разанава ... 36

**літаратура**
Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы ... 40
Уладзімер Някляеў. Знакі прыпынку ... 42
Старонка вершаванага радка ... 43

**газэтка дзеткам**
Капітан Джанатан ... 44

**вольны час**
Шашкі ... 45

**дзе варта быць**
Варта паглядзець ... 46
Кіно на выходныя ... 46

**абвесткі і жарты**
«НН» 100 гадоў з вамі ... 48
Паштовая скрынка ... 48
Прыватныя абвесткі ... 48

**НАЖЫ** для акуратнага разразаньня паперы прапануе ЦУМ. Самы танны каштуе 550 рублёў, самы дарагі — 6000 рублёў.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

Перад 100-годзьдзем «Нашай Нівы» напрошваецца параўнаньні таго рэжыму і гэтага. Пры цару Мікалаю II асобныя нумары канфіскоўваліся, іншыя выходзілі зь белымі плямамі цэнзуры, але цар не забараняў распаўсюду беларускіх газэтаў.

У італьянцаў ёсьць прымаўка *cosa cara, cosa rara* — дарагую рэч цяжка здабыць. Найперш прашу цярпеньня. Сыстэма самараспаўсюду наладжваецца. На момант здачы гэтага нумару 99 працэнтаў папярэдняга тыражу разышліся. Што не дайшло — тое пераважна непаўніня адрасоў і чалавечыя памылкі. Тыраж друкуем з запасам, кожны страчаны асобнік кампэнсуем. Газэта часам ідзе доўга. Непазьбежна будуць і збоі: «ідэалягічны працівнік» ня дрэмле.

Гэты нумар «НН» працягвае традыцыю спэцыяльных дасье — ён прысьвечаны Падляшшу **(старонкі 16—23, 30—35)** і паўстаў, дзякуючы нашым калегам зь беластоцкай «Нівы», што запрасілі групу нашаніўцаў да сябе. Рэпартажы пісаліся ў лістападзе, а выходзяць друкам акурат пасьля сустрэчы ў Гайнаўцы Аляксандра Мілінкевіча з польскім прэм'ерам Казімежам Марцінкевічам, пра што мы таксама інфармуем **(старонка 4)**. Ня ўсе матэрыялы з вандровак трапілі ў газэту. Іншыя можна прачытаць на адмысловым сайце, створаным па выніках праекту www.polszcza.com.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
**Наклад 2421.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 01.30 12.01.2006.
Замова № 197.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а



GRZEGORZ DAMBROWSKI



WWW.MILINKEVICH.ORG

**6 студзеня кандыдат у прэзыдэнты Беларусі ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся з прэм'ер-міністрам Польшчы Казімежам Марцінкевічам (на фота зьверху). Спатканьне адбылося ў Гайнаўцы, гарадку на ўсходзе Польшчы, дзе жывуць беларусы. За адным сталом з палітыкамі сядзеў старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы Яўген Вапа. А 9 студзеня А. Мілінкевіч нанёс візыт у Парыж для сустрэчы зь міністрам замежных справаў Францыі Філіпам Дуст-Блязі (зьлева). Што азначае гэты неспадзявана высокі ўзровень кантактаў новага лідэра антылукашэнкаўскай апазыцыі?** **Старонка 4.**

# Наш у Парыжы

6 студзеня Аляксандар Мілінкевіч наведаў зь візытам Беласточчыну. 9 студзеня яго прымалі ў Парыжы.

Адзіны, паводле ягонай прэс-службы, ехаў на Беласточчыну з «рэлігійнай» місіяй — павіншаваць суайчыньнікаў з Калядамі. Але так «выйшла», што ў Гайнаўку адначасова прыехаў прэм'ер-міністар Польшчы Казімеж Марцінкевіч. Пасьля сустрэчы з А.Мілінкевічам польскі прэм'ер зьеў куцьцю на калядным вячэры, арганізаваным Беларускім саюзам у Польшчы. Сп.Марцінкевіч таксама сустрэўся зь япіскапам Якубам, наведаў сабор Сьв. Мікалая.

На сустрэчы з польскім прэм'ерам А.Мілінкевіч падкрэсьліў, што «адзіна правільнай формай зьмены ўлады ёсьць справядлівыя выбары з роўнымі для ўсіх умовамі». Таму, «калі Лукашэнка пойдзе на фальшаваньне, мы выйдзем бараніць свой выбар на вуліцы», — дадаў ён.

Ці ёсьць у новага польскага ўраду нейкія адмысловыя рэцэпты ўплыву на беларускую сытуацыю? Бадай, ніякіх. К.Марцінкевіч паабяцаў падтрымаць адкрыцьцё радыёстанцыі, якая будзе вяшчаць на заходнюю частку Беларусі, а таксама адправіць на выбары ў Беларусь як мага больш назіральнікаў.

Праз тры дні пасьля паездкі да суайчыньнікаў на Падляшшы А.Мілінкевіч накіраваўся ў Францыю. Там ён сустрэўся зь міністрам замежных справаў гэтай краіны Філіпам Дустам-Блязі, дэпутатамі парлямэнту. У аўторак 10 студзеня ён даў прэс-канфэрэнцыю для карэспандэнтаў газэтаў «Монд», «Лібэрасьён», «Фігаро» і запісаў інтэрвію каналу «Эўраньюз». Яго дэманстравалі з шматлікімі паўторамі ў аўторак і сераду.

На тэлебачаньні А.Мілінкевіч трымаўся вельмі спакойна. Ягоныя пастуляты былі такія: Беларусь будзе мець бліскучыя адносіны як з Расеяй, так і з Эўропай, а галоўнае адрозьненьне ад сёньняшняга дня будзе ў тым, што беларусы пазбавяцца страху, які пануе ў краіне.

А.Мілінкевіча прымалі прэзыдэнт Літвы, прэм'ер Польшчы, міністры замежных справаў Украіны й Францыі. Наколькі вядома «НН», чакаецца яшчэ некалькі спатканьняў на самым высокім узроўні. У свой час кандыдаты Пазьняк, Чыгір ці Ганчарык такога ўзроўню сустрэчаў ня мелі. Так не сустракаюць «аднаго з кандыдатаў». Высокая ступень даверу да А.Мілінкевіча — гэта сыгнал, што дэмакратычны сьвет разглядае яго легітымным лідэрам Свабоднай Беларусі — той, што пакуль у апазыцыі.

**Сямён Печанко**

### Графік Аляксандра Мілінкевіча

Студзень Аляксандар Мілінкевіч ізноў праводзіць у паездках. 12 студзеня адзіны прэтэндэнт накіруецца ў Коханава й Воршу. 13-га ён будзе ў Віцебску, 14 студзеня — у Глыбокім, 15 — у Маладэчне й Вялейцы, 17 — у Слоніме й Ваўкавыску, 18 — у Лідзе й Воранаве, 19 — у Смургонях і Ашмянах, 20 — у Шклове й Горках.

### Сакрат Яновіч: «Хто апроч Мілінкевіча — тыя дурні або дывэрсанты»

**Якое ўражаньне зрабіў Мілінкевіч на беларусаў Польшчы? Гаворыць пісьменьнік Сакрат Яновіч:**

Уражаньне вельмі добрае. Ён першы сярод апазыцыйных палітыкаў, які ўмее думаць. Гэта ня тыя, папярэднія, сярод якіх было страшэнна многа лірыкаў, паэтаў. Палітыка патрабуе лёгікі.

Мяне й радуе, і непакоіць, што ёсьць канкурэнцыя. Скажыце тым дэмакратам, што пайшлі, апроч Мілінкевіча, што яны — дурні й дывэрсанты, бо дзейнічаюць на карысьць рэжыму. Цяпер можна гуляць толькі на Мілінкевіча. Калі пойдзе адзін Мілінкевіч, дык у яго ёсьць шанец адыграць у гісторыі Беларусі істотную ролю. Але калі ў бюлетэнях зьявяцца яшчэ пару дурняў, дык тады гэта будзе такі сабе палітычны фальклёр, курам на сьмех. Тады прайграем. У нас і так беларусаў замала, людзі кіруюцца чаркай ды скваркай. Трэба нам яшчэ недзе 20 год, каб стаць нацыяй. Гістарычных працэсаў не прысьпешыш, а замарудзіць можна. Калі прайграем — дык будзе ганьба й зноў дэпрэсія. Трэба на аднаго працаваць, ужо ня важна, горшы ён ці лепшы. Але ён ужо — адзіны магчымы.

# Радыё «Апошні момант»

Паўстане новае беларускае радыё. Гэта будзе незалежная станцыя, вяшчаць яна будзе з Польшчы. Гаворка ідзе пра ультракароткія і сярэднія хвалі. Ультракароткія можна будзе чуваць на захадзе Беларусі. Прыём сярэдніх складанейшы, але яны дабіваюць далей.

Уласьнікамі радыё будуць беларусы. Варшаўскі ўрад абяцае датацыі, радыё таксама спадзяецца на прыватныя фундацыі. Бюджэт гадавога праекту вымяраецца ў сотнях тысяч даляраў.

Старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы Яўген Вапа настроены аптымістычна: «Калі пра стварэньне каналу заяўляе сам прэм'ер, то варта верыць у яго жыцьцяздольнасьць». Гэта ён пра заяву, зробленую прэм'ерам Польшчы Казімежам Марцінкевічам з нагоды візыту да беларусаў у Гайнаўку. Было заяўлена, што новая радыёстанцыя пачне надаваць «у бліжэйшыя тыдні». Тыдзень мінуў — і нічога.

Меркаваны дырэктар радыё, экскіраўнік «Радыё 101,2» Зьміцер Новікаў, махае рукою: «Ня вызначаны ні фармат вяшчаньня, ні нават назва каналу. Вакол праекту заангажавана шмат амбітных людзей, кожны зь якіх мае ўласны погляд на будучае прадпрыемства». Новая станцыя зьявіцца ў этэры толькі 20 студзеня ці 1 лютага. І то, мусіць, спачатку толькі ў Інтэрнэце.

За ідэю вяшчаньня з Польшчы змагаліся дзьве групоўкі антаганістаў. Адны настойвалі на фармаце грамадзка-палітычнай радыёстанцыі — на ўзор «Свабоды», але недзяржаўнай. Другія выступалі за больш займальна-музычны фармат. А рабіць ім, відаць, давядзецца ў адной запрэжцы.

Паводле інфармацыі «НН», на будучым радыё будуць працаваць журналісты зачыненых недзяржаўных газэтаў, рок-музыкі і нават адзін былы супрацоўнік АНТ. Цяпер яны праходзяць навучаньне на ўкраінскіх радыёстанцыях, дзе іх трэніруе былы праграмны дырэктар «Альфа-Радыё» Сяргей Кузін.

**СП; ЗД**

### Эўрарадыё імя сьвятога ніколі

Адначасова працягваецца марока з тэндэрам Эўракамісіі на вяшчаньне для Беларусі. Апошні этап тэндэру (ёсьць 4 прэтэндэнты) яшчэ не адбыўся, таму эўрапейскае радыё пачне працаваць, найхутчэй, толькі пасьля выбараў.

# Адліты Звон Свабоды

Яго прэзэнтацыя мае адбыцца 25 сакавіка на плошчы Свабоды.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пачатак году прынёс радасную навіну: рэалізаваная ідэя стварэньня Звона Свабоды. Аўтарамі праекту выступілі Алесь Марачкін і **Алесь Шатэрнік (на фота)**, а шматлікія дабрадзеі ахвяравалі на яго сродкі. Іх імёны знойдуць сваё пачэснае месца на старонках своеасаблівай кнігі гонару.

Да працы прыступілі яшчэ ўвосень 2004 г., запланаваўшы прэзэнтаваць звон грамадзкасьці вясной 2005 г. — да Дня Волі. Аднак зьдзейсьніць задуманае ў час не ўдалося. У ходзе працы ўзьнікалі новыя ідэі. Давялося, напрыклад, перабіваць надпісы. Цяпер на баках выбітыя выказваньні славутых беларусаў пра свабоду: «Нічога ня маець быці дарожшага над вольнасьць» — Леў Сапега, 1588; «Жыві ў Свабодзе» — Кастусь Каліноўскі, 1864; «Толькі свабода» — Васіль Быкаў, 2003. Ёсьць намер у дадатак да іх выгравіяваць яшчэ надпісы-цытаты зь Бібліі Скарыны і ІІ-й Устаўной граматы БНР. Апроч надпісаў, звон упрыгожваюць дзьве выявы «Пагоні» — вялікі герб трымаюць анёлы, над шчытом разьмешчаная карона.

Звон вагою ў 110 кг адліты з бронзы. Сплаў зьмяшчае 80% чырвонай медзі і 20% волава. Для паляпшэньня гучаньня была прыменяная спэцыяльная тэхналёгія ліцьця: сплаў медзі і волава разьмешвалі бярозавым кіем — бярозавае вугольле адсарбуе непатрэбныя дамешкі. Гучаньне звона адпавядае гуку ноты рэ-бэмоль.

У краінах Эўропы і ў Амэрыцы многія гарады і мястэчкі маюць свае званы, якія разьмяшчаюць у найбольш людных месцах.

За саветамі Беларусь страціла шмат якія традыцыі, а традыцыя званоў зьвялася хіба толькі да выкарыстаньня іх у жалобных мэмарыялах. Звон Свабоды мае абвесьціць пра вызваленьне Беларусі і ад таталітарнай спадчыны таксама.

«Звон Свабоды — гэта сакральны нацыянальны сымбаль» — кажа Алесь Марачкін, — У «хрысьціянскім сьвеце званы звыкла клічуць, зьвіняць. Для Беларусі Звон Свабоды — гэта новае формаўтварэньне. Пройдуць выбары, і па іх жыцьцё ня скончыцца. Застанемся мы, Звон, і настане час, калі на цэнтральным пляцы гораду мы яго ўсталюем на адмысловай стэле».

У якасьці варыянту разьмяшчэньня звона разглядаецца пляц Свабоды. Маюцца далекасяжныя пляны адбудовы царквы Ўсіх Сьвятых, якую і мог бы аздобіць звон. Альбо аднаўленьне гадзіньнікавай вежы на тым жа пляцы.

А пакуль ёсьць ідэя сымбалічнага ўзьняцьця звона на часовую канструкцыю. Зрабіць гэта маюць паважаныя ў грамадстве людзі. 10 студзеня ініцыятыўная група, у якую ўваходзяць навукоўцы, мастакі, літаратары, палітыкі і рок-музыкі, абвесьціла дату і месца прэзэнтацыі Звона Свабоды — 25 сакавіка 2006 г. на пляцы Свабоды.

**Сямён Печанко**

**Філадэльфійскі звон**

стаў называцца Звонам Свабоды пасьля таго, як 8 ліпеня 1776 яго звон абвесьціў пра незалежнасьць ЗША. У гэты дзень у яго званілі штогод, пакуль у 1836 падчас пахаваньня галоўнага судзьдзі Вярхоўнага суду не раскалоўся. Яго зьмясьцілі ў музэй штату Пэнсыльванія, дзе ён знаходзіцца і па сёньня.

**Ініцыятыўная група беларускай інтэлігенцыі**

зьвяртаецца да ўсіх беларусаў у краіне і па-за яе межамі з просьбай дапамагчы ў годнай справе — аказаць фінансавую падтрымку ў вырабе і ўстаноўцы Звона Свабоды. Па ініцыятыве групы інтэлігенцыі адліты Звон Свабоды, які стане нацыянальным сымбалем Беларусі. На ім выяўленыя біблійныя словы пра Свабоду, пасланьні нашых вялікіх продкаў. Звонам Свабоды будуць распачынацца найбольш значныя акцыі і мерапрыемствы грамадзкасьці Беларусі.

**Тэлефоны для кантактаў:**
МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» +375 17 289 31 94
Аляксей Марачкін +375 17 210 13 93

# Чаргінца падвяло славалюбства

Брытанская амбасада «выкрыла» генэрала Чаргінца, які расказаў «Інтэрфаксу», што Кембрыдзкі ўнівэрсытэт надаў яму званьне «Палітык году — 2005» і залаты мэдаль за дасягненьні ў прафэсійнай палітыцы. Мэдалём генэрал цешыўся нядоўга: брытанскае пасольства распаўсюдзіла прэсрэліз, што «на ўзроўні ўнівэрсытэту няма праграмы ўзнагароджаньня палітыкаў такога кшталту».

Генэрал, мусіць, трапіў на кручок звычайных махляроў. Найхутчэй, гаворка ідзе пра кантору пад назваю «The International Biographical Centre of Cambridge». Яны сапраўды месьцяцца ў Кембрыджы, але да ўнівэрсытэту ня маюць дачыненьня. Яны знаходзяць адрасы дзеячаў рознага калібру і рассылаючы лісты прыкладна такога зьместу: за вашы выдатныя дасягненьні наша крутая кантора вас абрала чалавекам году; калі хочаце дыплём (ці мэдаль), які пра гэта сьведчыць, — пералічыце грошы, вышлем. Грошы адносна невялікія — даляраў сто. У Беларусі на гэта шмат хто купляўся на пачатку 1990-х, а пасьля разабраліся што да чаго.



**Аркадзь Шанскі**

# Севярынца адправілі на лесапавал

З 11 да 17 студзеня палітссыльны Павал Севярынец будзе «стажыравацца на лесапавале» з тым, каб пасьля там працаваць. Паўла яшчэ мацней адразаюць ад сьвету: дзялянкі знаходзяцца за 10—20 км ад населеных пунктаў, аніякай сувязі. Паўлаў бацька, Кастусь Севярынец, зьвязвае перавод сына з хуткімі выбарамі. «Яшчэ раней Паўла перавялі яго на другую зьмену, з 16-й па 24-ю гадзіну, пазбавіўшы магчымасьці харчавацца ў сталоўцы». Бацькі распаўсюдзілі заяву, у якой папярэджваюць пра адказнасьць за лёс свайго сына начальніка лесапункту Ліліна.

**Сямён Печанко**



# Студэнтаў больш не пускаюць за мяжу

Для паездкі студэнта за мяжу на стаж ці навучаньне цяпер трэба дазвол зь Мінадукацыі. Аднак гэтых дакумэнтаў практычна не выдаюць. Так, у БДУ зрываюцца заплянаваныя на сакавік стажы ў Чэхіі студэнтаў-філёлягаў. Забарона накладзеная нават на выезды ва ўсходнім напрамку: не атрымаў дазволу стаж студэнтаў-фізыкаў у Дубне (Расея). Мо таму што прыпадае на сакавік.

Ад зрыву міжнародных дамоваў церпіць міжнародны імідж ВНУ і Беларусі.

**АШ**

# Казулін далучыцца да Вайтовіча?

БСДП(Г) прыняла заяву аб перадвыбарчай сытуацыі: партыя не выключае магчымасьці байкоту выбараў. Генэрал Грыб, што ўзначальвае штаб Аляксандра Казуліна, засакрэціў усе зьвесткі пра колькасьць подпісаў, сабраных за былога лукашэнкаўскага фаварыта. Гэта тлумачыцца тактычнымі патрэбамі. Трэба адзначыць, што збор подпісаў за ўсіх кандыдатаў ідзе нашмат марудней, чым таго спадзяваліся перад кампаніяй. Акрамя Лукашэнкі, што загадаў сваім паставіць рэкорд.

**АШ**

### Прыклад братоў-чэхаў

Па-беларуску выйшаў зборнік «Трансфармацыя. Чэскі досьвед». У кнізе можна пазнаёміцца з вопытам постсацыялістычных рэформаў у розных сфэрах: судовай сыстэме, эканоміцы, войску, міністэрстве ўнутраных справаў і службах бясьпекі, камунальнай сфэры, ахове здароўя, прафсаюзах ды інш. У дадатках выданьне мае «Закон аб люстрацыях» і «Закон аб незаконнасьці камуністычнага рэжыму і супрацьдзеяньні яму».

Беларуская вэрсія кнігі ўбачыла сьвет дзякуючы Ільлі Глыбоўскаму, Рыце Гаціх і чэскаму фонду «Чалавек у нядолі».

**АШ**

**Адрасы і час працы пунктаў збору подпісаў за Аляксандра Мілінкевіча:**

У г.Горадні:

Цэнтральны рынак — штодня, цягам дня

Рынак «Карона» — штодня, цягам дня

Рэгіянальны штаб (вул.Будзённага, 48–17) — штодня, цягам дня (кантактны тэлефон 639–93–37)

У г.Гомелі:

Цэнтральны рынак — штодня 10.00—16.00

Гатэль «Гомель» (Прывакзальная плошча) — штодня 10.00—16.00

Унівэрсам «Рэчыцкі» — штодня 10.00—16.00

Кінатэатар «Кастрычнік» — штодня 10.00—16.00

Тэл. для даведак: 8–029–652–00–10 (Валянціна Палевікова), 8–029–564–04–22 (Сяргей Вазьняк)

**Адрасы і час працы пунктаў збору подпісаў за Зянона Пазьняка ў г.Менску:**

Станцыя мэтро «Якуба Коласа» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Усход» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Акадэмія Навук» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Кастрычніцкая» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Плошча Незалежнасьці» (выхад на вакзал) — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Пушкінская» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Каменная Горка» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Партызанская» — штодня, цягам дня

Станцыя мэтро «Магілёўская» — штодня, цягам дня

Штаб-кватэра КХП–БНФ (прасп.Скарыны, 133—147) — штодня, цягам дня



**У сераду беларускія мусульмане адсьвяткавалі галоўнае гадавое сьвята — Курбан-Байрам. Іўе. 11 студзеня 2006 году. Фота Андрэя Лянкевіча.**

# Гайсёнак не верабей

У Гарадзенскім унівэрсытэце прайшла сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з намесьнікам міністра замежных справаў Віктарам Гайсёнкам. Перад сустрэчай студэнтаў заклікалі актыўна задаваць пытаньні. Варта адзначыць, што большасьць іх прыйшлася недаспадобы госьцю. Пыталіся ў яго пра Тацяну Хому і пра кантакты з урадам БНР. У першым выпадку намесьнік міністра «падтрымаў» пазыцыю рэктарату БДЭУ, а ў другім катэгарычна заявіў, што наша дзяржава з калябарантамі ніякіх кантактаў не падтрымлівала і найдалей не зьбіраецца (гэта пры тым, што старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла ў 1944 г. мела восем год).

Аднак, разьвітваючыся з аўдыторыяй, намесьнік міністра дадаў аптымізму прысутным — перайшоў на беларускую мову ды заклікаў аб'ядначаца дзеля супольных праблем, заўважыўшы, што «гуртам можна й бацьку біць». Аўдыторыя вітала ягонае выказваньне бурнымі авацыямі.

**Прысутны**

# «Менскі вэрнісаж» адышоў да... Камароўкі

Свабодным мастакам прапанавалі «добраахвотна» заключыць дагавор з Камароўскім рынкам ці вымятацца прэч з Кастрычніцкай плошчы.

Мастакам «Менскага вэрнісажу» падарылі ў сьнежні новы галаўны боль. Раней, каб гандляваць карцінамі ці рамеснымі вырабамі, дастаткова было зарэгістравацца прыватным прадпрымальнікам, рабіць адлічэньні «Асацыяцыі свабодных мастакоў» за карыстаньне камэрай захоўваньня ды іншыя дробязі. Цяпер патрэбна яшчэ плаціць і Камароўскаму рынку — невядома за што. Кожнаму прапанавалі «добраахвотна» заключыць дагавор з Камароўкай ці вымятацца прэч з Кастрычніцкай плошчы.

Рынак будзе браць за гандлёвае абслугоўваньне — 36 тыс. руб. Няцяжка падлічыць, што у такім выпадку за год мастакі аддадуць Камароўцы 40 тыс. даляраў. У дырэкцыі Камароўскага рынку сьцьвярджаюць, што, калі спадуць эмоцыі, людзі ўбачаць рэальную карысьць ад наваўвядзеньняў.

Цяпер пры жаданьні займацца продажам трэба з раніцы бегчы на Камароўку, там даведвацца, на якім месцы дазволяць гандляваць (калі ўвогуле дазволяць), і толькі пасьля ісьці на «Вэрнісаж» (напрасткі па карце 2 км) і выстаўляць свае карціны на продаж. Барацьба за месцы будзе яшчэ тая.

Мабыць, у хуткім часе на «Менскім вэрнісажы» гандляваць нашымі карцінамі і рамёствамі будуць уперамежку з апэльсінамі і кілбасамі. Менскіх мастакоў там, канечне, таксама можна будзе сустрэць — зь мётламі.

**Мастак**

**Беларускі каляндар на 2006 год яшчэ ў продажы.**



# Геаграфія падпісчыкаў «НН»

Гарады Беларусі, дзе больш за 10 падпісчыкаў «НН» (у парадку колькасьці падпісчыкаў, без уліку падпісчыкаў, якія жывуць у раёне)

**Менск** (59,4% ад агульнай колькасьці падпісчыкаў)
**Горадня** (4,6% ад агулу)
**Гомель** (3,4% ад агулу)
**Берасьце** (2,2% ад агулу)
**Магілёў, Віцебск** (2,0% ад агулу)
**Баранавічы** (1,8% ад агулу)
**Маладэчна** (1,4% ад агулу)
**Наваполацак** (1,2% ад агулу)
**Барысаў**
**Жодзіна, Полацак**
**Ворша** (уключаючы **Барань**)
**Вялейка, Жлобін**
**Пінск**
**Ваўкавыск**

Сярод не-гарадоў найбольш падпісчыкаў далі Івянец (Валожынскі раён) і пасёлак Лясны (Менскі раён).

Цікава, як падпісчыкі часам сканцэнтраваныя ў невялічкіх гарадах ці нават на асобных вуліцах — мусіць, дзе ёсьць актыўнае ядро грамадзянскай супольнасьці — як у Віцебску на вуліцы Чкалава, у Горадні на завулку Белуша, вуліцах Суворава, Дамброўскага й Таўлая, у Гомелі на вуліцах Сухога і Сялянскай, у Жодзіне на Гагарына.

Павелічэньне долі менскіх чытачоў у агульнай колькасьці проці мінулага году мы тлумачым падарэньнем газэты, а таксама меншай запалоханасьцю сталічнага жыхарства.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя **3015 212 000 012** Лицевой счет

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя **3015 212 000 012** Лицевой счет

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П.
Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Калі вы не атрымалі газэты

да панядзелка ўключна, а ў Менску — да суботы ўключна, канечне тэлефануйце ў Рэдакцыю.
**ПЫТАЦЦА АЛЯКСАНДРУ.**
Тэлефоны:
(017) 284-73-29
(029) 618-54-84
(029) 260-78-32

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» — 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# Увазе падпісчыкаў «НН»!!!

Некаторыя падпісчыкі «НН» пералічылі ахвяраваньні, але не даслалі адрасоў, абмежаваўшыся імёнамі. Так вы газэты не атрымаеце, даражэнькія. Вы, мусіць, думаеце, што вас уся краіна ведае. Не заўжды гэта так.

**Георгі Мікалаевіч зь вёскі Ранчыцы,** дашліце дакладны адрас, назву раёну й вобласьці. **Зьміцер К., Натальля А., Лідзія К. зь Менску,** што пералічылі ахвяраваньні, мы ня ведаем Вашых адрасоў. **Сп.Астроўскі з Аршанскага раёну,** як дакладна называецца Ваша вёска? **Леанід Мікалаевіч Н. з вул.Калініна,** калі ласка, паведаміце свой дакладны адрас. **Ахрамчук В.Г.,** калі ласка, дашліце свой адрас. **Алеся Юр'еўна М.** з Наваполацку, зь якой Вы вуліцы?

Пакідаючы жарты, кажам вам вялікі дзякуй, чытачы «НН». Вы аказаліся сапраўднымі грамадзянамі. З новага году падпісчыкаў «НН» паболела на 320, прычым адрасы й квіткі надыходзяць а надыходзяць.

Даць рады такой плыні няпроста. Таму будзьце ласкавы на будучыню дасылаць разборлівы й поўны адрас. Выконвайце наступныя парады:

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

## Дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

1) Просім усіх чытачоў «Нашай Нівы» **дасылаць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны.**
Т.: (017) 284-73-29, (029) 707-73-29, (029) 618-54-84, e-mail: nn@promedia.by, а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты.
**У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас.**
Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы.
Хто ж мае магчымасьць перакаазаць
36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

# Ахвяраваньні ад падпісчыкаў

Дзякуй Ігару Ш. зь Берасьця, які ахвяраваў на «НН» 60 тыс., Андрэю Б. з Клецку — 136 тыс., Паўлу Х. з Горадні, які цяпер у Варшаве, за 100 тыс.

Таксама дзякуй за ахвяраваньні:

М.Г. з Крошына.

Леакадзіі Н. з Валожынскага раёну.

Анатолю І. з Чэрвеню.

Валянціну Д., Аляксандру С. з Мар'інай Горкі.

Д.Л., В.Т., Ганьне Р. з Івянца.

Дзьмітрыю В. зь Мядзела.

Мікалаю Я. з Лагойскага раёну.

Сяргею К., Міхасю Р., Тадэвушу Ш. з Маладэчна.

Валер'ю Ю., Уладзімеру М. з Салігорску.

Ірыне З. з Жодзіна.

Натальлі І., Леаніду Е. з Пухавіцкага раёну.

Іне С., Сяргею С. з Барысава.

Антаніне К. з Крупак.

Сьцяпану А. са Стоўпцаў.

Сяргею Г., Віктару Г., Аляксандру Г., М.Н., Сяргею В. з Баранавічаў.

Галіне К. зь Ляхавіцкага раёну.

Арсеню Д. зь Берасьцейскага раёну.

Вользе К. з Лунінца.

Уладзімеру Л., Міхаілу У., Віктару З. зь Берасьця,

Л.К., Сяргею К. з Воршы.

Алегу Л., С.С. зь Мёрскага раёну.

К.Ш., Г.Р. з Браслаўскага раёну.

Юліі Е. з в.Поплава.

І.Х. з Глыбокага.

Міхаілу А., Стэфану Н., Аляксандру З., Д.Ш., Ю.К., Сяргею В., Аляксандру Р., Уладзімеру Г. з Навапалацку.

Вользе Г., Уладзімеру П., Міхалу Г., Сьвятлане Дз., Аляксею Ш. зь Віцебску.

Ігару К., Пятру С., Дзяніcу І. З., Г.С., Валер'ю К., Д.С., Сяргею Д., Алене М., В.К., Дзьмітрыю М., Андрэю Ч., Іне С., Эдуарду М., Івану Р., Аляксандру Т., Івану А., Э.Х., Алене А., Зоф'і В., Дзьмітрыю В., Антонію Д., Юр'ю Г. з Горадні.

Яну Г. з Гарадзенскага раёну.

Сяргею Д. і Сяргею П. зь Лідзкага раёну, Сьвятлане К., Сяргею Ч., А.Ч., Дзьмітрыю Н. зь Ліды.

Алесю З., Зьмітру К. з Мастоў.

Дар'і Л. з Смургонскага раёну.

Івану П., Андрэю Б., Вользе Ш. з Ваўкавыску.

Юр'ю М. з Кармянскага раёну.

Аўгіньні С. з Калінкавіч,

Міхаілу К. з Турава,

Ірыне Ц. з Жыткавіч,

Аляксандру С. і Мікалаю Ж. з Мазыра.

Аркадзю Л. з Жлобіна.

Валер'ю П. з Рэчыцы.

Андрэю Ч. з Рагачова.

Ларысе Р. зь Веткі.

Аўгіньні Я., Даніле О., Сяргею Т., Аляксандру Л., Дзьмітрыю П., Уладзімеру Б., Анатолю Л., Алегу М. з Гомелю.

Ніне А., Сяргею А. з Клімавічаў.

Мікалаю Д. з Асіповіцкага раёну.

Сяргею У. і Дзянісу Б. з Бабруйску.

Дзянісу С., Леаніду Д., Канстанціну К., Аляксандру Л., Вользе С., Васілю К., Генадзю С. з Магілёва.

А таксама падпісчыкам зь Менску:

А.К., А.Л., А.М., Аксане С., Алене К., Аляксандру З., Аляксандру П., Аляксандру Х., Андрэю Р., Аркадзю С., Аўгену Р., Аўгіньні К., Артуру Я., Вадзіму К., Валеру Ш., Валянціну П., Вользе К., Ганьне К., Е.Л., Ігару Ж., Зьмітру К., Зьмітру Л., Лідзіі К., Натальлі А., С., Сяргею К., Т.Г., Уладзімеру Дз., Яўгеніі Я., Івану Б., Крысьціне М., Паўлу М., К.К., М.Б., Мікалаю Б., А.К., Але Г., І.М., Сяргею Ф., В.А., Усеваладу С., Уладзімеру Ц., А.Г., Тамары К., Дзьмітрыю І., Уладзімеру М., Уладзімеру С., Л.І., Аўгену К., Аляўціне В., Р.Н., І.С., Л.В., П.Б., Канстанціну Л., Івану К., Аліцыі Ш., Зінаідзе К., Ю.Ш., Людміле Ц., Уладзімеру Г., Паўлу К., Алесю Г., Сяргею М., Іне К., К.С., А.С., Веры С., С.Ш., Ірыне З., В.Г., Э.З., Мікалаю Ш., В.Ж., Мікалаю М., В.В., Натальлі Ш., У.З., Галіне С., Зоі М., Анатолю П., Мікалаю Ш., М.К., З., Віталю С., Сьвятлане Г., Н.Ш., Анатолю К., Юр'ю Я., Сьвятлане Н., Віталю С., Канстанціну Ш., Валянціне Н., Тацяне В., Ігару Б., Мікалаю А., Тацяне В., Аляксандру М., М.А., Ірыне Ц., Аўгіньні Ц., Эдуарду К., Т.П., Дар'і В., Георгію Ш., Міхасю Б., Ігару Г., Алене К., Радзіму Г., Раману М., Віталю К., Ганьне Ф., В.Г., Маўлюдзе А., А.Е., Уладзімеру С., Сьвятлане К., Міхаілу А., Уладзімеру Б., Уладзімеру К., Тацяне Р., А.Л., Т.К., А.Л., А.П., Аляксандру Ш., Мікалаю А., Паўлу Л., Алене Г., Т.Н., Вользе Д., Марыі В., Фёдару К., І.Н., Людміле І., Юр'ю Ш., Сяргею К., Казімеру Г., Алене М., Альбэрту А., Ціне П., Віктару М., Эльяшу Б., Алесю Ш., І.С., Тацяне Б., Гэлене М., Г.С., Мікалаю С., Аляксандру Г., Аўгену К., Аляксандру К., Андрэю С., К.Д., Аляксандру С., Марыі К., Анатолю К., Рыгору Р., Н., Юр'ю Б., Марыне У., Аркадзю Б., Марыі Б., Аляксандру Б., І.Я., Д.Т., Андрэю Ю., Сяргею В., Маргарыце В., І.Г., Тацяне К., Вячаславу Б., С.Р., М.С., А.М., Ю.П., Канстанціну М., А.П., М.Л., В.Д., Зьмітру С., Я.А., Б., А.К., Ю.Г., Сьвятлане С., Аляксандру К., Ларысе Д., Л.К., Зьмітру В., Ю.Г., Марыі М., О.С., Аксане С., Рагнедзе А., Уладзімеру.

**Вельмі просім чытачоў, якія маюць намер ад Новага году чытаць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

**Рэшта сьпісу ахвярадаўцаў будзе друкавацца ў наступных нумарах. Чытачы, якія пералічылі ахвяраваньні ў разьліку толькі на адзін месяц, паклапаціцеся пра грошы на выхад «НН» у наступныя месяцы.**

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. А квіток ахвяраваньня трапляе да нас толькі праз 3—10 дзён.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Высланы на поўнач Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Сітна і

У Сітне часам хочацца крыкнуць: «Няўжо тут насамрэч *усё так кепска*?!» І чым далей, тым часьцей просіцца на язык: «праклятае месца». Насельнікі вёскі ня вераць у Бога. Затое кожны, узьняўшы палец угару, кажа: «Ёсьць жа нейкая вышэйшая сіла!» Тут сьвята вераць *у порчу, сурок і чорную магію*, тут уважліва чытаюць гараскопы на наступны тыдзень, спрабуючы разабрацца, у якім астрале супрацьстаяць адзін аднаму Ўран ды Юпітэр. Тут перакананыя, што на гары на ўезьдзе ў Сітна, дзе часьцяком б'юцца машыны, *чорт жыве*. Але сапраўдны тутэйшы *бог* існуе ў вадкім агрэгатным стане і мае моц 40 градусаў, а то і вышэй.

У навакольлі буяе распуста: да мужыкоў, якія адкрыта, на ўзор мармонаў, жывуць зь дзьвюма, а то й трыма «жонкамі», тут стаўяцца гэтак жа цярпіма, нават спачувальна, як і ў Эўропе да гомасэксуальных шлюбаў. У ветрынскай спэцкамэндатуры на сьцяне дзяжуркі — тры фатаздымкі. За апошнія некалькі месяцаў у раёне знойдзеныя трупы трох дзяўчат, падазраваных у прастытуцыі на трасах. Нікога гэта не палохае й не выклікае чутак пра ма-

**Адрасы і час працы пунктаў збору подпісаў за Аляксандра Мілінкевіча ў г.Менску:**

Станцыя мэтро «Ўсход» — штодня 15.00–17.00
Станцыя мэтро «Інстытут культуры» — па цотных днях 15.00–17.00
Прыпынкавы пункт «Дружная» — па няцотных днях 17.00–19.00
Унівэрсам «Цэнтральны» — штодня 12.00–14.00
«Гандлёвы дом на Нямізе» — штодня 12.00–14.00
Лінгвістычны ўнівэрсытэт — будныя дні 14.00–16.00
Станцыя мэтро «Трактарны завод» — будныя дні 14.00–16.00
Гандлёвы цэнтар «Імпульс» — штодня 15.00–19.00
ЦУМ — штодня 12.00–15.00
Супэрмаркет «Серабранка» — штодня 15.00–18.00
Рынак «Максымус» – выходныя дні 11.00–15.00
Рынак «Маскоўскі» — выходныя дні 11.00–15.00
Унівэрмаг «Беларусь» — штодня 15.00–18.00

## СЬЦІСЛА

### «Народную волю» бяруць на змор

3 студзеня міліцыянты Дубровенскага райаддзелу затрымалі на расейскай мяжы ўвесь наклад газэты **«Народная Воля».** Выданьне вызвалілі праз суткі.

9 студзеня ў Рудні на беларуска-расейскай мяжы зноў затрымалі наклад чарговага нумару «НВ». Яго лёс на момант здачы нумару ня быў вырашаны. Рэдактар «НВ» Язэп Сярэдзіч зьвярнуўся зь лістом да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай зьлітавацца над газэтай.

### Рэпрэсіі супраць камуністычных актывістаў

Актывіста ПКБ **Анатоля Ільінчыка** затрымалі ў Гомелі 31 сьнежня, калі ён раскладаў па паштовых скрынях газэту «Товарищ» і ўлёткі пра Мілінкевіча.

Каля Жлобіна 5 студзеня ДАІ затрымала аўтамабіль актывіста ПКБ **Валера Рыбчанкі** й канфіскавала 10 800 каляндарыкаў з выявай А.Мілінкевіча. 6 студзеня ДАІ затрымала ў Гомелі машыну **Андрэя Кары** й канфіскавала 20 тыс. аналягічных каляндарыкаў.

### Ня вырву, дык паторгаю

**Аляксандра Аўсяенку**, прадстаўніка ініцыятыўнай групы А.Мілінкевіча ў Пінску, затрымалі 3 студзеня двойчы: сьпярша зьвінавацілі ў фальшывым пасьведчаньні, а потым запатрабавалі на праверку паперы . 4 студзеня яго затрымалі, зьвінаваціўшы ў «антысанітарыі»: падставай міліцыянты палічылі стол, крэсла й паперы зьбіральніка подпісаў.

У Баранавічах 6 студзеня міліцыя правялаператрус на кватэры **Ўладзімера Гундара**, зьбіральніка подпісаў за А.Мілінкевіча, пры адсутнасьці гаспадара: у яго забралі на экспэртызу аргтэхніку паводле крымінальнай справы, распачатай у 2000 г. Гундара падазраюць у крадзяжы.

4 студзеня ў Слуцку **Алу Пятрову** выклікалі ў міліцыю: начальніка ГРУУС цікавіла работа ініцыятыўнай групы А.Казуліна.

Студэнтаў Дзяржаўнага інстытуту кіраваньня й сацыяльных тэхналёгій БДУ **Вольгу Штуцько** й **Антона Пагарцава**, актывістаў групы А.Казуліна, 4 студзеня папярэдзіў намесьнік дэкана па выхаваўчай рабоце, каб не зьбіралі подпісы ў студэнцкіх інтэрнатах.

Ініцыятыўнай групе **З.Пазьняка** 5 студзеня не далі зьбіраць подпісы ў пераходах каля мэтро.

9 студзеня ў Калінкавічах **Аляксей Маневіч** і **Дзяніс Рабянок**, зьбіральнікі подпісаў з групы А.Мілінкевіча, падалі скаргу раённаму пракурору на міліцыянтаў: напярэдадні ўзброеныя аўтаматамі міліцыянты затрымалі іх, не зважаючы на пасьведчаньні Цэнтравыбаркаму.

### У Жодзіне

Жодзінскія ўлады 26 студзеня пастанавілі пазбавіць рэгістрацыі гарадзкую філію ТБМ. Афіцыйная падстава — адсутнасьць юрадрасу.

### У Сьветлагорску

Сьветлагорскі райсуд 30 сьнежня прысудзіў **Тэльману Масьлюкову** штраф у 15 базавых адзінак (435 тыс. руб.) за парушэньне парадку распаўсюду друкаваных выданьняў. 6 студзеня міліцыянты затрымалі сп.Масьлюкова на вуліцы й канфіскавалі ў яго 297 асобнікаў газэты «Рэгіянальныя навіны» і 1289 навагодніх паштовак зь віншаваньнем ад А.Мілінкевіча.

4 студзеня ў судзе Сьветлагорску **Мікалаю Міхалькевічу** прысудзілі штраф у 170 тыс. руб. за ўдзел 16 сьнежня ў Дні салідарнасьці.

### Палякам па шапцы

Галоўнага рэдактара часопісу «Głos znad Niemna na uchodzstwie» **Анджэя Пісальніка** й галоўнага рэдактара часопіса «Magazyn Polski» Андрэя Пачобута аштрафавалі 5 студзеня на 10 б.в. кожнага (290 тыс.) — за парушэньне парадку перабываньня ў памежнай зоне: 26 сьнежня іх затрымалі каля Сапоцкіна, што ў Гарадзенскім раёне.

### Народны кантроль вочы коле

Актывістцы апазыцыі **Марыі Багдановіч** 5 студзеня пракурор Чыгуначнага раёну Гомелю Раманюк вынес афіцыйнае папярэджаньне за абразу судзьдзі: яе вінавацяць у вырабе ўлётак «Народны кантроль» з крытыкай судзьдзі Казачка, які аштрафаваў жанчыну за распаўсюд улётак супраць росту плацяжоў.

### Прафсаюз на «Азоце» запалохваюць

Актывісты **Беларускага незалежнага прафсаюзу** з ААТ «Гродна–Азот» 5 студзеня паведамілі, што дырэктар прадпрыемства даў загад у 3-дзённы тэрмін «вырашыць пытаньне» з БНП. Начальнікі цэхаў выклікаюць чальцоў прафсаюзу й прымушаюць пісаць заявы пра выхад з арганізацыі: у першы дзень заявы падалі 40 чалавек. Суполка БНП на «Гарадні-Азоце» налічвала 800 чальцоў, а яе лідэр Сяргей Антусевіч карыстаецца такім аўтарытэтам, што яго абралі дэпутатам гарсавету.

І пасьля гэтага ўлады будуць даказваць, што не ўціскаюць правоў прафсаюзаў.

### Леванеўскі галадае

**Валер Леванеўскі** 7 студзеня абвясьціў галадоўку пратэсту: ён патрабуе адмяніць несправядлівыя спагнаньні з боку адміністрацыі Івацэвіцкай калёніі — забарону на сустрэчу зь сям'ёй, на перадачы й куплю прадуктаў у турэмнай краме.

АШ

# сатана

ньякаў. Кажуць, звычайная справа, «абдарылі» кагосьці з дальнабойшчыкаў, вось тыя на зваротным шляху і расплаціліся.

Ад старасьці сіценцы звычайна не паміраюць. Вось толькі некалькі нядаўніх выпадкаў.

Падчас сваркі 50-гадовы муж да сьмерці зьбівае жонку; усю ў гузаках, сьсінелую, яе паказваюць фэльчару: маўляў, упала з даху.

Пасьля сумеснага з сужыцелькай, загадчыцай леспрамгасаўскай лазьні, расьпіцьця «максімкі» мужык ідзе ў тую самую лазьню й вешаецца на яе дзьвярох.

Хлопец зь дзяўчынай у вёсцы, падвыпіўшы, выяжджаюць пакатацца на матацыкле. Ля моста праз Палату абое разьбіваюцца насьмерць.

Пажылая кабета атручваецца «максімкай». Афіцыйная вэрсія: *сэрца*.

Так, сэрца! Бо менавіта «з сэрца выходзяць ліхія намыслы, забойствы, пералюбы, распуста, крадзяжы, ілжывыя сьведчаньні, зьнявагі, і гэта апаганьвае чалавека» (Мацьвей 15:19—20).

Калі мы хочам выгнаць сатану зь Сітна, з Полаччыны, з сэрца Беларусі ды з сэрцаў усіх беларусаў — тым, хто верыць у Бога й любіць сваю краіну, у 2006-м абавязкова трэба перамагаць.

*в.Малое Сітна*

Тут перакананыя, што на гары на ўезьдзе ў Сітна, дзе часьцяком б'юцца машыны, чорт жыве.




**Дыяна Чаркасава і Ўладзімер Мялешка, маці і айчым забітай журналісткі Веранікі Чаркасавай, зачытваюць ліст ад унука Антона Філімонава, які знаходзіцца ў СІЗА па падазрэньні ў падробцы грошай. Раней Антона спрабавалі зьвінаваціць у забойстве маці.**

# Г’ю Грант загаварыў па-беларуску

Пры канцы году пабачыў сьвет дыск «Любоў насамрэч».

Амэрыканскія і ангельскія акторы гавораць у ім па-беларуску. Стары рокер-наркот, амэрыканскі прэзыдэнт, закаханая сакратарка й вынаходлівыя дзеткі набылі галасы айчынных культурнікаў і грамадзкіх дзеячаў. Агучвалі карціну акторы Іван Шчытко і Юры Баранаў, драматург Анатоль Шурпін, «падарожнік-дылетант» Юры Жыгамонт.

Г’ю Грант прызнаецца ў каханьні голасам намесьніка старшыні ПБНФ Аляксея Янукевіча. Кіраўнік праекту Франак Вячорка «засьвяціўся» дубляжом порнаактора й кавалера-залётніка.

Хаця ня ўсе ўдзельнікі агучваньня прафэсійныя акторы, дубляж фільму атрымаўся надзвычай годным. «Мы падбіралі актораў згодна з узростам, характарам», — кажа Ф.Вячорка. Так, літаратар Сяргей Патаранскі, які быў гукарэжысэрам, уклаў у вусны свайго героя і ўласныя фразы, а журналіст «Свабоды» Ягор Маёрчык агучваў радыёжурналіста. Пераклад зрабіла выпускніца Беларускага ліцэю Натальля Базылевіч.

Ф.Вячорка кажа, што наступным беларускамоўным дыскам будзе фільм «Караль Вайтыла — гісторыя чалавека, які стаў папам».

**Андрэй Расінскі**




# Сьмерць на Каляды

28 сьнежня пахавалі кіраўніка камітэту архітэктуры й будаўніцтва Менгарвыканкаму Руслана Белагорцава. Яму было 60 гадоў.

Р.Белагорцаў да 1989 г. працаваў у ЦК КПБ інструктарам аддзелу будаўніцтва і гарадзкой гаспадаркі, потым перайшоў у Дзяржбуд БССР. Атрымаўшы ў 2003 г. пасаду першага архітэктара Менску, ён з запалам узяўся піярыць горадабудаўнічую палітыку ўлады. Пры ім пачалося будаўніцтва паркінгу на Нямізе й гатэлю «Эўропа», быў зьнішчаны дом па вул.Гандлёвай і дом Купалавай сям’і па вул.Румянцава.

Два гады дзейнасьці Белагорцава на пасадзе галоўнага архітэктара Менску пазначылі яго як адваката герастратаў: у гэтую эпоху стары Менск нішчылі так, як не руйнавалі з 1980-х. Ні палітычнага, ні маральнага капіталу з сваёй дзейнасьці Белагорцаў атрымаць не пасьпеў.

В.а. галоўнага архітэктара Менску прызначаны Віктар Нікіцін.

**Аркадзь Шанскі**

# Курэйчык хоча «без палітыкі»

Андрэй Курэйчык сыходзіць са складу заснавальнікаў «Свабоднага тэатру». «Палітычны складнік праекту пачаў дамінаваць над культурным — матывуе крок драматург. «СТ неабходны шлях нармальнага супрацоўніцтва з усімі тэатрамі, а не маргіналізацыя і сэктанцтва».

Адзін з заснавальнікаў СТ Мікалай Халезін назваў заяву Курэйчыка кур’ёзам. «Нельга выйсьці з праекту, калі ў яго не ўваходзіў. Курэйчык быў толькі сябрам журы падчас конкурсу, а далей працы ня вёў».

Рэжысэр праекту Уладзімер Шчэрбань кажа шчырэй: «Мы творым актуальны, агрэсіўны і андэграўндны тэатар. П’есы Андрэя Курэйчыка акадэмічныя й кансэрватыўныя. Няма палітычных чыньнікаў — мы займаемся тэатрам, паставілі тры новыя п’есы і ладзім майстаркласы».

**Андрэй Расінскі**

2005-ты кінагод запомніцца «Кінг-Конгам», «9-й ротай» і «Колерам каханьня». Піша Андрэй Расінскі.

# Кінг Конг супраць савецкіх дэсантнікаў



Распачаты **III эпізодам «Зоркавых войнаў»** год завершыўся анархісцкім бунтам **«Кінг Конга»**. Малпа прынесла трыюмф хулігану Пітэру Джэксану. Новазэляндзкі самародак, які пачынаў з трэшу, пасьля «Ўладара пярсьцёнкаў» трывала заняў галівудзкую кінавяршыню.

Іншыя рэжысэры таксама «выпісалі» імпэрыям. **«Браты Грым»** Гіліяма патапталіся па «стабільнасьці і парадку», а паэтычнае анімэ **«Хадзячы замак»** Міядзакі працяты антываенным духам. У недаацэненай **«Вайне сусьветаў»** Сьпілбэрга трыюмфуюць годнасьць асобы й сямейныя каштоўнасьці. І толькі **«Горад грахоў»** Робэрта Радрыгеса, стылёвы й чорны, захлынаецца індывідуалізмам, трызьніць кашмарамі коміксаў і шакуе сьмерцю.

Мінулы год быў адметны таксама вяртаньнем Джорджа А.Рамэра да культавай зомбі-сагі. **«Зямля мёртвых»** здымалася пад дахам студыі «Юнівэрсал», што сьведчыць пра трансфармацыю пэрыфэрыйнай раней тэмы ў мэйнстрым.

У расейскае кіно вярнуўся імпэрскі дух. А калі ўлічыць, што імпэрыя сканала 15 гадоў таму, самі разумееце, чым гэты дух сьмярдзіць. **«Стацкі саветнік»** — сапраўды зьмярцьвелая карціна, героі якой дзейнічаюць па канонах фільму жахаў. **«9 рота»** — імпэрская мітатворчасьць. Нават такі ўнікальны жанр, як дакумэнтальная фікцыя (**«Першыя на Месяцы»** Аляксея Фядорчанкі) прасякнуты тугой па сталёвай эпосе.

Калі расейцы мроілі сваю былую веліч, то эўрапейцы разьбіраліся з каляніяльным мінулым. Страхі французаў абыграны ў камэрцыйнай **«Імпэрыі ваўкоў»**, у якой злы паліцыянт зьнішчае турэцкіх тэрарыстаў. Блізкую тэму ўзьнімае і абсалютна некамэрцыйны аўстрыец Міхаэль Ханэке. Сваімі статычнымі 15-хвіліннымі кадрамі ён дасьледуе ў **«Стоеным»** каляніяльную віну і сон посткаляніяльнага сумленьня.

Посткаляніяльны ў сваім духу і найлепшы беларускі фільм мінулага году — стужка Аляксандра Канановіча **«Колер каханьня»**. Вадэвільная лёгкасьць кароткай стужкі складаецца з прыколаў нашай сталіцы, шматмоўя, сьпеву Вольскага, каляровага Пятра Юрчанкова-малодшага, лятучай каровы і г.д. Усё разам гэта сьвежа і ў кантэксьце.

Агульная ж колькасьць беларуская кінапрадукцыі застаецца мізэрнай. Летась у Беларусі было створана ўсяго 2 поўнафарматныя фільмы.

**18 студзеня (серада) — прэзэнтацыя альбому «Жыць для Беларусі» (на вершы Л. Геніюш). Бяруць удзел Віктар Шалкевіч, Зьміцер Бартосік, Алесь Лось, «Жаба ў каляіне», П.Л.А.Н., ZIgZAG. Менск, Дом літаратара (вул.Фрунзэ, 5). Пачатак а 18.30. Уваход вольны. Разам з дыскам будзе прэзэнтаваная кніга «Каб вы ведалі», якая ў рэйтынгу «НН» была прызнаная кнігай году-2005.**



# Наш пляцдарм у Эўропе

Ніштo іх не трымае беларусамі — толькі гонар. Зьміцер Дзядзенка — пра беларусаў Беласточчыны.

Галоўны рэдактар беластоцкай газэты «Ніва» Яўген Вапа кажа, што раней Польшчай кіравалі «левыя» беларусы, а цяпер пачынаюць кіраваць беларусы «правыя»: «Бацька Цімашэвіча родам з-пад Ваўкавыску, у Квасьнеўскага маці з Глыбоччыны. Сям'я сёньняшняга прэм'ера Марцінкевіча — з Усходняй Беларусі. Бацька Качыньскіх працаваў на чыгунцы ў Баранавічах. Яшчэ Пілсудзкі казаў, што палякі ня ўмеюць кіраваць Польшчай». Але, паводле Вапы, беларусам Польшчы ніякай карысьці ад такой «беларускай» улады няма.

Беларускую мову ў Беластоку можна пачуць яшчэ радзей, чым у Менску. У вёсках на Падляшшы яна гучыць. Аднак беларускія вёскі тут нешматлюдныя: жывуць пераважна старыя. Гісторык Яўген Мірановіч кажа: «Сапраўдных гаспадароў, фэрмэраў — адзінкі два на вёску».




У суседніх зь беларускімі польскіх гмінах насельніцтва больш, і працэнт маладых там большы. Мірановіч лічыць, што прычынай ёсьць палітыка, якую праводзілі польскія ўлады ў 1970-х: «На 1000 жыхароў усходніх гмінаў інвэстыцый у будаўніцтва дарог, разьвіцьцё адукацыі, мэдыцыну — было ў 3—4 разы менш, чым у заходніх гмінах ваяводзтва. Таму і людзі заставаліся, дзе былі дарогі, умовы для жыцьця, месцы для працы».

### Беластоцкая мімікрыя

У гарадах беларускай мовай публічна не карыстаюцца — каб не вылучацца з асяродзьдзя. Пісьменьнік Сакрат Яновіч кажа, больш даймае неталерантнасьць навакольных, чым асыміляцыйныя працэсы: «Калі я ў Варшаве ці Шчэціне, я ня думаю, што я беларус. А Беласток — горад вельмі халопскі. Гэта неталерантны, ультракаталіцкі горад».

Яўген Вапа больш радыкальны: «Талерантнасьць у нас такая: твая беларускасьць можа быць толькі справай прыватнай. А беларуская меншасьць хоча быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Мы такія ж грамадзяне гэтага краю. Трэба, каб людзі адчулі, што беларуская мова можа быць ня толькі хатняй, але і публічнай».

Няма салідарнасьці ў беларускім асяродзьдзі. Дэпутат сойму ад «лявіцы» Яўген Чыквін лічыць, што нацыянальныя праблемы хвалююць толькі інтэлігенцыю: «Тыя, хто называе сябе «рускімі» ці «тутэйшымі», ня хочуць адрозьнівацца ад навакольных. Польская культура больш выгадная. Беларускасьць — гэта стыгмата, яе хаваюць як фізычнае калецтва». Зрэшты, такая мімікрыя многім усё адно не ўдаецца: Я. Чыквін кажа, што ў дэпутацкай рабоце сутыкаўся з выпадкамі звальненьня з працы па нацыянальных і рэлігійных прычынах — і ў 1990-я, і цяпер. Зь іншага боку, дэпутат бачыць у гэтай сытуацыі й віну саміх беларусаў: «Мы занадта схільныя падкрэсьліваць сваю асаблівасьць і замыкацца ў сваім коле».

### Скончыліся «тутэйшыя»

Перапіс 2002 г. адназначна паказаў 46 тыс. беларусаў на Беласточчыне ды 5 тыс. далей у Польшчы, але гісторыкі лічаць, што сама меней іх мусіць быць 200 тыс. «Маркерам» беларусаў раней выступала праваслаўе. Прафэсар Мірановіч кажа, што сацыялягічныя дасьледаваньні несуцяшальныя: 75% праваслаўных беларусаў у вёсках называюць сябе палякамі. У 1983 г. былі іншыя лічбы: 30% праваслаўных назваліся палякамі, 40% — «рускімі» («рускай веры») і 27% — бе-

**Беларускамоўныя рок-гурты**

**У Падляшшы іх тры – «ZERO–85», «RIMA» і «5SET5». У сярэдзіне 90–х было іх болей – тады шмат на каго паўплывала «Басовішча» і беларуская незалежнасьць. Першымі, хто запісаў свой матэрыял і пасьпяхова гастраляваў былі хлопцы з «Rock Farmacyi Braha» ці проста — R.F.BRAHA.**

ларусамі. Цяпер дасьледаваньні Інстытуту сацыялёгіі паказалі, што адсотак «беларусаў» захаваўся, затое зьнікла катэгорыя «рускіх», «тутэйшых», яны далучыліся да «польскай культуры».

Апроч таго насельніцтва папросту мяняе веравызнаньне. У мяшаных шлюбах вянчаюцца ў царкве, дзяцей хрэсьцяць у касьцёле.

На будучыню гісторык глядзіць досыць пэсымістычна. Пэсымізм падмацоўваецца адсутнасьцю беларускамоўнай сыстэмы асьветы, сыстэмы культурных установ: «Думаю, зьмены, якія ідуць цяпер, скончацца на працягу аднаго-двух пакаленьняў. Застанецца жменька інтэлектуалаў. Але гэта будзе лёс эмігранцкай супольнасьці, якая будзе пастаянна між сабой сварыцца: усе эмігранты сварацца».

### «Пятая калёна» Лукашэнкі

Пачуцца эмігрантам на радзіме, у краі, дзе жылі твае бацькі й дзяды, — крыўдна й абразьліва. І надзей на паляпшэньне стану рэчаў праф. Міркановіч ня бачыць.

Лідэраў беларускага руху ў Польшчы прыгняла крымінальная справа, паводле якой пад сьледзтвам апынулася Праграмная рада тыднёвіка «Ніва». Іх абвінавацілі ў грашовым махлярстве. Такі вынік глядзіцца вельмі кантрасна на фоне таго, што атрымалі падчас уступленьня ў ЭЗ іншыя меншыні — нямецкая (яна мае нацыянальнае самакіраваньне ў гмінах, падтрымку з боку Нямеччыны), літоўская. Яўген Мірановіч прыводзіць іх як дадатны прыклад міждзяржаўнай супрацы: «Вялікай пашанай яны карыстаюцца пры дачыненьні паміж дзяржавамі: мы будзем, маўляў, спрыяць вашым, а вы — нашым! Тое самае і з украінцамі: яны часта зьяўляюцца пасрэднікамі ў міждзяржаўных кантактах». Але сёньняшняя беларуская дзяржава мае асаблівыя нацыянальныя ды палітычныя погляды. Расплачвацца за гэта даводзіцца беластоцкім беларусам.

> «У нас бачаць частку народу, які выбраў Лукашэнку».

«Нас успрымаюць як прадстаўнікоў нацыі, якая пайшла ў нейкі іншы бок. У нас бачаць частку таго народу, які выбраў Лукашэнку», — канстатуе Я.Мірановіч. Апошнім разам «пятую калёну Лукашэнкі» спрабавалі «прыціснуць» у сувязі са скандалам вакол Саюзу палякаў Беларусі. Беларуская супольнасьць у Беластоку выказалася ў падтрымку Анжалікі Борыс (у тым ліку і ў «Ніве»), але некаму гэтага падалося замала. Патрабавалася дэманстрацыя лаяльнасьці — публічныя лісты з пратэстамі.

Многім гэта нагадала паваенныя гады. Першы рэдактар «Нівы» Георгі Валкавыцкі прыгадаў, як польскія

Працяг на старонцы 18.

### Інтэрнэт-бібліятэка «Камунікат»

**Інтэрнэт-бібліятэка «Камунікат», створаная беластаччанінам Яраславам Іванюком, на сёньня зьмяшчае 500 кніг. Яраславу Іванюку 36 гадоў, ён скончыў гістарычны факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэту. Працуе журналістам на радыё «Беласток», дзе вядзе праграму «Пад знакам Пагоні». «Камунікат» пачынаўся з інтэрнэт-вэрсіі бюлетэню «Камунікат» Беларускай рэдакцыі радыё «Палёнія». Над праектам ён працуе сам адзін. Бібліятэка ляжыць на бясплатным сэрвэры (kamunikat.fontel.net), які прадставіў сябар Рады БНР Уладзіслаў Яндзюк. Самай папулярнай кнігай мінулага году на гэтай нэт-паліцы стаў «Кансьпіратар беларускі». У першы дзень ён прыцягнуў 600 наведвальнікаў, у другі — тысячу з гакам! Нават Бі-Бі-Сі разьмясьціла лінк, што тут можна знайсьці такую кнігу. Во, аказваецца, якая літаратура людзям у Беларусі патрэбная!**

# Бяз грыфу сакрэтнасьці

Віктар Стахвюк зь Беластоку надаў Беларусі статус марской дзяржавы. Піша Руслан **Бацянкоў**.

Лёс зьвёў мяне зь Віктарам Стахвюком, амаль што легендай у беларускім падляскім асяродку. Сябра «Салідарнасьці», бізнэсовец, падводнік, мастак, паэт, селянін, гаспадар. Шмат чым славуты гэты 57-гадовы ўраджэнец Трысьцянкі, але найперш — суаўтарствам у спробе з дапамогай Польшчы надаць Беларусі статус марскской дзяржавы.

«Гэта было шаленства, але мы зрабілі прэцэдэнт: у сярэдзіне 90-х у Ахоцкім моры плаваў першы карабель пад бел-чырвона-белым сьцягам — «Гайдук», і капітанам яго быў беларус Яўген Гнацюк з Падляшша, — распавядае Стахвюк. — Усё пачалося з I зьезду беларусаў сьвету ў ліпені 1993 году. Да мяне падышлі беларусы з Далёкага Ўсходу, і Мікалай Санаеў з Камчаткі, што называецца, падсунуў гэтую ідэю. Мне яна спадабалася».

Потым з нагоды Дня незалежнасьці ў Варшаве быў шыкоўны прыём, які дала беларуская амбасада. Там, паводле слоў Стахвюка, «быў амаль увесь урад Польшчы». Дзякуючы аднаму з журналістаў, мой суразмоўца пазнаёміўся з тагачасным міністрам транспарту і марской гаспадаркі. «Я маю квоту на мінтай у Ахоцкім моры» — «Заўтра а дзявятай раніцы ў маім кабінэце». На тым і дамовіліся.

«За 15 хвілінаў я расьпісаў яму ўвесь праект, і ён паверыў», — кажа ўзрушаны Стахвюк. Далей была фірма «Грыф» са Шчэціна і 5 адсоткаў удзелу Стахвюка ў справе. Некалькі год «Гайдук» з польскай камандай, але пад бел-чырвона-белым сьцягам, лавіў мінтай дзеля далейшай перапрацоўкі ў філей. «У жніўні 95-га я лётаў туды падчас зьмены экіпажу — 102 чалавекі. Гэта быў цудоўны час. На жаль, квота была невялікая — 3,5 тыс. тон, мы толькі пакрывалі выдаткі, а маглі лавіць удвая болей», — успамінае Стахвюк.

Карабель прадалі канадцам, потым яго купілі расейцы. І цяпер ён нібыта яшчэ на вадзе.

«Шчыра кажучы, я не цікавіўся, што было далей. Маёй сьвядомасьці хапае таго, што гэта быў першы карабель, які плаваў пад бел-чырвона-белым сьцягам і быў занесены ў сусьветны рэестар для плаваньня

Працяг на старонцы 18.

# Наш пляцдарм у Эўропе

Працяг са старонкі 17.

банды палілі ў той час беларускія вёскі, змушаючы жыхароў выяжджаць за ўсходнюю мяжу. Дзе беларусаў было шмат і жылі яны кампактна, там чапаць баяліся. А дзе няшмат, дык выразалі, часам цэлымі вёскамі.

### Вецер з Усходу

Атаясамліваецца зь Беларусьсю Лукашэнкі беластоцкія беларусы ня хочуць, але надзеі на рэнэсанс нацыянальнага руху зьвязваюць зь беларускай дзяржавай. Беларускай па духу.

Ці пяройдзена мяжа, за якой няма вяртаньня да паўнацэннага жыцьця беларускай меншасьці на Беласточчыне? Ці ўсё ж дапамогуць ёй магчымыя дэмакратычныя зьмены ў Беларусі? Пачуўшы гэтае пытаньне, прафэсар Мірановіч сьмяецца: «Гэта футурыстычнае пытаньне, бо не відаць, каб у Беларусі былі нейкія зьмены. Але гэта напэўна будзе вялікая надзея! На пачатку 1990-х людзі вучыліся беларускай мове, бо была суседняя краіна Беларусь». Горадня — за 60 км: гадзіна дарогі! Можна было паехаць туды, паглядзець і вярнуцца назад. Людзі адчулі, што мінуў Савецкі Саюз, што мяжа адкрыта. І сотні, тысячы людзей прыяжджалі. Мяшкі даляраў укідвалі ў Беласток! Гэта азначала новыя будынкі, новыя прадпрыемствы. Беласток квітнеў: за пару гадоў ён расьцьвіў, як сад вясной. Людзі адчувалі, што ёсьць суседняя краіна і ад гэтага ёсьць карысьць».

Цяпер беларуская меншыня на Беласточчыне не займаецца пражэкцёрствам — яны рэалісты. Яны хочуць жыць у эўрапейскай краіне, але ведаюць, што належнае жыцьцё ім можа гарантаваць толькі дэмакратычная Беларусь па той бок мяжы. Я.Мірановіч кажа катэгарычна: «Людзі слабыя ўцякаюць зь беларускага асяродзьдзя. Застаюцца тыя, каму ўжо гонар не дазваляе кудысьці пайсьці. Нішто іх не трымае — толькі гонар».



**«Басовішча», найбольшы фестываль беларускага року, адбываецца ў Гарадку.**

### Зона року

«Шараговы паляк ведае пра беларускую музыку болей, чым шараговы беларус – пра польскую», — маркуе Стэп (Лукаш Стэпанюк) стваральнік польскамоўнага сайту пра беларускі рок. У студзені рок–«Зона» (www.zona.by.prv.pl) справіла своеасаблівы юбілей – 20000–ае наведваньне. Лукаш некалькі гадоў вёў музычныя праграмы на беластоцкім беларускамоўным «Радыё Рацыя». Калі радыё зачынілася, адчуў патрэбу зрабіць сайт. Ён таксама грае ў некалькіх музычных праектах. Зь ягоных словаў, у жыцьці яго цікавяць толькі дзьве рэчы: дзяўчаты й беларуская музыка.

### У беларускім руху застаюцца дужыя

Афіцыйная статыстыка польскай беларушчыны не натхняе. У Беластоку толькі крыху больш за 70 дзяцей вывучаюць беларускую мову пры афіцыйным беларускім насельніцтве каля 7 тыс. чалавек. Між іншым, у Сэйнах, дзе пражывае літоўская меншасьць, на роднай мове вывучаюць біялёгію, хімію і «нават фізкультуру».

Паводле апошняга перапісу, толькі 48 тыс. беларусаў назвалі сябе беларусамі, а 85 адсоткаў праваслаўных запісалі сябе ў палякі. «Людзі слабыя ўцякаюць зь беларускага асяродзьдзя. Застаюцца тыя, каму ўжо гонар не дазваляе кудысьці пайсьці. Нішто іх не трымае — толькі гонар», – кажа прафэсар Яўген Мірановіч зь Беластоцкага ўнівэрсытэту.

# Бяз грыфу сакрэтнасьці

Працяг са старонкі 17.

ня ў Сусьветным акіяне. Гэтага з гісторыі ня выкрасьліш, Беларусь ёсьць марской дзяржавай. Уладальнікам «Гайдука» была Польшча, але гэта ня мае ніякага значэньня», — падкрэсьлівае Віктар Стахвюк.

Станіслаў Шушкевіч, які да студзеня 1994 году быў намінальным кіраўніком Беларусі, сказаў мне ўжо ў Менску, што ня памятае такой гісторыі, але дапускае, што так яно і было насамрэч: «Не магу адказаць, ці заключалася нейкая дамова, аднак у любым выпадку карабель калі і плаваў, дык безь мяне. Вы ж ведаеце, як яно ўсё абярнулася...»

# Маленькая скварачка ў вялікай кашы

Так называюць сябе праваслаўныя Беласточчыны. Яны могуць стаць рошчынай вялікага беларускага праваслаўнага адраджэньня. Калі не распусьцяцца ў «праваслаўнай польскасьці». Рэпартаж зь Беластоку–Супрасьлі–Равалоў **Андрэя Скурка**.

## Архімандрыт за рулём

«У вас сьвятарства расслабленае, разьлененае, — кажа настаяцель Супрасьлеўскага манастыра архімандрыт Гаўрыла. — А мы тут мусім штодня змагацца. За кожную душу!» Айца Гаўрылу выклікалі ў Варшаву, і абяцанае інтэрвію адбываецца між Супрасьляй і Беластокам на хуткасьці 80 кілямэтраў за гадзіну.

«Колькі ў вас манахаў?» — «Ваенная тайна! Скажаш мала — будуць думаць, слабое праваслаўе, скажаш многа — недругі задумаюцца». У прымружаных вачах айца Гаўрылы бліскае іронія: «Вось колькі летась у вас на Гарадзеншчыне новых сьвятароў зьявілася ў прыходах? Ня ведаеш? А мы ведаем! У нас выведка — як у Ватыкану. Іначай тут няможна!..»

Архімандрыт дамчаў мяне да Беластоку за пятнаццаць хвілін. Аўтобусам ехаць хвілінаў сорак. Праўда, палову часу займае дарога праз сам Беласток. Горад запамінаецца багацьцем перадвыбарнай рэклямы: Польшча перажыла прэзыдэнцкую і парлямэнцкую кампаніі. Ды што горад — каляровыя ўлёткі з тварамі кандыдатаў расклееныя нават у лесе на дрэвах уздоўж шашы.

Найбольшая сьвятыня Падляшша, Супрасьлеўскі манастыр, стаіць воддаль мястэчка. Музыка старой архітэктуры. Чаму цяпер не будуюць так прыгожа? І адкуль у продкаў была такая яснасьць стылю? Мо папросту «Русское Радио» ня слухалі?



**Праваслаўе на Падляшшы не такое, як у Беларусі. На фота: сучасная царква ў Гайнаўцы.**

Дыямэнт манастыра, Дабравешчанскую царкву, зьнішчаную ў вайну дазваньня, пачалі адбудоўваць дваццаць гадоў таму. Беларускі ўрад у пачатку 1990-х выдаткаваў на сьвятыню 200 тысяч штук цэглы і 500 $м^3$ граніту. Першы камень у падмурак закладаў тагачасны япіскап беластоцка-гданьскі Сава, цяпер мітрапаліт Польскай праваслаўнай царквы. Сёньня сястра Сынкавіцкай і Маламажэйкаўскай цэркваў падпірае неба магутнымі вежамі. І яшчэ на дваццаць гадоў рэстаўратарам досыць працы ў Супрасьлі — левае крыло манастырскіх будынкаў пакуль цалкам нежылое. Вакол мітусяцца работнікі. На пажухлай восеньскай траве стаяць дзьве цыбулепадобныя макаўкі, абабітыя медзьдзю.

«У нас выведка — як у Ватыкану. Іначай тут няможна!..»

## Уланская бабка

Застаць у манастыры кагосьці з начальства ўдалося ня зь першага разу. Пасьля працяглых званкоў дзьверы манастырскай прыёмнай адчыніла кабета. Сталая, у белым кухарскім халаце. «Архімандрыта няма. І нікога няма. Зьмітраўская субота — дык яны на могілках усе». Чакаючы прыёмнае гадзіны, туляюся Супрасьляй. Золкая раніца. Над комінамі сьцелюцца ўтульныя восеньскія дымы. Акуратныя абшаляваныя хаткі, ружы ў палісадніках, на кожнай брамцы — надпіс: «Uwaga, ostry pies». Нават калі той «пес» — кату па пяту.

Супрасьля патроху ператвараецца ў курорт. Экалёгія і дух вабяць сюды прыезджых з Варшавы: квадратны мэтар зямлі тут каштуе, нібы ў сталіцы. Дзе-нідзе на вуліцах відаць указальнікі: «Наймальне пакояў». Праўда, турыстычная інфраструктура толькі ў плянах. Яна мусіць паўстаць у наступныя дзесяць гадоў на грошы Эўразьвязу. Пакуль жа а восьмай ранку ў мястэчку няма дзе дзецца. Адзіны заўважаны «Бар» працуе ад 11-й. І прэзэнтуе «рэгіянальную кухню». Страва дня — «бабка бульбяная, уланская».

У шапіку з прэсай, побач з рэспэктабэльнымі «Газэтай Выборчай», «Жэчпасполітай», ляжыць «Наш дзеньнік», газэта праварадыкальнай Лігі польскіх сем’яў. Гэтая газэта

Працяг на старонцы 30.

Як сяляне-беларусы пад Беластокам прыстасаваліся да жыцьця ў Эўразьвязе. Рэпартаж **Руслана Равякі**.

# Калгасны заробак 500 эўра

Сельская гаспадарка Польшчы адрозьнівалася ад нашай нават за савецкімі часамі — у Польшчы сялянаў не заганялі ў калгасы. Пасьля таго, як Польшча ўвайшла ў ЭЗ, вёска яшчэ больш аддалілася ад беларускай. Сельскагаспадарчаму вытворчаму каапэратыву «Рольмак» у Макоўцы — ужо 40 гадоў. Але дзякуючы намаганьням старшыні праўленьня каапэратыву Віктара Рэента гаспадарка набыла новы выгляд.

Сп.Віктар заяжджае па мяне а сёмай раніцы на навюткай «Шкодзе-Актавіі». Машына не раўня беларускім калгасным «Нівам». Аб’яжджаем гаспадарку, і пан Віктар распавядае пра каапэратыў, праблемы ды новыя магчымасьці, што зьявіліся пасьля ўваходу ў Эўразьвяз.

«Рольмак» мае 2054 га зямлі, раскіданых у карэнна беларускіх гмінах Нараў, Чыжы і Гайнаўка. У Чыжах былі падпісчыкі яшчэ той, дасавецкай «Нашай Нівы». 1600 га выкарыстоўваецца як ворныя землі, 300 га — як пашы і лугі. Пад збожжа штогод засяваецца 1000 га, кукурузай — 400 га, цукровымі буракамі — 175 га. Дзяржава і ЭЗ датуюць ячмень, жыта і кукурузу.

## Эўрапейскія цэны, эўрапейскія заробкі

Зямля ў Польшчы дарагая. 1 га на Беласточчыне пазалетась каштаваў 4000—5000 даляраў. Надзелаў ніхто не прадае. Пэнсіянэры, якія самі ня могуць абрабляць зямлю, здаюць надзелы ў арэнду буйным гаспадаркам.

Мы спыняемся каля вялізных — больш за 2 м — купаў цукровых буракоў. Яны цягнуцца абапал дарогі на кілямэтар. «Найлепшыя землі, — кажа сп.Рэент. — Сёлета, хто пасадзіў бурак, добра зарабіў — эўрапейскія цэны гэтаму спрыяюць».

На полі грукоча нямецкі камбайн, недалёк чакаюць загрузкі два грузавікі. «У вас у Беларусі, відаць, ужо ўсе буракі выкапалі», — больш сьцьвярджае, чым пытае пан Віктар.

Сёньня [8 лістапада] у Беларусі, магчыма, усё выкапана, але ў гэты дзень нашыя калгасьнікі больш пахмяляюцца, чым працуюць. Дый капаюць у нас больш рукамі. Польскія сяляне працуюць у некалькі зьменаў. Тыя, што на полі, працавалі ўначы, і цяпер чакаюць зьмены.

Перапрашаючы за нахабства, пытаюся пра заробкі. Тыя, якіх бачылі мы на полі, штомесяц зарабляюць 500 эўра, — чую ў адказ. Г.зн. мільён трыста тысяч рублёў на беларускія.

## Зернем топяць печы

У каапэратыве — 124 асобы. Зь іх 14 працуюць найміткамі, на падставе дамовы, астатнія — чальцы каапэратыву. Гаспадарка прадукуе за год прыкладна 7000 т цукровых буракоў, 4000 т збожжа і 2000 т кукурузы.

Цэны пайшлі долу па ўсёй Эўропе. У некаторых гаспадарках у гады перавытворчасьці рэнтабэльна выкарыстоўваюць зерне як паліва. У Польшчы ўжо прадаюцца печы, што працуюць адмыслова на зерні.

Плянуецца, што да 2007 году ўся сельская гаспадарка Польшчы будзе скарыстоўваць 5% натуральнага паліва. Пачулі пра гэта ў нас, з нашымі мільёнамі зерня, што зьбіраюцца штогод, як апошні раз, быццам бы напярэдадні сусьветнай паводкі.

Кіраўнік «Рольмаку» таксама падумвае пра набыцьцё такой печы. Але пакуль што гаспадарка атрымала крэдыт на восем год на пакупку прэса для саломы.

**За што атрымліваюць даплаты польскія сяляне?**

За экалягічна чыстае гаспадараньне, без азотных угнаеньняў.

За касьбу пасьля 1 ліпеня.

За касьбу касою (!).

За пераход на нясельскагаспадарчую вытворчасьць.



На адной Гайнаўшчыне цяперака 37 фірмаў, што не ўжываюць азотных угнаеньняў. Яны замяняюцца натуральным гноем з-пад авечак.

## Гной пад норму

Мы едзем далей. Сп.Віктар расказвае пра дапамогу ад Эўразьвязу, адрасаваную польскім земляробам. Датацыю ў 300 тысяч злотых (75 тысяч даляраў) можа атрымаць любая гаспадарка. Для малой фірмы гэта добрыя грошы, а для вялікай — ня гэтак і шмат. Да таго ж дзеля атрыманьня трэба выконваць шматлікія экалягічныя патрабаваньні. Асабліва складаныя яны для тых, хто займаецца жывёлагадоўляй: кожная сьвіньня, карова ці авечка прывязваецца да зямлі. Эўразьвязам прызначаны нормы ўгнаеньняў на плошчу ворыва — 170 кг азоту на гектар. Таму вялікіх сьвінакомплексаў, як раней, ня створыш, бо патрэбна мець да кожнай галавы адмысловую колькасьць зямлі.

Сп.Рэент кажа: «Праз гэта можам трымаць толькі 650 сьвінаматак ды 40 тысяч бройлераў кур. Аднак можна

падпісаць дамову з суседзямі, дробнымі землярobamі, што будзеш вывозіць угнаеньне да іх. З 1 сьнежня да 1 сакавіка гной на палі вывозіць нельга».

Мы праяжджаем празь дзьве закінутыя, але не занядбаныя на выгляд фэрмы. Рэент паказвае мне на іх і кажа: «Гэтыя будынкі таксама нашай гаспадаркі. Засталіся з далёкіх часоў. Думаю прадаваць каму. Пакуль зрэдчас трымаю там парасят перад продажам. Цяпер, каб мець фэрму, трэба мець зямлю. Але зь іншага боку — гэта добра. Такая акалічнасьць стрымлівае вялікія замежныя фірмы ад прыходу на польскі рынак».

Сьвіней жыўцом гаспадарка «Рольмак» прадае ў Калінінград і Украіну. Дзеля гэтага прыяжджалі на фэрмы вэтэрынарныя дактары з тых краін, аглядалі гаспадарку й выдалі дазвол. «Зь Беларусьсю цяжэй. Вэтдактары патрабуюць вакцынацыю такімі прышчэпкамі, якія ў сьвеце кінулі рабіць гадоў 25 таму. Да таго ж на мяжы трэба, каб жывёла адбыла 20 дзён карантыну. Ніводзін бізнэсовец ці гаспадар гэтулькі часу трымаць на граніцы жывёлу ня будзе».

У гэты час машынаю праяжджаем празь невялікае мястэчка. Прыбраныя падворкі з хвоямі і мохам. Пафарбаваныя дагледжаныя хаты. Паўсюль добры плот, а каля брамак — лавачкі. Пасярод сяла, наўзбоч дарогі, здалёк бачна вялікая праваслаўная царква.

## Лаўцы курэй

Пад'яжджаем да фэрмы, дзе гадуюцца куры-бройлеры. Пляц з будынкамі агароджаны жалезным плотам. Каля ўваходу ля возу завіхаецца мужык. Укладае на воз зьвязаныя куры. Апрануты, як на Берасьцейшчыне, не адрозьніць. Побач — двое падлеткаў: дзяўчына і хлапец. Іх ужо цяжка ўявіць пасярод нашай вёскі.

Бройлераў жыўцом забіраюць фірмы, якія займаюцца боем, перапрацоўкай і фасаваньнем. За птушкай увечары прыяжджаюць адмысловыя машыны. Ранкам машыны павінны зьяжджаць. Каб налавіць птушку, «Рольмак» наймае мясцовых сялянаў, якія прыходзяць на ноч. Аплата цікавая: за 1000 злоўленых кур — шэсьць аддаецца чалавеку.

Чалавек, якога мы пабачылі, мае шмат дзяцей. Таму заўсёды з ахвотаю прымае ўдзел у начных ловах, беручы з сабою яшчэ колькі сваіх малых — сям'ю карміць трэба.

## Фірма кошыкі пляце

Малыя польскія гаспадаркі цяпер на мінусе. Атрымліваюць праграмы і даплаты ад Эўразьвязу на стварэньне нясельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Шмат хто з малых гаспадарак пачынае займацца агратурыстыкай ці нават пляценьнем кошыкаў з лазы — хто што прыдумае. Дзякаваць Богу, а знаходжаньне побач Белавежы гэтаму спрыяе.

Тыя самыя даплаты ажывілі экалягічнае гаспадараньне на Гайнаўшчыне. Цяперака такіх гаспадарак тут 37. Галоўныя ўмовы: не прымяняць азотных угнаеньняў. Яны замяняюцца натуральным гноем з-пад авечак. Засяваюцца, а пасьля выворваюцца бабовыя культуры, што зьмяшчаюць у сабе шмат азоту. Кошты на прадукцыю з экалягічнай гаспадаркі ў разы вышэйшыя.

Віктар Рэент мае асабістыя 7 га зямлі, што засталіся па бацьку.

— Тамака вяду экалягічную гаспадарку, за што даплачваецца 700 зл. на га. Займаюся бортніцтвам — прадаю мёд. Яшчэ атрымліваю грошы за экстэнсіўнае гаспадараньне на лугах. Гэта значыцца, што касіць сена на лугах патрэбна пачынаць не раней 1 ліпеня.

Апошнія даплаты падзяляюцца яшчэ на тое, косіш ты адзін раз ці 2 разы (800 злотых). Калі косіш касою, яшчэ большыя надбаўкі. Сена, дарэчы, пан Рэент зьбіраецца выкарыстоўваць як паліва. Бо жывёлы мала, і сена нямашака куды падзець. Але яго нарыхтоўваюць, каб атрымліваць датацыі.

Каб атрымліваць тыя даплаты, трэба выконваць пэўныя ўмовы. Касілка павінна касіць ад сярэдзіны, а не па коле — каб засталіся жывыя зайцы і курапаткі, што хаваюцца сярод травы.

Перад разьвітаньнем я запытаўся пра выкупліваньне зямлі замежнікамі — гэтым палохаюць беларускіх сялян. Згодна з пастановаю польскага сойму, зямля замежнікам прадаецца толькі са згоды міністра.

Польская сельская гаспадарка не сама сабой так прыстасавалася да новых умоваў. Гэтаму папярэднічала падрыхтоўка заканадаўства, навучаньне кадраў. Але і людзі адразу кемяць выгаду, якая заключаецца ня ў тым, каб болей тонаў сабраць ці прыпісаць, а каб болей грошай пакласьці ў кішэню і менш шкоды для прыроды зрабіць.

## Арарат беларускіх гісторыкаў

Беларусы Польшчы далі цэлую плеяду гісторыкаў.

Загадчык Катэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту прафэсар **Яўген Мірановіч** — аўтар бэстсэлеру «Найноўшая гісторыя Беларусі». Ён — матор Беларускага гістарычнага таварыства і яго друкаванага органу «**Bialoruskie zeszyty historyczne**».

**Алег Латышонак**, што больш як дзесяцігодзьдзе займаўся XX ст., машынай часу перанёсься на некалькі стагодзьдзяў у мінулае. Цяпер піша дысэртацыю пра пачаткі беларускай нацыянальнай ідэі — «той час, калі ідэя была, але не было нацыі». Ён упэўнены: Беларусь можна разглядаць тады, калі ейныя насельнікі пачынаюць сябе дэкляраваць беларусамі.

**Алена Глагоўская і Вячаслаў Харужы** разам выпускаюць і рэдагуюць кнігі. Чарговы праект — выданьне ліставаньня ўраджэнца Браслаўшчыны, дырэктара музэю імя І.Луцкевіча Мар'яна Пецюкевіча, які ў 1949 г. быў арыштаваны саветамі і асуджаны на 25 гадоў.

Але самае слыннае імя — доктар **Юры Туронак**. Ягоная «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (1990) да гэтага часу трымаецца ў сьпісе бэстсэлераў. Сёньня ён сканцэнтраваўся на працы пра Саюз беларускай моладзі (1943—1945), а таксама рыхтуе Збор твораў, што мае выйсьці сёлета.

Пры канцы 1990-х Беласток падаваўся для нас — жыхароў мэтраполіі — беларускім гістарычным П'емонтам, а працы тамтэйшых гісторыкаў-беларусаў былі перадавой гістарычнай думкай. Цяпер Беласток — цэнтар свабоднай беларускай гістарыяграфіі.

Калі мы расказвалі старшыні Беларускага гістарычнага таварыства (БГТ) у Беластоку доктару Алегу Латышонку апошнія зьвесткі з калянавуковага жыцьця ў Менску, ён браўся за галаву: «Божа мой, які маразм». Натуральна, гісторыкі ў Беластоку таксама сутыкаюцца зь цяжкасьцямі. Але не з цэнзурай тэмаў дасьледаваньняў.

Арарат беларускіх гісторыкаў знаходзіцца за мяжой, але бачны зь любога беларускага ўнівэрсытэту.

**Алег Гардзіенка**

# Геаграфічная маргіналія,

Айчына Дзігі Вертава, сядзіба тэатру «Вершалін», жытло Лёніка Тарасэвіча, форум «Басовішча» і фэсту ў Лапах. Зь Беластоку, Гайнаўкі, Лапаў — **Андрэй Расінскі**.



**Дзіга Вертаў, культавы дакумэнталіст, вырас у Беластоку пачатку XX стагодзьдзя.**

Беларускія архівы захавалі старую хроніку зь Беластоку. 1939 год: месьцічы выбіраюць савецкіх дэпутатаў, партрэты Сталіна, вайскоўцы, авацыі. Сёньня нічога не нагадвае пра колішняе сацыялістычнае мінулае. Праспэкт Леніна й вуліца Першамайская сышлі ў нябыт, на іх месцы — Алея Яна Паўла II і Рынак Касьцюшкі.

## Сьцішаная беларуская прысутнасьць

Стагодзьдзе таму па старых беластоцкіх вулках бегаў габрэйскі хлопчык Дзяніс Каўфман. Дзяніс стаў найлепшым дакумэнталістам сьвету, рэвалюцыянэрам кінамовы, зьмяніўшы імя на гучнае Дзіга Вертаў. Вертаў дэкляраваў ідэю «кіна-вока», якое зьмяняе сьвет і ловіць «жыцьцё зьнянацку». Экспэрымэнты няўрымсьлівага беластачаніна ўрэшце надакучылі сталінскай уладзе. Пры канцы жыцьця Вертава саслалі ў «ампірнакічавыя» навіны, не дазваляючы праяўляць імпэт.

«Вока», што схоплівае «жыцьцё зьнянацку», сёньня здольнае ўбачыць: беларускіх кантрабандыстаў — з цыгарэтамі ў панчохах у цягніку «Горадня—Беласток», мадэрнаўзьнёслы касьцёл Сьв.Роха, суворую цыбуліну праваслаўнага храму, квяткарні, саламяны будан на халодным асфальце на Рынку Касьцюшкі, сталёвыя вусны Пілсудзкага — і неба, што атуляе горад абдымкамі Хрыста.

У горадзе ёсьць і сьцішаная беларуская прысутнасьць: рэстаран «Горадня», назвы вуліц Слонімская й Бабруйская.

## Кадар 1: музэй, мова і фільмы

У Гайнаўку мяне запрасіла Натальля Герасімюк — бібліятэкарка Музэю беларускай культуры. У горадзе бянтэжыць галава Леніна, узьнесеная над кірмашовым натоўпам. «Трэба, каб стод захаваўся ў Гайнаўцы. У беларусаў рэпутацыя камуністаў…» Аднак мітрэнгі марныя: стод упрыгожвае кавярню «Ў Валодзі». У самой кавярні — партрэт Энгельса і плякаты пра перамогу Кастрычніка.

У музэі, які месьціцца ў вялікім белым будынку, халаднавата; толькі горача фыркаюць зь відэаэкрана матацыклы — іх уцялесьненыя калегі дэманструюць чырвоныя бакі на адмысловай выставе. Забытыя вясковыя прылады, цёплыя ад старажытнага часу, — і сучасныя фотапартрэты ад Міколы Несьцяровіча. Кабеты ўсіх краін.

«Мікола Несьцяровіч быў апэратарам нашай рэжысэркі Тамары Саланевіч, — кажа Н.Герасімюк. — Ён добра адчуваў месца й чалавека».

Ці ёсьць у Беласточчыны сваё кінаабліччa? Спн.Натальля прыгадвае фільм «У пана Бога за пазухай». «Крэсавая» карціна нагадвае нашу этнаграфічна-каляніяльную «Сьвежыну з салютам». Але такія фільмы не прадмет гонару.

Тамара Саланевіч — клясык Беластоцкага тэлебачаньня. Яе карціны «Дотык. Мэлёдыя душы», «Анджэй і Марыя» — аб звычайных людзях. Героі «Апошняга дому» — людзі з дому састарэлых. Музэйны магнітафон прагляд фільмаў сабатуе.

## Кадар 2: тэлебачаньне

Шматлікія дзьверы не пазачыняныя на мудрагелістыя замкі — як на тэлебачаньні беларускім. Атмасфэра нязмушаная. Мікола Ваўранюк рыхтуе выпуск 20-хвілінных беларускіх навін, што выходзяць у нядзелю раніцай.

У кабэльных сетках на Беласточчыне тэлеканалаў болей за 40, зь іх уласна польскіх — болей за 10. Разьвіваецца й прыватнае тэлебачаньне, у тым ліку рэлігійнае. У некаторых раёнах прымаецца беларускае ТБ, але дарэмна шукаць там беларускай мовы. Невялічкі культурны выпуск ад TVP-3 застаецца ледзь не адзінай беларускамоўнай выспай.

Гэтым разам передача прысьвечана Рыгору Барадуліну і кнізе «Ксты». Расказваецца таксама пра танцавальныя выступы ў Гайнаўцы, занятк ў садку. «Здымаем рэпартажы й пра пракладку трубаў у вёсках — для людзей гэта таксама падзея, — кажа Мікола. — Зараз выбары, і некаторыя чыноўнікі, што раней саромеліся казаць па-беларуску ў камэру, самі клічуць: прыяжджайце, скажам па-простаму», — апавядае Ваўранюк.

Яго калега Юрка Каліна паказвае свае фільмы. «Гэта проста рэпартаж», — сьціпла гаворыць пра паэтычную дакумэнтальную стужку. У «Баляздзе пра Мялешкі» фатограф Павал Грэсь робіць партрэты вяскоўцаў. Фатаграфіі з пашанай выстаўляюцца на платах перад хаткамі: шчымлівы сум адыходзячага. Героі «Падпольнай школы» — вучні Беларускага гуманітарнага ліцэю, закрытага лукашэнкаўскімі ўладамі. Цяпер Юрку Каліну ўезд у Беларусь забаронены.

У Польшчы ліцэі і вытворчасьць фільмаў не забараняецца, а Юрку Каліну запрашаюць у журы кінафэстываляў.

## Кадар 3: фэстываль у Лапах

Лапы — маленькае мястэчка пад Беластокам. Другі год запар тут праводзіцца фэстываль аматарскіх фільмаў. Яго ладзіць мясцовы Дом культуры — пры падтрымцы газэты «Кур'ер паранны», тэлебачаньня й сайту «Szorty.pl». Сёлета, 3 сьнежня, у фэстывалі заяўлена 34 карціны.

Героі стужкі-ляўрэата, Франак і Болек, нагадваюць «Сашу і Сірожу». Нават жэсты падобныя. Карціна зьнята на лічбавую фатакамэру.

Фільм пра польскіх габрэяў уражвае ўдалым поліэкранам. Узносяцца да неба малітвы, гучыць хор сьведчаньняў. Стужка ўзяла першую ўзнагароду.

Калі беларускія кінааматары любяць мудрагеліць з формаю, то польскіх натхняе жанравая клясыка. Некаторыя сябры журы былі зьляканыя энтузіязмам мясцовых заўзятараў. На экране лапаўскія хлопцы — крутыя постаці а-ля Гай Рычы са звычкамі кун-фу. Зубадрабільныя сцэны з баевікоў, сьмех — і прыз глядацкіх сымпатый.

## Кадар 4: «фікцыйныя палпэткі» на хатнім кампутары

На фэстывалі ў Лапах разумееш, што межаў паміж жыцьцём і мастацтвам няма.

# культурная мэтраполія

Войцех Каранкевіч таксама пачынаў з «гангстэрскай клясыкі». Цяпер — вольны журналіст «Кур'ера параннага», «Лямпы» і «Алькагольнага сьвету». Яго «Фікцыйныя палпэткі» — гэта «Крымінальнае чытво», перанесенае ў Беласток і зробленае на хатнім кампутары.

«У Таранціна пекныя жанчыны, прыгожыя машыны — у нас аўтобусы замест машын», — кажа Войцех. Пекныя жанчыны заменены калярытнымі цёткамі. Актрыс узялі з вакзалу, галоўны гангстэр правёў пэўны час у беластоцкай турме і на экране выглядае надзвычай натуральна.

Адну са сцэнак здымалі ў турме. «Мы проста папрасілі паліцэйскіх — і тыя дапамаглі». Пры гэтым паліцэйскага граў паліцэйскі.

Але самае цікавае ў Вайцеха — «вершакліпы» польскіх паэтаў. Гэта смачныя партрэты з каровамі, мухамі, акулярамі — і з такім выяўленьнем аўтараў, што глядзіш мініятуркі, разявіўшы рот.

Прыгадаўся наш літаратурны гурт «Бум-Бам-Літ», які любіў пэрформансы. Войцех праявіў зацікаўленасьць гуртам — і пажадаў зьняць беларускіх аўтараў. «Каб зрабіць фільм, грошай ня трэба. Ёсьць камэра, кампутар. А стужкі можна паказваць у кавярнях, клюбах», — і гэта таксама нечаканы беластоцкі досьвед.

## Кадар 5: кавярні, кінатэатры і новая хроніка

Кінатэатры ў Беластоку маленькія й утульныя. Называюцца яны не «Масква» ці «Кастрычнік» — а «Сырэна» й «Форум». Квіток — 10—14 злотых (6000— 9000 руб.).

Дэталь, да якой у нас пакуль не дадумаліся, — вуглавыя месцы таньнейшыя на два злотыя.

Акрамя ўсюдыісных галівудзкіх фільмаў — рэтраспэктыва эўрапейскага кіно. Так, эўрапейскае кіно рэгулярна дэманструецца ў Менску, але ў маленькіх гарадах яго бракуе. Калі меркаваць з афішаў, у Беластоку з гэтым праблем няма.

Імпрэзы ў кавярні «Fama» прапануюць невядомыя амэрыканскія кароткамэтражкі. У кінатэатры «Форум» ладзіцца паказ «Незвычайных прыгод містэра Вэста ў краіне бальшавікоў» — пад сучасную музыку.

Мацей Рант, арганізатар кінапаказаў, зьдзіўляецца пытаньню пра цэнзуру. У Беластоку даўно забыліся на ціск.

«Шкада, што Беласточчына не пазначыла сябе як радзіма Дзігі Вертава», — закідаю я.

«Проста ён савецкі рэжысэр, — адказвае Мацей, — але мы паказвалі ягоныя фільмы».

Мацей ня ведае, ці ёсьць на Беласточчыне энэргія, што спараджае новыя кінаформы, затое працягвае дыск «Падляшша атакуе!» з творамі маладых рэжысэраў.

Творы дзёркія, імпэтныя і свабодныя.

Беластоцкія хронікі нікуды ня зьніклі. Яны набылі новыя формы і новую мову. І мова гэтая гаворыць рознымі галасамі.



**Лёнік Тарасэвіч — самы вядомы мастак Падляшша. У перапынках між выставамі ў Нью-Ёрку й выкладаньнем у Варшаўскай акадэміі ён гадуе экзатычныя і звычайныя птушкі ў родных Валілах.**

# Парыж варты мэсыджу



Прагрэсіўная грамадзкасьць дакарае: «Лёлік, але ж гэта неэстэтычна!» «Затое танна, надзейна і практычна!» Пра выкарыстаньне рэжымам і яго апанэнтамі палітычных тэхналёгіяў піша **Аляксандар Класкоўскі.**

З аднаго боку, Мілінкевіч у Парыжы — эфэктна. Гэты козыр уладзе няма чым крыць. А яна й ня будзе. Эфэктны візыт ацэніць купка палітычных эстэтаў. Маса — проста не даведаецца. Ідэолягі пашчыравалі, каб з распаўсюдам альтэрнатыўнай інфармацыі стала глуха як у танку. Дый наагул масе болей даспадобы ня той герой, што па-француску шпарыць, а той, што ўжывае на хакеі зусім іншую лексыку («во гэта наш мужык!»).

Улюбёны занятак франдэраў-інтэлектуалаў — кпіць з «калгаснай» улады. Вось мы ўсе такія разумныя, а яны — як левы бот. Між тым рэжым паказвае здольнасьць навучацца. І цалкам згодна з законамі піяру працуе на мэтавыя групы: старым — чарговае падвышэньне пэнсіёну, дробным гандлярам — дазвол яшчэ год прадаваць парфуму, інтэлігенцыі — адстаўку палкоўніка Праляскоўскага... Лукашэнка зь небеспадстаўным гонарам кажа, што ўмее размаўляць з народам на ягонай мове.

З намэнклятурай таксама. У мінулы аўторак, прэзэнтуючы новыя-старыя кадры сваёй адміністрацыі, ён даў зразумець, што болей ператрасаць вэртыкаль ня будзе. Шэйман ды іншыя фактычна атрымалі публічныя гаранты на будучыню. Натуральна, калі пашчыруюць дзеля самога гаранта ў крытычныя дні электаральнага ўзрушэньня.

Вельмі дакладны, разлічаны, моцны мэсыдж тым, хто мусіць тэхналягічна забясьпечыць элегантную перамогу.

Апазыцыйныя ж «зоркі» раз-пораз генэруюць прыгожыя, але зусім не тэхналягічныя пражэкты. Накшталт рэфэрэндуму пра зьмены ў Выбарчы кодэкс, адхіленьня Лукашэнкі ад удзелу ў выбарах або альтэрнатыўнага народнага галасаваньня.

Выдатныя ідэі, калі заплюшчыць вочы на дробязь: іх немагчыма ажыццявіць. У лепшым выпадку можна нешта імітаваць (напрыклад, канцэптуальнае сілкаваньне з Банку народнае мудрасьці). Увогуле ж фантанаваньне пражэктамі толькі расколвае апазыцыйную эліту і дэзарыентуе антылукашэнкаўскі электарат. На розныя «гістарычныя» адозвы ўжо алергія.

Крыўдна, што рэжым прысабечыў лёзунг «За Беларусь!» Але «Мы за Мі!» нагадвае або пра казённыя савецкія мітынгі, або пра савецкі гэлікоптэр (асацыяцыйны шэраг можна доўжыць).

Паліттэхналёгіі ня церпяць дылетантызму, характэрнага для тых апазыцыянэраў, што прысьвячаюць палітыцы «вольны ад працы час». Між тым улада, хай сабе й блытае крэмній з сыліконам, ужо асядлала цэнзураю Інтэрнэт (асабліва ў інтэрнаце!). 19 сакавіка можна чакаць кропкавай кібэрвайны, гэткага элегантнага электроннага бліцкрыгу з адсяканьнем крамольных рэсурсаў у сеціве.

Дый пасьля наіўна спадзявацца, што яны там стаміліся і зараз дадуць паслабленьне. Наадварот, зусім імаверна, што практычнае ўжываньне рэпрэсіўных навэляў крымінальнага заканадаўства распачнецца акурат потым. Каб не электрызаваць публіку ў крытычныя дні. Згадайце «разбор палётаў» пасьля выбараў-2001, калі на тле грамадзкай апатыі спакойна выпісалі «хімію» Маркевічу, Мажэйку ды Івашкевічу. Урок жа адгукаецца незалежным журналістам пакутлівай самацэнзурай і дасюль. А тым часам і газэты іхнія тэхналягічна вымелі з каталёгаў ды саюздрукаў.

Карацей, пакуль высакалобыя апанэнты спаборнічалі ў рамантычных пражэктах, «калгасны» рэжым мэтадычна ўмацоўваў пазыцыі.

Сёньня адно з двух: або надзець белыя пальчаткі і грэбліва казаць «фэ, які фарс!» — або прымаць няўдзячны выклік. Каманда Мілінкевіча выбрала другое. Дык няхай працуе.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Закон хак

У новую пяцігодку нацыя ўступ спартовай перамогі — прэзыдэ прэзыдэнта. Фэльетон **Лёліка У**

О, родны кут, які ты дзіўны! Ня ведаю ніводнай краіны, дзе навіны аматарскага спорту былі ў топе праўрадавых СМІ ды яшчэ ў пік перадвыбарчай кампаніі. Для прыкладу: паралельна таму, як у Менску хакейныя аматары пінал і шайбу, у Омску аматары экстрэмальнага бегу беглі пры мінус 25. Аднак чамусьці ніводзін маскоўскі таблёід ня выйшаў пад шапкай «Дадзім

краі
так
наш
суа
мар
пры
расе

А ко
хаке
сым
наш
і пра
став



І людзі — як рыбкі на лёдзе? Фота Андрэя Лянкевіча.

# кею

іла пад фанфары
нт выйграў кубак
шкіна.



не экстрыму!». Пуцін
сама не перафразаваў
хага ў звароце да
ічыньнікаў — «прыклад
атонцаў-экстрэмалаў варта
мерыць на сябе шматлікім
ейцам».

олькі ў калядным турніры
еістаў глябальнага
балізму. Калі ўявіць, што
ы прайгралі той кубак,
ачытаць перадавіцу ў «СБ»
вячы перад дзеясловамі

адмоўныя прыназоўнікі, то краіна здаецца амаль асуджанай: «Мы не паказалі нашым спартсмэнам, як трэба змагацца і перамагаць. Таму ім будзе ня сорамна, калі яны не падзеляцца з намі цудоўнымі рэзультатамі (заўв.: у Турыне)…»

Ці мае хоць яшчэ адзін аматарскі турнір ці від спорту такую грамадзкую вагу? Было б весела пабачыць на першай старонцы «СБ» артыкул «На пляжы Феадосіі беларускія аматары валейболу, зьеўшы кавун і раздавіўшы дзьве масандры, выйгралі ва ўкраінскіх калегаў, вызначыўшы такім чынам арыенціры новай пяцігодкі».

Як бачым, мы маем справу хутчэй зь нейкім рытуалам, чым з сапраўдным спартовым мерапрыемствам. Думка аддаць кубак іншаземцам гучыць проста па-ідыёцку. «Да, скажуць у народзе, ня той бацька ўжо, здае». Тое ж скажуць, калі майку нумар адзін усьцягне іншы. Як бачым, у турніру інтрыгавальная будучыня.

Адзіным выхадам з гэтага кола было б абраньне ў сакавіку Мілінкевіча, які, як фанат баскетболу, у духу новай каньюнктуры турнір бы прыкрыў. Сапраўды сьмешна гучаў бы у 2007-м камэнтар з спаборніцтва: «Шайба ў Мілінкевіча, ён праходзіць па флянгу, жорстка бартуе праціўніка, б'е судзьдзю клюшкай і адпраўляецца на лаву штрафнікоў».

Пакуль жа на месцы ўладаў можна было б зрабіць кампутарны сымулятар «Калядны турнір па хакеі на прызы прэзыдэнта» і арганізаваць прымусовую дыстрыбуцыю гулькі, у якой перамагаюць выключна беларусы. Гульня дапаможа нацыі залізваць раны, калі, напрыклад, у Турыне паўторыцца атэнскі аблом.

## Кіроўца аўтобуса

Я села ў маршрутны аўтобус. Падышоў кіроўца: «Ну, таварышы пасажыры, давайце я вас усіх падлічу, каб нікога не пакінуць, і мы паедзем». Аўтаматычна я павярнула галаву ў яго бок. Не беларуская мова падабалася мне ў ім, а ветлівасьць, зь якой ён зьвяртаецца да кожнага пасажыра. Гэта быў той кіроўца, пра якога ходзяць легенды, што ён развозіць усіх пасажыраў ледзьве не па хатах.

Уперадзе сядзела бабуля. Яна размаўляла па-расейску, але зь беларускімі «р» і «ч». Праз нейкі час бабуля сказала кіроўцу: «А вы ад мовы беларускай не адракліся…» «А чаго ад яе адракацца? Мы ж тут жывём, нельга адракацца». Праз колькі часу бабуля зноў распачала размову, але гаварыла гэтым разам ужо па-беларуску.

Калі прыслухацца да людзей старэйшага пакаленьня, сярод іх якраз і можна знайсьці тыя забітыя парасткі надзеі. Гэта людзі, якія вырасьлі ў вёсцы і, каб схаваць сваё «вясковае» паходжаньне, вучылі расейскую, пачыналі думаць на ёй, спрабуючы забыцца на першыя пачутыя ў дзяцінстве словы. Але недзе там, у падсьвядомасьці, жывуць гэтыя словы, на іх не забыцца, іх ня выкрасьліць з памяці. І такіх людзей шмат — тых, якія ведаюць мову, але маўчаць… А што калі зьявіцца для іх магчымасьць свабодна размаўляць так, як яны і ня раз сёньня размаўляюць са сваімі бацькамі? Што калі хоць трошкі пазбавіць іх комплексу «вясковай гаворкі»?

Мне патэлефанавалі. Заўважыла, як галава вадзіцеля нахілілася ў мой бок. На вакзале, калі я выходзіла, ён павярнуўся да мяне і сказаў: «Да пабачэньня, прыемна было чуць родную мову». «Мне таксама», — адказала я.

**Бяз подпісу**

## Ратаваньне нацыі, ці Эміграцыя

Што сёньня трэба рабіць, каб стварыць шчасьлівую, багатую і вольную Беларусь? Падпольна працаваць зь дзецьмі, падпольна выдаваць часопісы з інфармацыяй, якую прачытаюць ад сілы слухачы радыё «Свабода»? Спрачацца з малазнаёмымі людзьмі, даказваючы, што можна жыць лепей, калі яны штодня замбуюцца (а значыць, жадаюць замбавацца) БТ пра сваё ўласнае шчасьце?

З усіх заняткаў у Беларусі адзіным пэрспэктыўным бачыцца нараджэньне дзяцей. Што яшчэ рабіць у краіне, дзе нікому (за выняткам маленькай часткі эліты) нічога не патрэбна, дзе апатыя стала проста нацыянальнай рысай, — я ня ведаю.

Можна эміграваць, каб праз нейкі час пачаць свой маленькі бізнэс, пасьля зь яго зрабіць вялікі. Ці атрымаць добрую адукацыю і займацца беларускімі праблемамі навукова. Можна стварыць беларускі асяродак і займацца грамадзянскай адукацыяй беларускай моладзі, рыхтаваць беларускую эліту на эміграцыі. Карацей, ствараць інтэлектуальную і фінансавую эліту да тых часоў, калі яна спатрэбіцца беларускаму народу.

Апатыя праходзіць — раней ці пазьней. Беларускія эліты сёньня ня могуць выцягнуць з гэтага стану грамадзтва, якое гэтага не жадае. Таму час на выцягваньне таго, што выцягнуць немагчыма, лепш выкарыстаць для падрыхтоўкі таго моманту, калі грамадзтва ўсё ж вырашыць, што яно хоча зьменаў. Тады будуць патрэбны грошы й сувязі, каб падтрымаць зьмены. Тады сапраўды будзе неабходна адукаваная эліта для кіраўніцтва дзяржаўнымі структурамі на розным узроўні, для адукацыі на сапраўды сусьветным узроўні і для агромністай колькасьці іншых спраў, каб зрабіць Беларусь сапраўды шчасьлівай, багатай і вольнай.

**Біруta Янкевіч, Гомель**

## Самыя кансэрватыўныя

«Белпошта» ўсё яшчэ знаходзіцца ў абдымках савецкай імпэрыі, карыстаючыся шасьцілічбавай паштовай індэксацыяй СССР. Усе суседзі адмовіліся ад яе. Нават Украіна, якая шматкроць большая за нас, перайшла на пяцілічбавую індэксацыю, а прыбалтыйскія краіны — на чатырохлічбавую. Засталіся толькі мы ў адной зьвязцы з Расеяй.

І толькі «Белпошце» прыйшло ў голаў зьвярнуцца да РПЦ, каб яна дапамагла перакласьці на беларускую мову віншаваньне «С Рождеством». Тыя параілі — «З Раджджаством», а спрадвечна беларускае «З Калядамі» днём з агнём не адшукаем. Праўда, сёлета зьявіліся паштоўкі «Са сьвятам Божага Нараджэньня».

**Лявон Гуменьнікаў, Менск**

## З чыстага ліста

Зянон Пазьняк прапануе 19 сакавіка ісьці з сапраўднымі бюлетэнямі на плошчу («Пазьняк прапануе народнае галасаваньне», «НН», №1, 6 студзеня), аднак ня ўлічвае, што наяўнасьць уяўна «лішніх» бюлетэняў у руках людзей дазваляе пачынаць масавы хапун яшчэ да плошчы, на падыходах.

Але ёсьць і рацыянальнае зерне — зрабіць бюлетэнь індывідуальным. Адзін з варыянтаў — проста прагаласаваць за Мілінкевіча, а ў дадатак да подпісаў сакратара і старшыні камісіі — паставіць свой подпіс, трэці, за подпісамі старшыні і чальца камісіі. Пасьля ўзяць чысты ліст паперы, на ім напісаць нумар свайго ўчастку і сваё прозьвішча і ісьці на плошчу. Там сабраць гэтыя аркушы паперы паводле нумароў участкаў. А пасьля гэтага патрабаваць ад Ярмошынай і каманды паказаць бюлетэні з адпаведных участкаў і вылучыць з кожнага зь іх адпаведную колькасьць бюлетэняў за Мілінкевіча. Адзінае, што яны змогуць, — абвясьціць бюлетэні зь лішнім подпісам несапраўднымі — але тады мы выйграем выбары коштам вялікага працэнту несапраўдных бюлетэняў. І выбары проста не адбудуцца.

**Аляксей Хадыка, Менск**

## Праблема сэксу

Адказ Міколу Буслу (№46, 9 сьнежня).

Мне давялося, хай і нядоўга, пакаштаваць хлеба вясковага настаўніка. Але сышоў не праз «цяжкасьці і малааплатнасьць» (больш настаўніка ў вёсцы ніхто не атрымлівае), а праз дзяўбаньне па лініі БРСМ, савецкі нафталін у школьных сьценах, самадурства кіраўніцтва. Хоць я не адкідваю магчымасьці, што пры ўсталяваньні нармальнага дзяржаўнага ладу зноў вярнуся ў школу, дзе буду займацца выкладаньнем свайго прадмету, а не вэрбоўкай дзетак у БРСМ.

Але вернемся да сэксу. Сапраўды, супраць прыроды не папрэш. Але, як кажа філёзаф Пётра Рудкоўскі, «учалавечаньне» сэксу можа адбыцца толькі праз каханьне, а яно ў цяперашніх падлетках закінута некуды на пэрыфэрыю сьвядомасьці. У іншым выпадку сэкс набывае жывёльны характар. І такое становішча ня толькі з сэксам. Ідзе поўная дэградацыя ўсяго вясковага грамадзтва. У газэце «Борисовские новости» штонумар друкуецца «Крымінальная хроніка» па зьвестках РУУС. Валасы ўстаюць старчма: сын рэжа бацьку, 16-гадовы дзяцюк забівае пэнсіянэра. Ня думаю, што на Сьветлагоршчыне справы лепшыя.

Сп.Бусел, перакананы, што вы самі добра бачылі, для якой колькасьці тынэйджараў быў паламаны лёс праз раньнія палавыя сувязі. Адна аднакласьніца ў 20 гадоў засталася ўдавой зь дзіцем на руках, дзьве іншыя зьехалі зарабляць сваім целам у Турэччыну. І так можна доўжыць і доўжыць. Дык, можа, трэба спыніцца? А не хаваць сваю галаву ў пясок, бы той страўс. Праблема не надуманая.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

## УДАКЛАДНЕНЬНІ

Апавяданьне «Што-кольвечы пра гарадзкіх эльфаў» (№48) напісанае ня Цінай Клыкоўскай, а Крысьцінай Курчанковай. Памылка аўтарызацыі адбылася праз тое, што апавяданьне паступіла ў Рэдакцыю зь невядомага нам электроннага адрасу за подпісам «Ціна К.», які мы расшыфравалі як «Ціна Клыкоўская», бо такая аўтарка ёсьць і — зьбег абставінаў — мы якраз чакалі ад яе матэрыялу ў Калядную падборку. Зараз будзем ведаць псэўданім Крысьціны і дзякуем ёй за апавяданьне.

* * *

Генэрал Фралоў — сябар Народнай грамады, але не намесьнік старшыні гэтай партыі, як было напісана ў №48.

# Адказ на нататку Тацяны Горн

**Тое, што напісала Т.Горн пра даклад акадэміка Міхайлава ў Фрайбурскім унівэрсытэце («НН», №45) — няпраўда. Я была на дакладзе і магу з упэўненасьцю гаварыць пра поўнае неразуменьне аўтарам нататкі сэнсу сказанага.**

Гаворка ішла пра культурную ідэнтыфікацыю Беларусі ў маштабах Эўропы, сёньняшнія палітычныя і культурныя праблемы ў краіне, магчымасьці розных варыянтаў іх рашэньня. Тое, чаму быў прысьвечаны даклад і як ён быў зроблены, сьведчыла ня толькі пра неабыякавасьць А.Міхайлава ў дачыненьні да Беларусі, але й заклапочанасьць ейнымі праблемамі.

Мяне як беларуску не зьняважыла ніводнае слова ў дакладзе, больш за тое, я даўно не сутыкалася з такім поўным і аб'ектыўным аналізам сытуацыі ў Беларусі, якую не магу ацаніць інакш як катастрафічную.

Дзяржаўная ўлада ў Беларусі стварае немагчымыя ўмовы існаваньня і разьвіцьця свабоднага мысленьня і інстытутаў, здольных гэтае крытычнае мысленьне падтрымліваць. Гаворка не ідзе пра тое, што ёсьць добрыя кірунκі думкі і дрэнныя: проста ў свабоднай краіне розныя меркаваньні маюць права быць выказаныя.

Закрыцьцё Коласаўскага ліцэю, ЭГУ, незалежных СМІ — прыметы гуманітарнай катастрофы, якую толькі сьляпы можа не заўважаць. Я не разумею, чаму чалавека, які канстатуе гэтыя факты, трэба называць антыбеларусам і крытыкаваць за няслушнае прадстаўленьне краіны за яе межамі.

Праблема гуманітарных ведаў у Беларусі зусім ня ў тым, што нехта трансьлюе іх на расейскай мове, а нехта па-беларуску. Праблема ў тым, што трансьлюецца і кім трансьлюецца. Калі булачнік пячэ хлеб дрэнна, у яго не пытаюцца пра культурную ідэнтычнасьць: яго хлеб проста нельга есьці. Даруйце за спрашчэньні, але ў Беларусі сапраўды адсутнічае дастатковая колькасьць спэцыялістаў, якія маглі б выраблець і трансьляваць веды на такім узроўні, каб «прадукт» вытрымліваў канкурэнцыю ня толькі на мясцовым рынку, але й сусьветным.

Гэта занадта простае выйсьце, якое сьведчыць пра недалёкасьць тых, хто яго выбраў, — схавацца ў штучна створаных рэаліях Беларусі і крычаць, што мы лепшыя за ўсіх. Мы ня лепшыя за ўсіх. Мы іншыя, са сваімі культурнымі асаблівасьцямі, з савецкім мінулым, за памылкі якога даводзіцца расплачвацца, але гэта ні ў якай ступені не дае патураньняў і прывілей у ацэнцы ўласнага культурнага ўзроўню, хутчэй дае стымул да працы над сабой.

Спрэчкі адносна ідэнтычнасьці мне не зусім зразумелыя: я нарадзілася і вырасла ў Беларусі і нясу гэты факт над сваім існаваньнем — хочацца мне гэтага ці не, нікуды ад гэтага не падзецца. Я ня бачу прычын для сябе біць кулаком у грудзі і з гордасьцю заяўляць пра сваё грамадзянства; гэта мой асабісты выбар, і ў кожнага ён свой. Зрэшты, я ня бачу і нэгатыўных вынікаў такога стаўленьня да свайго беларускага грамадзянства.

Нацыянальная гордасьць, на мой погляд, зьяўляецца не абавязкам кожнага: падобна да аўтарытэту, яе трэба заслужыць. На жаль, я не адчуваю ў сабе ўплыву вялікай мінуўшчыны Беларусі дзесяці стагодзьдзяў назад, затое добра помню мае спачатку савецкія школы, тую рэальнасьць, у якой я пражыла 20 год. Рэгулярна чытаючы навіны пра тое, што адбываецца ў Беларусі, я адчуваю ня гордасьць, а сорам. Мне сорамна за тыя законы, якія прымае парлямэнт, мне сорамна, што ў Беларусі зьнікаюць людзі, мне сорамна за тых людзей, якія выкладаюць дзяржаўную ідэалёгію, угаворваюць дзяцей запісвацца ў піянэры, адварочваюцца, калі міліцыянэры разганяюць дэманстрацыі. Я ня ведаю, чаму я павінна ганарыцца тым, што праспэкт Скарыны перайменоўваюць у праспэкт Незалежнасьці, чаму мне павінна падабацца бібліятэка: выбачайце, але ў мяне іншыя эстэтычныя схільнасьці, і я маю права ня толькі іх мець, але і выказваць. І я разумею, што можа быць сумна прадстаўляць такую краіну, як Беларусь.

Усьведамленьне таго, што адбываецца, дазваляе дзейнічаць і рабіць што-небудзь, каб гэта зьмяніць. Мне здаецца, што прафэсіяналізм хутчэй зьяўляецца прычынай для гордасьці, чым колер пашпарта. Можна быць глуханямым, але рабіць сваю справу добра, і тады і пра Беларусь загавораць добра. Але можна і да хрыпу спрачацца пра расейскую і беларускую мовы, а потым выраблець халтуру. Я не сьцьвярджаю, што гэта ўзаемазьвязаныя рэчы, — проста хацелася б зрушыць акцэнты. Вывучаючы філязофію, я хачу зрабіцца прафэсіяналам у сваёй сфэры; калі нехта мяркуе, што прафэсійная этыка філёзафа дазваляе здаваць экзамэны ці выкладаць сам прадмет «дзяржаўная ідэалёгія», я зь ім не пагаджуся. Іншай магчымасьці займацца філязофіяй на тэрыторыі Беларусі на сёньня не існуе. Ні па-расейску, ні па-беларуску, ні па-кітайску.

Я стамілася ад ілжывых карцінак і гісторый: занадта шмат намаганьняў трэба потым для ўсьведамленьня і трансфармацыі таго, што адбываецца. У пэўны момант (а лепш адразу, калі хапае сьмеласьці) неабходна называць рэчы сваімі імёнамі. Для таго, каб вылечыць хворага, нядрэнна было б спачатку паставіць яму дыягназ. Мне, як беларусцы, стан культуры ў Беларусі зусім не здаецца здаровым. Я не разумею, чаму пра гэта нельга гаварыць. І пра што тады яшчэ нельга?

Лічу выступленьні акадэміка Міхайлава годным укладам у працэс трансфармацыі культурнай сытуацыі ў Беларусі. Адзіным прыстойным учынкам, які яшчэ можа зьдзейсьніць Т.Горн у сытуацыі, якая склалася, — гэта публічна прынесьці прабачэньні акадэміку Міхайлаву і апублікаваць абвяржэньне.

**Марыя Несьцерава**

# Дэкан факультэту славістыкі Фрайбургу: «Варта паблажліва паставіцца» да выказваньняў Міхайлава

**Марыя Несьцерава, а раней — прэс-служба ЭГУ зьвінавацілі Тацяну Горн у скажэньні фактаў. У сувязі з гэтым Т.Горн папрасіла выказацца дэкана факультэту славістыкі Фрайбурскага ўнівэрсытэту, якая таксама прысутнічала на лекцыі. Падаём тут яе адказ.**

«Сп. Міхайлаў сапраўды ачарніў сытуацыю ў Беларусі, і называць Вас, Тацяна, пры гэтым манюкаю («Заява прэс-службы ЭГУ», «НН», №45, 2 сьнежня) не было падстаў.

Так, беларуская мова, падобна да сэрбалужыцкай, даўно значыцца ў пераліку моваў, што знаходзяцца пад пагрозай. Аднак становішча беларускае мовы адрозьніваецца ад становішча сэрбалужыцкай ці іншых так званых меншасных моваў. У прыватнасьці, няма падстаў характарызаваць як непаўнавартую (minderwertig) мову толькі з прычыны таго, што на яе няма перакладаў, якія мелі б добрую якасьць. Што такое значыць «добры» пераклад?

Пэўная роля таксама належыць самасьвядомасьці нацыі ды атаясамленьню нацыі са сваёй мовай. У асяродзьдзі мовазнаўцаў гэтае пытаньне разглядаецца значна больш дыфэрэнцыявана, чым было выкладзена сп.Міхайлавым. Мяне таксама раззлавалі ягоныя выказваньні. Але, зважаючы на тое, што ён ня мовазнавец, нам варта паблажліва паставіцца да гэтага.

**Сабінэ Дзёнігғаўз,**
**дэкан факультэту**
**славістыкі**
**Фрайбурскага**
**ўнівэрсытэту».**

# Цені зьнікаюць

Якое дачыненьне маюць апошнія кадравыя перастаноўкі да прэзыдэнцкіх выбараў? Адказ шукае **Віталь Тарас**.

Крытыкаваць апазыцыю за адсутнасьць выразнай праграмы альбо стратэгіі зрабілася звыклай справай. Пры гэтым як бы само сабой мяркуецца, што ўлада сваю праграму са стратэгіяй мае. Але гэты пастулят пры больш дэталёвым разглядзе становіцца далёка не відавочным. Цяжка пазбавіцца ўражаньня, што і ўлада, і апазыцыя дзейнічаюць спантанна, выключна паводле зьбегу акалічнасьцяў. Пры гэтым акалічнасьці мяняюцца, а ўлада і апазыцыя застаюцца кожная на сваім месцы. Але бясконца доўга так заставацца ня можа — нават у Беларусі, дзе нібыта нічога не мяняецца.

## Канец старой гвардыі?

Перастаноўкі ў вышэйшых эшалёнах прэзыдэнцкай улады толькі падкрэсьліваюць нязьменнасьць палітычнага курсу. Прынамсі, уяўную нязьменнасьць. Праляскоўскі, паніжаны з пасады намесьніка кіраўніка адміністрацыі да пасады памочніка прэзыдэнта, застаецца галоўным адказным за ідэалёгію. Шэйману, пераведзенаму з пасады кіраўніка адміністрацыі на пасаду кіраўніка выбарчага штабу прэзыдэнта, даручаны, як заўсёды, самы адказны ўчастак працы. Так, некалі, у далёкім ужо 1994-м, малавядомы дэпутат Віктар Шэйман дапамагаў разам з калегам Іванам Ціцянковым абірацца Аляксандру Лукашэнку на першы (і, як высьветлілася, бясконцы) прэзыдэнцкі тэрмін. Імёны абодвух памочнікаў кандыдата атрымалі тады шырокую вядомасьць, дзякуючы «стрэлу ў Лёзна». Шэйман і Ціцянкоў апынуліся тады ў машыне разам з кандыдатам, у якога, нібыта, страляў невядомы злачынца.

Але ж нікому яшчэ не ўдавалася ўвайсьці ў адну й тую ж раку двойчы. Цяжка ўявіць, каб выбары 2006-га году адбываліся паводле сцэнару 1994-га, калі імя пераможцы заставалася не вядомае да апошняга дня. З другога боку, усе памятаюць, што кар’ера Івана Ціцянкова ў Беларусі была гэтулькі бліскучая, колькі нядоўгая. Ці не азначаюць апошнія перастаноўкі, што кар’ера Віктара Шэймана, як перад тым Латыпава, Сівакова ды шмат каго яшчэ, набліжаецца да бліскучага завяршэньня?

Даўжэй за іншых прадстаўнікоў «старой гвардыі» побач з Лукашэнкам можа застацца хіба палкоўнік Паўлічэнка. Але ж і гэтага з пэўнасьцю сьцьвярджаць нельга.

Прынамсі, нічога дзіўнага й нечаканага ў тым, што старыя паплечнікі першай асобы ў дзяржаве адыходзяць у цень альбо на нейкі час выходзяць зь ценю, няма. Іншае пытаньне палягае на тым, якое дачыненьне маюць апошнія кадравыя перастаноўкі да прэзыдэнцкіх выбараў?

Увогуле самі па сабе перастаноўкі ў сыстэме вэртыкалі ўлады нічога, вядома, не вырашаюць і не мяняюць. Наўрад ці ў культуры Беларусі, напрыклад, адбудуцца велізарныя зьмены пасьля прызначэньня міністрам колішняга намесьніка дырэктара заводу шкловалакна.

А вось перастаноўкі на тэлебачаньні маюць, здавалася б, самае непасрэднае дачыненьне да выбараў. Але дапусьціць важнасьць гэтых перастановак — значыць, дапусьціць, што ўлада ўсур’ёз рыхтуецца да выбараў, што яна не выключае зьяўленьня моцнага спаборніка, а значыць — барацьбы за прэзыдэнцкую пасаду. Само гэтае дапушчэньне выглядае абсурдным. Няўжо Беларускае тэлебачаньне за апошнія дванаццаць гадоў не апусьцілася настолькі нізка і не даказала сваёй поўнай адданасьці рэжыму, каб узьнікла патрэба тэрмінова «ўзмацняць» ягоны кадравы патэнцыял? Няўжо Азаронак ці некалі Ядранцаў, да прыкладу, былі недастаткова лаяльнымі ці не настолькі адыёзнымі асобамі, каб памяняць іх на Зімоўскага з Казіяткам? І нарэшце, няўжо ў шырокай публікі зьявіліся нейкія альтэрнатыўныя крыніцы інфармацыі, каб улада была заклапочаная прафэсійным узроўнем сваіх тэлеканалаў і ўзьдзеяньнем іх на масавую сьвядомасьць? Тады чаму ў галоўных рэдакцыях дзяржаўных выданьняў дагэтуль пануюць ціша ды спакой? Некаторыя апазыцыйныя газэты, у адрозьненьне ад радыё й тэлебачаньня, яшчэ хаця б фармальна існуюць...

## За духоўнае адраджэньне!

Паколькі цяперашні рэжым усё больш выразна набывае рысы колішняга савецкага таталітарнага рэжыму і нават гэтага не хавае, можна меркаваць, што ўсе перастаноўкі ўнутры намэнклятуры выкліканыя зусім ня зьнешнімі выклікамі альбо новымі задачамі, але выключна ўнутранымі прычынамі. Гэта могуць быць прычыны апаратныя, кланавыя альбо карпаратыўныя, але ў



Ці не азначаюць апошнія перастаноўкі, што кар'ера Шэймана, як перад тым Латыпава, Сівакова ды шмат каго яшчэ, набліжаецца да бліскучага завяршэньня?

кожным выпадку яны будуць прадыктаваныя асабістымі ці групавымі інтарэсамі чыноўнікаў, іхным памкненьнем узьняцца вышэй па бюракратычнай лесьвіцы. Аднак яны, гэтыя прычыны, ня маюць дачыненьня да рэальных патрэбаў дзяржавы й грамадзтва.

Якім бы нізкім ні быў прафэсійны ды інтэлектуальны ўзровень адэптаў сёньняшняга рэжыму, яны ня могуць не разумець, што да выбараў і дэмакратыі тое, што адбываецца зараз у краіне, ня мае ніякага дачыненьня і што ў адзінага кандыдата ад апазыцыі няма ніякіх шанцаў на гэтых выбарах перамагчы «адзінага кандыдата» ад улады. А значыць, баяцца, акрамя панскага гневу, няма чаго.

І нават калі б улада ўсур’ёз паставілася да сёлетняй палітычнай кампаніі як да кампаніі выбарчай, ёй усё адно не было б чаго паказаць выбарцам, акрамя набору пустых лёзунгаў пра беларускі дабрабыт ды лаянкі ў бок «усясьветанага імпэрыялізму». Пра гэта сьведчыць і нястрыманае захапленьне з нагоды перамогі над хакейнай швэдзкай камандай другога разраду і ўручэньне калядных прэміяў «за духоўнае адраджэньне». Нават дзіўна, што герой спэцназу Паўлічэнка сёлета не ўвайшоў у кагорту ўзнагароджаных. Праўда, Паўлічэнка ўжо атрымаў раней царкоўны ордэн. Ва ўсялякім выпадку, ён мае ня меншыя заслугі перад уладай, як ляўрэаты-«адраджэнцы» Скобелеў, Росьцікаў, Рудамётаў ды іншыя працаўнікі пяра й мікрафону (спэцслужбы, са свайго боку, таксама дбаюць пра духоўнае адраджэньне нацыі. Нядаўна, напрыклад, з нагоды 50-годзьдзя БТ прыз КДБ атрымала журналістка «Панарамы», абазнаная ў справе выкрываньня ворагаў, спадарыня Красоўская).

«Духоўную» прэмію гэтым разам, заўважым, атрымалі асобы ня проста мала вядомыя ў народзе. Гэта асобы, вядомыя сваімі заслугамі выключна сярод тых людзей, якія гатовыя служыць рэжыму самаахвярна, альбо ў асяродзьдзі вузкіх спэцыялістаў — кшталту сэрпэнтолягаў ці гельмінтолягаў. Такім чынам, улада разам з царквой нават ня выказала жаданьня прыкідвацца, быццам яна хоча навесьці нейкія масты з нацыянальна сьведамай інтэлігенцыяй. Гэтыя масты, трэба думаць, цяперашнім рэжымам спаленыя аднойчы й назаўсёды.

Але адчуваньне нейкай няўпэўненасьці ці няўтульнасьці ўсё-ткі яшчэ застаецца. Усё яшчэ хочацца выглядаць калі не цывілізаванай, дык цывільнай дзяржавай. Перад Масквой, якая ўсё даравала загадзя й Туркмэнбашы, і Карымаву, больш няма патрэбы ламаць камэдыю. На тле выродлівай рэстаўрацыі сталінскага рэжыму, сарамліва прыкрытай фігавымі лісткамі кшталту «грамадзкай палаты» ў Расеі, дыктатура ў Беларусі выглядае нават па-свойму больш годнай — прынамсі, у вачах расейскай чырвонай апазыцыі.

А што тычыцца Захаду, дык частка новай намэнклятуры ўсё яшчэ ня страціла, думаецца, надзеі яго прылашчыць, прывучыць да думкі, што рэжым у Беларусі не такі ўжо страшны. Тут прынамсі не забіваюць людзей сотнямі на вуліцах, як ва Ўзбэкістане. Дый тутэйшыя бюракраты не такія ўжо лютыя, калі знайсьці да іх правільны падыход.

## Марш пераможцаў

Але ж доўга стаяць, раскірэчыўшыся паміж дзьвюма льдзінамі, якія плывуць у розныя бакі, немагчыма. Гэта прадэманстравала пуцінская Расея, якая пэўны час «касіла» пад заходнюю дэмакратыю й гулялася ў эўрапейскія каштоўнасьці, пакуль Украіна выразна не павярнулася да Масквы сьпінай. Расейскім бюракратам шкада, вядома, заходніх інвэстыцыяў, але ж сваю прыроду не схаваеш.

Калі Захад сапраўды выразна і недвухсэнсоўна прадэманструе сваё адмоўнае стаўленьне да рэжыму пасьля сёлетніх сакавіцкіх выбараў, гуляцца далей у прадстаўніцкую дэмакратыю лукашэнкаўскай уладзе ня будзе сэнсу. Выбары патрэбныя толькі старому пакаленьню выбарцаў, якое прызвычаілася хадзіць на іх за савецкім часам паводле рытуалу. Яно паступова вымірае. Новаму пакаленьню, прынамсі большасьці яго, на выбары як на абсалютна непатрэбны інстытут будзе напляваць. Гэта азначае, што й новай бюракратыі ня будзе больш сэнсу праводзіць выбарчыя кампаніі зь некалькімі кандыдатамі. Застанецца толькі адна форма — рэфэрэндум. Ці згодныя вы, каб цяперашняя ўлада была вечнай? «За» — 99, 9%! Ці будзе гэта дэспатыя накшталт іракскай пры Хусэйне ці туркмэнскай пры Ніязаве? Тут ужо справа густу. Досьвед Туркмэнбашы выглядае больш прывабным для беларускага ўладара, паколькі Ніязаў пайшоў далей за француската караля, які сказаў: «Дзяржава — гэта я!» Туркмэнбашы гаворыць, што народ — гэта ён, і зь яго пачалася гісторыя. Тое самае, фактычна, сьцьвярджае й цяперашняя ўлада ў Беларусі.

За савецкім часам гісторыя БССР пачыналася з 1917-га году. Цяпер яна пачынаецца з 1994-га ці нават з 1996-га. Калі верыць беларускаму тэлебачаньню. Нават савецкую гісторыю там ведаць ня хочуць. Нядаўна, напрыклад, у адной з тэлеперадачаў перablыталі першага сакратара ЦК КПБ Кісялёва зь іншым партыйным кіраўніком — Аксёнавым. Падумаеш! Нават Машэрава, калі спатрэбілася, адсунулі далей ад цэнтру Менску, пераназваўшы праспэкт ягонага імя ў праспэкт Пераможцаў. Каму трэба ведаць мінулае? Няхай жыве вечна дзень сёньняшні!

Выбар, насамрэч, ужо зроблены. Выбар паміж будучым і далёкім мінулым. «Сёньня, на 88-м годзе жыцьця, не прыходзячы ў прытомнасьць, абраны на пасаду...» Гэты стары анэкдот не пра выбары кіраўніка кампартыі, гэта пра выбар народу.

У апошнія дні на тэлеэкранах можна было бачыць людзей, якія каля шпіталю ў Ерусаліме трымалі плякат: «Шарон, ты больш, чым прэм’ер. Уставай, калі ласка!» Арыель Шарон для ізраільскага народу, сапраўды, быў больш, чым прэмьерам. Ягоныя заслугі перад айчынай прызнаюць нават ворагі Ізраілю. Але абіраў прэм’ера, усё-ткі, народ, на дэмакратычных шматпартыйных выбарах. І працягваць сабе ўладныя паўнамоцтвы баявы генэрал нікога ніколі не прасіў. Не было ў гэтым патрэбы...

# Маленькая скварачка ў вялікай кашы

Працяг са старонкі 19.

прадаецца і ў прадуктовых крамах. Кожны нумар прысьвечаны пэўнай мясцовасьці і мае каляровую ўкладку з этнаграфічнымі хаткамі, народнымі строямі, зьвярамі і птушкамі. Газэта беларусаў Беласточчыны «Ніва» — у далёкім куце, заторкнутая за дзіцячыя кніжкі. Ківаю кіяскёрцы: «Ці добра «Ніва» прадаецца?» «Прадаецца».

У Супрасьлі два касьцёлы. Той, каторы бліжэй да манастыра, быў перад вайной лютэранскай кірхай. Куды падзеліся пратэстанты? Хто за немцамі падаўся на Захад, хто ўглыб Польшчы, рэшта распусьцілася між праваслаўных і каталікоў. Зранку былая кірха зачыненая. У касьцёле мша. Шэсьць бабулек у махеравых бэрэтах, ксёндз і копія іконы Маці Божай Вастрабрамскай у аўтары. «Гэта з раніцы, людзі ж усе на працы, — камэнтуе эўрапеізаваная магазыншчыца ў супэрмаркеце. — А так два касьцёлы *сябе спраўджваюць*». Зь пяці тысяч насельнікаў Супрасьлі праваслаўных сямсот чалавек. «Калі царквы не было, яны ў касьцёл хадзілі некаторыя...» «Калатні няма. Ксёндз з папом размаўляюць», — дадае стары, што падграбае лісьце ля касьцёлу.

Апошняя супрасьлеўская «калатня» тычылася «катакомбаў» — рэштказ царквы Ўваскрасеньня Хрыстова паблізу манастыра. У яе скляпеньнях хавалі заснавальнікаў Супрасьлеўскага манастыра. І пахаваньні, і сама царква былі зьнішчаны пасьля вайны. Спрэчка за гэтыя пад-


«CZASOPIS»
**У 2005 годзе манастыр у Супрасьлі атрымаў зь дзяржбюджэту Польшчы паўмільёна даляраў на рамонт. На фота: айцец Гаўрыла паказвае прадстаўнікам ураду, што зроблена.**

муркі — апошняе водгульле змаганьня за ўвесь манастырскі комплекс, які ў сваім доўгім жыцьці быў праваслаўным і ўніяцкім. Катакомбы ўрэшце засталіся за манастыром. Цяпер яны абнесеныя будаўнічай стужкай. Побач, як абярог, — праваслаўны і каталіцкі крыжы, счэпленыя супольнай папярэчынай.

## Манастыр на курорце

«У касьцёле няма такога духу моцнага, такой містыкі, як у нас. У некаторых каталіцкіх кляштарах дапускаецца, каб манахі займаліся мэдытацыямі нават нехрысьціянскіх культаў. У нас гэта непадумна. Наша крыніца — благадаць Духа Сьвятога, калі людзі зносяцца праз дапамогу духоўных цэнтраў, каторыя прасьвятляюць чалавека, даюць яму новы напрамак. Такія крыніцы духоўныя — манастыры, цудатворныя іконы, сьвятыя мошчы, Афонская гара ў Грэцыі, Кіева-пячэрская лаўра, у вас Жыровіцкі манастыр, Троіца-сергіева лаўра на Русі, другія манастыры, намоленыя вякамі, благадатныя...»

Мы гутарым з архімандрытам Гаўрылам у манастырскай перадканцылярыі. Салідная разная мэбля, фатэлі, кілімы. На сьценах — самыя розныя карціны: ад рэалістычнага Сергія Раданескага да імпрэсіяністычнага афорціка Сьвятой гары Грабаркі. Гэта ўсё падарункі манастыру ад вучняў. Айцец Гаўрыла ў манастыры ад самага яго адраджэньня. Спачатку яны тут былі ўдвох з намесьнікам. Намесьнік цяпер стаў апекуном праваслаўных салдатаў Войска польскага. «Япіскап з «калашнікавым». Лётаў летась у Ірак да сваёй паствы.

Іканапісная школа на Беласточчыне адна — у Бельску. Але пры кожным манастыры ёсьць свая майстэрня. Чым яшчэ займаецца брація? Хто на што здатны, кажа айцец Гаўрыла, робячы мне ксэру манастырскага

**Супрасьля**

— цэнтар праваслаўя на Беласточчыне. Супрасьлеўскі Дабравешчанскі манастыр — духоўны цэнтар, роўны Жыровічам. Дабравешчанская царква — шэдэўр абароннага дойлідзтва. Да 1915 тут захоўваліся мошчы сьв. Гаўрылы Заблудаўскага ды цудатворны абраз Супрасьлеўскай «Адзігітрыі». У пачатку жніўня 1915 яны былі вывезеныя ў Маскву. Абраз стуль так і не вярнуўся.

Дабравешчанскі манастыр быў заснаваны ў 1498 у рэзыдэнцыі маршалка літоўскага Аляксандра Хадкевіча ў Гарадку. Аднак ваяводзкі двор быў неспалучальны з манаскім жыцьцём. І ў 1500 г. брацыя перасялілася на бераг ракі Супрасьлянкі. З 1631 да 1824 Супрасьля была ўніяцкай.



распарадку дня. Госпад заклікае людзей у манастыр, і тыя, каторыя надаюцца да школаў, ідуць у сэмінарыю. Іншыя дапамагаюць кухарцы на кухні, нехта водзіць экскурсіі. Хто мае слых, сьпяваюць у невялікім хоры. Апроч яго пры манастыры ёсьць дзіцячы хор «Загадка». На бліскучыя кубкі, якія «Загадка» атрымала за выступы ў Грэцыі, Нямеччыне, Расеі, Беларусі, адведзеная шафка.

Айцец Гаўрыла цешыцца з курортнае будучыні Супрасьлі. Манастыр — найпершы пункт усіх экскурсіяў. «Гэткім чынам мы абуджаем у людзях цікавасьць да праваслаўя». Зьвініць званок: прыехалі школьнікі на экскурсію. Айцец Гаўрыла вядзе паказаць царкву Яна Багаслова, што месьціцца проста ў жылым корпусе, пакуль яе не запаланілі экскурсанты. Невялікі прыцемнены храм. Перад абразом Усіх беларускіх сьвятых гарыць лямпадка. Архімандрыта абрывае званок сотавага тэлефону. Манахам можна карыстацца сотавікамі. Але фатаграфаваць архімандрыт забараняе.

Каля манастырскай кухні натыкаемся на прыхілены да сьцяны чырвона-зялёны сьцяг. Мо гэта неяк зьвязана з тым, што напярэдадні манастыр наведала здымачная група БТ?

З натугай адчыняюцца каваныя дзьверы ў галоўны супрасьльскі храм. Гіганцкая, магутная на выгляд царква ўсярэдзіне не вялікая. Абарончае дойлідзтва – не паветраная готыка. Грубыя сьцены, магутныя скляпеньні, невялічкія вокны-байніцы. На трохмэтровай вышыні ад падлогі – пас беларускай цэглы. Яна сьвятлейшая за мясцовую. Айцец Гаўрыіл пстрыкае рубільнікамі і электрычнае сьвятло залівае храм. Няма яшчэ тынкоўкі, росьпісаў. Будуць фрэскі, новы іканастас, спасыдыі — спэцыяльныя крэслы, за якімі можна і стаяць, і сядзець. Асаблівы гонар айца



WWW.EXOTICPOLAND.INFO

Гаўрылы — хорас-панікадзіла з абразамі сьвятых апосталаў і прарокаў: «Такога ў вас у Беларусі няма». Тутсама — копія цудатворнага абраза Маці Божай Супрасьлеўскай. Арыгінал быў вывезены ў 1914 годзе, падчас бежанства, у Маскву і там прапаў.

Ідзём нежылым манастырскім крылом. Звонку ён мае выгляд — увесь корпус накрылі мэталадахоўкай, паўстаўлялі эўравокны. У 2005 годзе манастыр атрымаў зь дзяржбюджэту Польшчы два мільёны злотых — гэта паўмільёна даляраў — на рамонт. Але ўсярэдзіне працы яшчэ пачаць і скончыць.

Айцец Гаўрыла разважае, пазіраючы на катакомбы: «Добра па-суседзку жыць. Касьцёл у Польшчы найбольшы. Павінен памагаць меншым цэрквам. Трэба папросту быць адкрытым».

## Топ-навіна для праваслаўных

Нашы беластоцкія суродзічы паперадзе ўсіх беларусаў увайшлі ў Эўразьвяз. На гатэлі «Туркус», дзе я спыніўся, гэта яўна адбілася. Эўрапакеты на вокнах, Інтэрнэт, шьвэдзкі стол з раніцы. Праўда, зарэтушаваць размах сармацкай гасьцінасьці не ўдалося. У пакоі замест сьцяны — шафа-купэ зь люстэркамі. Адсоўваеш адну сэкцыю – трапляеш у лазенку, адсоўваеш іншую — трапляеш, уласна, у шафу. Прычым у шафу таксама трэба заходзіць. Куды там Старой Эўропе зь яе культам кампактнасьці і аляргічных калідорчыкаў. З акна «Туркусу» адкрываецца від на цудоўны барочны касьцёл — паўзьверх бэнзазапраўкі.

Беластоцкія храмы не абыдзеш за тыдзень. Іх тут больш, чым у двухмільённым Менску. Папросту сядзьце ў гарадзкі аўтобус, электроннае таблё якога паказвае, апроч інфармацыі пра маршрут, чые сягоньня імяніны. І пабачыце канструктывісцкі касьцёл, падобны як да стамбульскага мячэту, так і да менскай Опэры. Або постмадэрную царкву, архітэктар якой спалучыў готыку з уладзімера-суздальскім стылем.

Галоўны праваслаўны храм — сабор Сьв.Мікалая, побач якога месьціцца рэзыдэнцыя япіскапа беластоцка-гданьскага Якуба. У дольнай залі сабору зь верасьня ідзе польскамоўная служба. Яе ўвядзеньне было топ-навіною гэтага году.

Усяго праваслаўных у Польшчы каля 500 тысяч. Недзе палова зь іх — этнічныя беларусы. Астатнія — украінцы, палякі, лемкі. У большасьці цэркваў Польшчы служаць па-царкоўнаславянску. Толькі япіскап-патрыёт Перамышлю ўвёў у сваіх храмах — усіх — украінскую службу. На Беласточчыне скрозь па-беларуску маліліся толькі ў часе вайны. Цяпер беларускую службу можна паслухаць у адной царкве Сьвятой Сафіі ў

Працяг на старонцы 32.

**Сьвятая Гара Грабарка**

знаная з XVIII стагодзьдзя як месца паломніцтва. Гэта крыжовая гара з цудатворнай крыніцай. Манастыр там дзейнічае з 1947. Шматтысячныя паломніцтвы на Грабарку адбываюцца на сьвята Праабражэньня. Людзі прыносяць на гары і ставяць на ёй крыжы — спрадвечная беларуская традыцыя.

**Беларусы-каталікі**

У Польшчы яны ёсьць, але іх нямнога. Фэномэн Сакульшчыны цікавы. Там людзі маюць пачуцьце сваёй адрознасьці ад палякаў. Але на перапісе гавораць, што яны палякі. Бо каталікі. Беларускі ксёндз — такога на Беласточчыне цяпер няма. Каталіцкія парафіі абсаджаныя палякамі. Новых Адамаў Станкевічаў ці Вінцэнтаў Гадлеўскіх няма.

# Маленькая скварачка ў вялікай кашы

Працяг са старонкі 31.

Беластоку. Польскую — ужо ў чатырох цэрквах: ва Ўроцлаве, Варшаве і дзьвюх беластоцкіх. Служба, разьлічаная на праваслаўных палякаў, бывае раз на тыдзень у дольных цэрквах. Але хто такія праваслаўныя палякі? Ці ёсьць яны?

«Гэта людзі аднаго пакаленьня, — пэўны гісторык і багаслоў, прафэсар Антон Міранові́ч. — У наступным пакаленьні яны або пераходзяць да каталіцызму, або вяртаюцца да сваёй сапраўднай нацыянальнасьці. Сьвятары кажуць, што гэта служба для праваслаўных, якія маюць польскае нацыянальнае пачуцьцё, і для тых, хто жыве ў зьмяшаных шлюбах. Але большасьць прыходзіць туды зь цікавасьці...»

## Бардзо задаволёны

Спусьціўшыся па крутых сходах у дольную царкву пры саборы, нібы трапляеш у часы катакомбнага хрысьціянства. Пяцьдзясят прысутных запаўняюць яе ўсю. Пакуль малады бацюшка моліцца па-польску, людзі моўчкі хрысьцяцца. Калі ж чытае «Ойча наш» па-царкоўнаславянску, яго суправаджае зладжаны хор вернікаў. У царкве многа моладзі. Выпускніца Бельскага беларускага ліцэю, якая слова ў слова паўтарала за бацюшкам царкоўнаславянскія малітвы, ня лічыць, што ў Беластоку патрэбная служба па-беларуску. «У Гайнаўцы мо ці ў Бельску, але ня тут. Здаецца, і ў Беларусі больш карыстаюцца расейскай мовай...»

Тры сталыя пані ў бэрэтах першы раз тут, але «бардзо задаволёны»: «Сувязь з царкоўнаславянскай мовай перарвалася, расейскай у школах ня вучаць, дзецям ужо нічога не зразумела. Па-беларуску маліцца? Нашто? Усе ж беларусы на працы тут карыстаюцца польскай мовай. Могуць і службу разумець...»

Высокі рудаваты Вячаслаў таксама вучыўся ў Бельску («мы там многа сьпявалі па-беларуску народных песень»). Пасьля скончыў гандлёвую школу, быў на стажах у Нямеччыне, на захадзе Польшчы. Кажа, там жывуць іначай: «Не глядзяць, ці ты брат, ці сын, бяруць на працу па здольнасьцях. А тут у Беластоку…» — ён махае рукою. На польскую багаслужбу ён прыйшоў упершыню, зь цікавасьці. «У Варшаве польскую службу ўводзілі мае аднагодкі», — кажа Вячаслаў з ухвалай. Падобна кажа й Дарыюш Жданюк, кіраўнік моладзевага праваслаўнага брацтва: «У Польшчы толькі чатыры царквы, дзе служба ідзе на мове *тытульнай нацыі*».

## Качыньскі галасаваў супраць

«Для мяне гэта не пагроза, — пагаджаецца беларус-дэпутат Сойму Яўген Чыквін. — Пры маім жыцьці на польскія службы будзе хадзіць пара працэнтаў гэтых людзей. Якія і так сябе палякамі лічаць. А можа, бяз гэтага яны наагул не пайшлі б у царкву».

Ён ад 1989 году рэпрэзэнтуе Беласточчыну ў парлямэнце. Чыквін дабіваўся прыняцьця Закону аб стаўленьні дзяржавы да праваслаўнай царквы, паводле якога царкве адышла раней канфіскаваная маёмасьць. Другая заслуга Чыквіна — Закон аб нацыянальных меншасьцях. «Правыя не хацелі яго, — распавядае дэпутат, — казалі, яго прыняцьцё будзе пагражаць тэрытарыяльнай цэласнасьці. На шчасьце, Польшча ў Эўразьвязе, дзе правы меншасьцяў становяцца лякмусавай паперкай для дзяржавы. І цяпер, калі мяне журналісты пытаюць пра гэты канфлікт вакол гарадзенскіх палякаў, я кажу: Польшча прыняла такі добры закон аб сваіх мяншынях, мы маем права — маральнае — чакаць, што палякаў будуць трактаваць дастойна ў Беларусі».

Чаму выбарцы Гайнаўскага павету так масава галасавалі за Дональда Туска, хоць на Беласточчыне большасьць галасоў узяў Качыньскі? «Качыньскі — гэта правая партыя, зьвязаная з касьцёлам, — кажа Чыквін, — а нашы людзі гэтага пабойваюцца. Таму і ў «Салідарнасьць» не ішлі сваім часам, бо яна была зьвязаная з каталікамі».

## Хай яе, тую палітыку

У 2003—2005 гадах дэпутат Чыквін узначальваў польска-беларускую міжпарлямэнцкую групу. «Два пераходы новыя адкрылі: у Белавежы і на Аўгустоўскім канале... Ад Беларусі ў той камісіі Чаргінец — старшыня. Я прапанаваў: давайце нейкімі канкрэтнымі справамі будзем займацца. Палітыку тую, хай яе... І яны пагадзіліся...»

Час ад часу спадару дэпутату даводзіцца гаварыць гучней, бо за сьцяною гудзе электрадрыль. У рэдакцыі часопісу «Przeglad Prawoslawny», які займае два пакойчыкі ў адной зь беластоцкіх друкарань, скончваецца рамонт. Яўген Чыквін — рэдактар гэтага часопісу. Выходзіць «Пшэглёнд»

### Украінская альтэрнатыва

**У будынку Беластоцкай япархіі на кніжным развале, між абразоў і сьвятых кніжак, ляжыць друкаваны ўкраінскай мовай часопіс «Над Бугом і Нарвою». Гэта сьвецкае выданьне ўкраінскай меншасьці Беласточчыны. Беларускіх выданьняў там няма. Пік актыўнасьці ўкраінскага руху тут прыпаў на сярэдзіну 1990-х. Ці гэта было зьвязана з рэальнай патрэбай, ці з украінскім лобі ў епіскапаце? Думкі разыходзяцца. Нават у мясцовасьцях, дзе падляскія гаворкі бліжэйшыя да ўкраінскіх, чым да беларускіх, пераважае беларуская сьвядомасьць.**



GRZEGORZ DAMBROWSKI

**Прыезд польскага прэм'ера Казімера Марцінкевіча на калядную куцьцю да беларусаў Падляшша быў успрыняты як прызнаньне іх палітычнай ролі. На фота: за адным сталом зь Мілінкевічам і Марцінкевічам сядзеў старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы Яўген Вапа. Цікава, што палітычныя сымпатыі беларусаў Беласточчыны ў часе прэзыдэнцкіх выбараў былі на баку апанэнта партыі Марцінкевіча і братоў Качынскіх — Дональда Туска.**

па-польску, але зь беларускімі, украінскімі і расейскімі ўстаўкамі. Прадаецца ва ўсіх цэрквах. У верасьнёўскі нумар укладзеная ўлётка з справаздачай дэпутата за мінулыя чатыры гады ў сойме. У кастрычніцкім паведамлялася, што Яўген Чыквін пераабраны ў сойм 14 181 голасам. На вокладцы лістападаўскага — Яўген Чыквін з патрыярхам Алексіем II і мітрапалітам Савам.

Існаваньне праваслаўных палякаў дэпутат пацьвярджае. «Ёсьць карэнныя палякі — нямнога — якія прынялі праваслаўе. Ёсьць і беларусы, што проста ў працэсе асыміляцыі сябе адчуваюць ці дэкляруюць палякамі, хаця іх дзяды яшчэ былі беларусамі. Але яны нашы людзі. Праз два ці тры пакаленьні яны вяртаюцца да беларускай самаідэнтыфікацыі. Так што яны ня страчаныя назусім, бо праз царкву маюць кантакт з усходнеславянскай культурай».

Думку аб тым, што царква, трымаючыся царкоўнаславяншчыны, кансэрвуе мэнталітэт тутэйшага і ўрэшце спрыяе палянізацыі, ён адкідае: «Без праваслаўя не было б і беларускага нацыянальнага жыцьця!» Як прыклад — беларусы-каталікі Сакольшчыны. «Іх гаворкі бліжэйшыя да літаратурнай беларускай мовы, чым беластоцкія, але там усе лічаць сябе палякамі. Беларусы палянізаваліся, пераяжджаючы ў гарады, у зьмяшаных шлюбах. Слабае тут беларускае культурнае жыцьцё, слабыя кантакты зь Беларусьсю — ну на што абаперціся? Культура польская, і тэатры, і кіно, і музыка. Кантакты адрэзаныя яшчэ пры савецкай уладзе. А службы па-беларуску непазьбежна ўвядуць. Царква ж ня можа адмовіць, калі людзі просяць». Калі я заўважаю, што і ходзяць жа, і просяць, высьвятляецца, што ходзяць ня тыя. «Бывае так, што ў нас узьнімаюць гэтую тэму людзі ня вельмі царкоўныя. Каб пакрычаць, што няма службы па-беларуску. А як увядуць, дык ня прыйдуць...»

На гэты закід рэдактар «Нівы» Яўген Вапа адно ўсьміхаецца: «А от хай увядуць. Хай увядуць!»

## «Нейкі рытуал»

Чаму гэта так важна? «Бо праваслаўе тут яднае. Выразна, — кажа Ян Чыквін, аднафамілец дэпутата, старшыня беластоцкай суполкі пісьменьнікаў. — Ня мова. Беларусы ў гарадах гавораць папольску, у вёсках — на дыялекце. Багаслужба па-польску паскарае працэс асыміляцыі. Палякі будуць памалу націскаць на япіскапаў, каб пераверсьці набажэнства на польскую мову.

Нас змушаюць быць палякамі ў сваіх паводзінах, мове, сьвяткаваньнях. Калі ідзеш даваць імя дзіцяці, падкажуць іншае. Як адмовісься — няма расстрэлу. Але падказваюць. У школе таксама. Ледзь зьвініць званок на перапынак, настаўніца беларускай мовы гаворыць: «Прошэ цішэй!» І дзіця адчувае, што ўрок беларускай мовы — гэта нейкі рытуал». Хіба ня тое самае ў беларускіх школах Беларусі?

Нацыянальныя праблемы трансфармуюцца ў палітычныя, палітычныя — у рэлігійныя. Няма ў сьвеце ніводнай бязболеснай мяжы. І на старыя траўмы накладаюцца новыя. Беластоцкі парадокс: з аднаго боку ўсе нацыянальныя арганізацыі тут маюць дзяржаўную датацыю, зь іншага, кажа прафэсар Антон Мірановіч, дзеяньні польскіх установаў накіраваныя на тое, каб абмежаваць беларускае нацыянальнае жыцьцё. Польскай дзяржаве выгадна, каб беларускі рух быў абмежаваны да афіцыйных арганізацый, — мяркуе прафэсар. — Польская палітыка заўжды была скіраваная на апалячваньне меншасьцяў...»

Беларусы Беласточчыны многа гавораць пра асыміляцыю, пра тое, што ім няма ад каго спадзявацца помачы. І нам гэта трохі дзіўна чуць: зь Менску падаецца, што польская палітычная эліта засвоіла запаветы Гедройца. Гэты вялікі выхадзец зь Менску, паляк, бачыў у беларусах не канкурэнтаў ці варожы элемэнт, як былыя і сёньняшнія «эндэкі», а партнэра. Бяз моцнай незалежнай Беларусі ня можа быць бясьпекі Польшчы. А стабільнай дзяржаўнасьці Беларусі ня будзе бяз базы — сьвядомае нацыі.

Гледзячы зь Беластоку, менш заўважная Гедройцава лінія ў польскай дыпляматыі і фінансаваньне меншасьцяў. А вось штодзённыя крыўды даюцца ў знакі — як тая нематываваная судовая справа супраць выдаўцоў «Нівы». Хіба што візыт Ка-

Працяг на старонцы 34.

# Маленькая скварачка ў вялікай кашы

Працяг са старонкі 33.

зімежа Марцінкевіча пераканае беларусаў: Варшава ня мае намеру вяртацца да палітыкі апалячваньня.

Лукашэнкаўскім уладам нявыгадна бараніць нацыянальныя правы беларусаў Беласточчыны, бо сьледам чакай патрабаваньняў нацыянальных правоў ад уласных беларусаў. Аднак сапраўднае ўратаваньне беларусаў Падляшша ад асыміляцыі можа прыйсьці толькі з-за ўсходняй мяжы. Ня ў выглядзе састарэлых лукашэнкаўскіх танкаў. Беларуская тоеснасьць беластаччанаў пачне ўмацоўвацца тады, калі Беларусь з сатрапііператворыцца ў дэмакратычную дзяржаву. Калі Менскае тэлебачаньне стане якасным і беларускім. Калі ў праваслаўных цэрквах Беларусі пачнуць служыць па-беларуску. Калі пісьменьніка Арлова і беларускі рок перастануць забараняць у Беларусі. Калі беларускую валюту пачнуць прымаць у беластоцкіх абменьніках.

Дэмакратычнае грамадзтва Беларусі небеспадстаўна бачыць у Польшчы стратэгічнага партнэра, які, у адрозьненьне ад Расеі, ня будзе блытаць палітыку з эканомікай. Ня будзе навязваць Беларусі статус кліенцкае дзяржавы. Калісьці ж і мяжа між Горадняй і Беластокам зьнікне…

Пакуль Беларусь застаецца сатрапіяй, беластаччане могуць разьлічваць толькі на ўласныя сілы і цьвёрдасьць духу. А іх можна чэрпаць з Скарынавай Бібліі. Чаму — патлумачыў айцец Рыгор Сосна.

### Зямля Рускай Бібліі

Вёска Равалы ляжыць між Заблудавам і Бельскам. Асфальт, акуратныя хаты, ахайная царква-«мураўёўка». Побач — пяціметровы драўляны крыж, які дзіцячая рука размалявала выявамі анёлаў і сьвятых. Такую акцыю — каб дзеці ўпрыгожвалі крыжы пры цэрквах — прыдумаў мастак Лёнік Тарасэвіч.

«У нас людзкі бацюшко. Ён любога прыме», — кажа спатканая ля студні цётка, ведучы мяне да абсаджанай туямі хаты з высокім ганкам. На званок выйшаў сам айцец Сосна. Высокі, асаністы, без барады і зь белай каларaткай на чорнай кашулі. У бацюшкі госьці: прыехаў вучань, які працуе на захадзе Польшчы, прыехалі дачка і сын зь сем’ямі. Дзіцячыя галасы, на падлозе раскіданыя цацкі, вялікі стол. Госьці, спажываючы гарачыя флякі, гамоняць міжсобку «хатняй» мовай.

«Тут кажная вёска мае сваю гаворку, — кажа айцец Сосна. — Мая парафія знаходзіцца ў межах даўняга ваяводства Падляскага, а пяць кілямэтраў за рэчкай, пад Заблудаў, было ваяводзтва Троцкае. Дык тут інная мова, а там інная. Напэўно, не такая, як у Менску, але гэта мова, на якой пісаліся Статуты, на якой да 1607 году выдаваліся ўсе ўказы, фундацыі. Гэта мова Бібліі Скарыны. Для мяне найцаньнейшае, што мы нашчадкі той «рускай» мовы».


АНДРЭЙ СКУРКО

**«У нас людзкі бацюшко. Ён любога прыме». Айцец Рыгор Сосна ля сваёй царквы ў Равалах.**

Дэмакратычнае грамадзтва Беларусі бачыць у Польшчы стратэгічнага партнэра, які, у адрозьненьне ад Расеі, ня будзе блытаць палітыку з эканомікай.

Кабінэт айца Рыгора абстаўлены кніжнымі паліцамі. Кампутар зь невялікім маніторам, на іншым стале — ноўтбук. Разам з матушкай Антанінай айцец піша артыкулы і кнігі. За 36 гадоў іх назьбіралася тры сотні. Цяпер матушка складае свой радавод, а бацюшка — даведнік цэркваў Заходняй Беларусі за польскім часам. Якім коштам выдае ён свае кніжкі? «Тое, што не прап’ю, не пракуру — тое ўкладу ў макулятуру», — сьмяецца айцец Рыгор.

Прыход у яго пэнсійны. За год хрысьціў толькі двое, а пахаваў дваццаць пяць. Найменшая пэнсія ў Равалах — 150 даляраў. Маладыя выяжджаюць у гарады, шукаючы працы.

«Да 1989 году было цяжэй, — апавядае айцец. — Я добра тыя часы помню. Калі штось будуваты, трэба было прашэньне пісаць. Але давалі рады… Калі я хадзіў з калядой, заходзіў да першага сакратара партыі, дык той стаяў за дзвэрыма, а жонка прымала. А потым мы разам чай пілі. У нас не было такога, як у вас. Было крыху, дзеля страху юдэйскага. А, напрыклад, калі я бараніў царкву ў Цеханоўцы, жонкі міліцыянэраў былі маімі найлепшымі прыхаджанкамі. І яны ўтрымалі царкву. Яе хацелі ці каталікі забраць, ці на музэй. А я пастанавіў не аддаваць».

Зараз з будоўляй прасьцей. У Зьверках пад Беластокам паўстае цэлы манастыр на дваццаць манашак.

«Нас тут засталася жменька — на перапісе запісалася нас 50 тысяч беларусаў, тысяча ўкраінцаў на Беласточчыне. На такую вялікую Польшчу. Можна сказаць, маленькая скварачка ў вялікай кашы. Але стара-

емся: і цэрквы будуем, і кніжкі друкуем...»

### «Дык і я не паляк»

Асаблівасьць аўтобусных прыпынкаў Беласточчыны — адсутнасьць раскладаў руху. Усё старанна пазьдзірана і выпалена дзіцячай рукою. Ня той, што расьпісвала крыжы ля цэркваў. Таму хвілінаў сорак стаю ў Равалах, чакаючы хоць які аўтобус. Раптам побач спыняецца маленечкі «фіят»: «Да Бялэгостоку?» За рулём — сівы спадар у сінім гарнітуры пад гальштукам. «Колькі?» Усьміхаецца: «Ніц». Мушу заплаціць падарожнай гутаркай. Кажу, у якой я тут справе. «А, ты не паляк? Дык і я не паляк», — хітра ўсьміхаецца стары, пераходзячы на «рускую» мову.

Сядзьце за адзін стол зь пяцьцю беластаччанамі і вы пачуеце пяць розных гаворак. У адрозьненьне ад Беларусі, заціснутай і расьціснутай «языком міжнацыянальнага абшчэньня», тут людзі захоўваюць часьцінку сваёй малой радзімы — хатнія гаворкі. Красуе разнатраўе канчаткаў, хвалі інтанацый абмываюць старажытны моўны мацярык, на якім паўсталі нашы Статуты і Біблія. Каб беларусам зь «вялікай зямлі» гэтак змагчы, ім трэба пазбыцца комплексаў. Не абмяжоўвацца рамкамі школьнага наваязу, пазбаўленага водару скарынаўскай «рускай» мовы, якой нашы продкі гаварылі з Богам.

### Праваслаўныя і другія праваслаўныя

Прафэсар Антон Мірановіч стрымана ацэньвае сярэднетэрміновыя пэрспэктывы ўстанаўленьня Беларускай аўтакефаліі. «Для аўтакефаліі павінна быць згода ўсіх памесных цэркваў. Няможна без царквымаці рабіць аўтакефалію». Але ён з уцехаю назірае, як у Беларусі разьвіваюцца незалежныя структуры. Ёсьць мітраполія, сэмінарыі, акадэмія, манастыры. Беларускі Экзархат сам прымае пастановы, каго высьвяціць на епіскапа. На думку А.Міраноівча, «гэта ўсё вядзе да таго, што, магчыма, калі япіскапат і сабор Беларускага Экзархату захоча, патрыярхат Маскоўскі пагодзіцца». Але як каталіцкая царква цэнтралізаваная, так і праваслаўная мусіць мець пачуцьце еднасьці, нагадвае ён.

Адрозьненьне праваслаўных Падляшша ад беларускіх у тым, што яны пазьбеглі саветызацыі. Гэтыя сьвятары ніколі не дакладвалі ў КГБ. Гэтыя прыхаджане ніколі не спынялі хадзіць да споведзі. Але ня толькі ў гэтым шчасьце братоў за Белавежай. Яшчэ праваслаўнае сьвятарства на Падляшшы нашмат менш заражана грахом ксэнафобіі, сапраўднаю бядою РПЦ. Гаворыш з падляскімі тэолягамі і сьвятарамі і адчуваеш, як беражліва яны захоўваюць тое, што вялікабеларускае праваслаўе занядбала — гістарычную пераемнасьць. А яшчэ памежжа выгадавала ў іх хрысьціянскую датклівасьць.

Суіснаваньне з каталікамі выпрацавала адпорнасьць на ціск заходняй цывілізацыі. Досьвед жыцьця ў дэмакратычнай Польшчы, якая адкрылася сьвету і шпарка мадэрнізуецца, вымушае шукаць адэкватныя адказы. Не заўжды яны пэўныя — як тая апэрэткавая польская мова багаслужбы, каб быць «як усе». Але хто шукае, той знаходзіць. Мусіць жа, не «расслабленыя, разьлененыя» будуць у Бога ўгодныя…

Ці ня ў тым магла б быць гістарычная місія праваслаўных Падляшша, каб стаць рошчынай і каталізатарам вялікага беларускага праваслаўнага адраджэньня? Ці ня з Супрасьлі выйдзе першы беларускі праваслаўны патрыярх? У праваслаўных цэрквах і манастырах Падляшша жыве дух даўніх брацтваў. Для саміх беластачанаў ён такі звыклы, што аж незаўважны. А для нас зайздросны.




**Гэта ўлётка з заклікам да беларусаў не запісвацца палякамі ў часе польскага перапісу насельніцтва 2002 году.**

**Падляскія дыялекты**

«Дыялекты — гэта як музыка, як вецер, — кажа паэт Ян Чыквін. — Былі спробы пісаць на дыялектах, вось апошнюю зрабіў Ян Максімюк. Але як успыхне раз такі інфармацыйны канал, як літаратурная мова, пісаць дыялектам — вялікі крок назад».

**Антон Міраноіч**

гісторык і багаслоў. Прафэсар. Выкладае ў Беластоцкім унівэрсытэце, на найвышэйшым багаслоўскім сэмінары ў Варшаве, чытае лекцыі па гісторыі праваслаўнай царквы ў Грэцыі.

# Белы крумкач на сьнезе

Гэта для Леніна народнасьць, клясавасьць ды партыйнасьць былі нязьменнымі крытэрамі кожнага літаратурнага твору. Час паканаў клясавасьць і партыйнасьць. Выглядае на тое, што паканаць народнасьць здолела сама літаратура. Піша **Аляксандар Фядута**.

Дзьве апошнія кніжкі Алеся Разанава, надрукаваныя Ігарам Логвінавым — гэткім Марцінам Кухтам найноўшай беларускай паэзіі, — нават дызайнам сваім дзёрзка розьняцца ад усяго таго, што Логвінаву даводзіцца выдаваць. Тут няма стракатых псэўдадзіцячых плямаў і страшненькіх малюнкаў, што гадзяць кніжкі маладых паэтаў, няма тут і патугаў на найноўшы клясыцызм. Разанавы кніжкі афармленыя геніяльна проста: белы сьнег вокладкі, чорныя літары імя, чырвоныя — назову. І ўгары — яйка (відаць, калюмбава), умаляванае ў квадрат.

Ён ня вылузаўся з гэтых яек. Ён іх сам зьнёс.

Гэта не парадокс. Разанаву, зважаючы на ягонае памкненьне захаваць некранутым свой паэтычны сьвет, не да парадоксаў. Яго вершы вылучаюцца геамэтрычнасьцю, замкнёнасьцю на «эга» самога аўтара. І гэта — нармалёва. Прыпусьціць, што паэт калібру Разанава можа разьлічваць на народнае прызнаньне ці на статус, крый Божа, народнага?! Нідзе і ніколі! Яго шчасьце — у антынароднасьці, калі ўважаць за народ электарат, што гурміцца ў буфэтах на ўчастках для галасаваньня. Разанаў — не народны.

Ня ведаю, каторую з кніжак, што выйшлі ўваднначас (выдавец цьвердзіць, што мае быць працяг), сам паэт лічыць томам першым свайго opera omnia. Але «Кніга ўзнаўленьняў» успрымаецца ледзь не як маніфэст геамэтрычнасьці. Разанаў спалучае ў гэтай кнізе — хто іншы назваў бы іх перакладамі — свае спробы перапісаць сучаснай беларускай мовай — звыклай ад школьных год наркамаўкай, — перадмовы да старых кніжак, прамовы ды адозвы беларускіх асьветнікаў ад Кірылы Тураўскага і да Лява Сапегі. Ён іх — чытаў і прачытаў! А як прачытаў, дык вырашыў даць ім мажлівасьць зьвярнуцца да далёкіх нашчадкаў, каторымі, на думку аўтара-ўзнаўляльніка, усе мы з вамі, шаноўныя чытачы, і ёсьць.

Наша бяда ў тым, што Разанаў памыляецца прынцыпова. Ён насамрэч нашчадак Лява Сапегі. Але ўявіце сабе свайго суседа, каторы ад ранку, пацьверазеўшы, мусіць выслухоўваць ад паэта:

Закон
і ўсталёўваецца на тое,
каб дужы–заможны ня ўсё,
што яму зажадаецца,
чворыў.
Як зазначыў
некалі Цыцэрон,
каб маглі
мы вольнасьцю карыстацца,
становімся для таго
нявольнікамі закону.

Гэта ж бо нібы агітацыя за правы чалавека паводле Тацяны Працькі. За такое пры цары-бацюшку агітатараў цягнулі ў паліцэйскі ўчастак, у які-кольвек тамтэйшы Цэнтральны РУУС.

Але Разанаў добра ведае вартасьць слова. Высокая паэзія старабеларускага слова — не для шырокіх народных масаў. Масам — чарка са скваркай. Індывідуўму — яйкі на кніжках паэта, што стаў белым крумкачом сучаснай беларускай літаратуры. І наклад — 500 асобнікаў. Столькі, як мяркуюць аўтар ды выдавец, знойдзецца людзей, каторым слова Сапегі паводле Разанава яшчэ можа быць зразумелым.

Зрэшты, арыгінальнае паэтычнае слова, не прыбранае ў маскарадны строй шматвяковай даўніны, у Разанава таксама зразумелае толькі адзінкам.

Гукаю і чую свой голас.
Ён займае і гул ракі, і
водгульле грамады, і
цішу далёкага лесу.
І пакуль ён гучыць і, усюды
прыняты і заахвочаны
ўсюды, мае адвагу і
моц гучаць, у гэтай
краіне ён не чужы і ня
свой, а —сама,
заснаваная мной, краіна.

Гэты вэрсэт Разанава прынцыповы. Ён — як вырачэньне ад барацьбы за электарат, за масавага чытача. Сапраўды, нашто ўсё гэта? Нашто выпускаць рыфмаваныя ўлёткі, пісаць няўклюдныя вершы для мітынгаў, калі так проста сказаць самому сабе: мае вершы — гэта мая краіна, я паную ў ёй бязьмежна, і болей мне ня трэба.

Але насамрэч гэта нагадвае сэанс самаперакананьня: я чую толькі сябе, толькі свой голас, свае вершы. У нас чысты горад, добрыя і талерантныя людзі, падвышаецца вытворчасьць працы, і нават газ разы гэтак у чатыры таньнейшы, чым ва Ўкраіне.

А як жа з запаветамі Мялета Сматрыцкага?

Ці знойдзецца месца,
дзе б панавала бясьпека,
ці вышукаецца прытулак,
дзе б гаспадарыў спакой?!
У ранах і ў верадзе
дзень брыдзе,

**Працяг на старонцы 38.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алесь Разанаў.**

# Белы крумкач на сьнезе

Працяг са старонкі 36.

цягнецца ноч
ва ўздыханьнях і стогнах.
Скварнае лета морыць
мяне да млосьці,
даймае мяне да сьмерці
марозьлівая зіма.
Была я прыгожай,
а стала ўбогай,
была каралевай,
якую кахаў увесь сьвет,
а цяпер
мяне адно толькі
пагарда кахае,
мяне адно толькі
смутак цалуе.

Стары Сматрыцкі ў інтэрпрэтацыі Разанава чамусь гучыць так сучасна, як нібыта наша эпоха баракаў — дзесь на далёкай Поўначы, дзе спасярод бурых мядзьведзяў валіць лес Павал Севярынец, — ужо саступіла месца эпосе барока.

У лесе дрэвы і людзі:
той, хто стаіць нерухома на месцы, — дрэвы,
той, хто блукае, — людзі.

І паэт — чалавек. І ён блукае. І ў яго рыфмы паўтараюцца: лес — лёс.

Як выйсьці зь лесу свайго лёсу?

Вярнуцца на радзіму. Піша ж Скарына ў перадмове да кнігі «Юдыф», дзе нявольным суаўтарам Разанава выступае яшчэ і хітрамудры Адысей Хадановіч:

На ўсяземным
саборы ў Нікеі
сьвятымі айцамі
дазволена кніга Юдыф
для чытаньня нароўні
зь іншымі
сьвятапісьмоўнымі кнігамі,
каб
мы, як люстэрка, мелі
перад вачамі прыклад
гэтай найслаўнай жанчыны,
і ў добрых справах
ды ў любасьці да айчыны
упадабняліся ёй,
і ніякай працы
і скарбаў ніякіх не шкадавалі
для паспалітай карысьці
і для айчыны сваёй.

Але гэта — Скарына. А скрозь тканіну ўласных вэрсэтаў Разанава ўпарта прабіваецца другое:

Учора была сустрэча зь пісьменьнікамі з Маравіля — суседняй краіны, суседняй літаратуры…
Сёньня — працяг сустрэчы, і сёньня прыйшлі газэты,
і ўсе, хто ўчора дзяліўся ўспамінамі,
чытаў пераклады ці зьвязваў у вузлы красамоўства ніткі ўзаемасувязяў,
вышукваюць у газэтах, што пішацца ў іх пра іх.

Не хвалюйся, чытачу, гэта не пра нашых пісьменьнікаў. Пра нашых — таксама, бо пісьменьнікі спрэс аднолькавыя, як і палітыкі, — але гэтых, мяноўна вось гэтых, Разанаў убачыў у суседняй краіне — у Францыі.

Зь якое пары Францыя стала суседкай для Беларусі?

Разанаў лепш ведае. Яго краіна мяжуе з Францыяй. Там жыве Апалінэр, і там няма Азаронка. Там вечна закаханы Іў Мантан пяе свае песьні праз чорную талерку радыё — і няма Ніны Чайкі. Гэта — у Францыі. У суседзтве з той краінай, што сталася краінай Разанава.

Радуюся за абедзьве гэтыя краіны. Да іх мае дачыненьне вельмі вялікі паэт. Можа, самы таленавіты з сучасных.

А што ж тая краіна, на мове каторай ён піша з тае пары, як стаў паэтам?

Ён мне шчыра адказвае на гэта сваімі вэрсэтамі:

Шчасьце мінула, надзея зьнікла,
жыцьцё, што квітнела і вабіла,
раптам паблякла, і толькі ўзышоў з глыбіні перакуленых зьяў
і сабою праняў навакольную рэчаіснасьць адзін невідушчы,
няўлоўны, спадманлівы колер — колер навін.

Навіны зь сеціва, не з жыцьця. Колеры высахлых, зашмальцаваных джынсаў, каторыя калісь насіў малады Алесь Разанаў, каторага выключалі з унівэрсытэту за непадабенства, за паэтычную самастойнасьць, нежаданьне хадзіць у шыхце.

Ён дагэтуль не жадае ня толькі хадзіць, але і лётаць — шнуром. Ён белы крумкач. Як там у Хлебнікава?

Я — белый ворон,
Я одинок,
Но все — и темную страданий ношу,
И белой молнии венок
Я за один лишь призрак брошу:
Взлететь в страну из серебра,
Стать звонким вестником добра.

Верыў Хлебнікаў у дабро, верыў глыбока і шчыра. Нездарма пра яго хадзіла легенда: ён спаліў найлепшыя свае вершы, каб сагрэць пры дарозе ў Ніжагародзкай губэрні прыхварэлую жанчыну. Разанаў яшчэ застаецца добрым, але дзейнае дабро, здольнае стаць учынкам, для паэта — там, далёка-далёка, у часах таварыша Лява Сапегі. Ці Мялета Сматрыцкага. У сучаснай Беларусі яму цяжка знайсьці месца. Таму паэт і зьедзе зноў — тудысама. Туды, дзе п'яны зьвячора электарат ня прыйдзе на ўчастак для галасаваньня, каб зноў выпіць гарэлкі — таннай, на цэлыя дваццаць рублёў таньнейшай, вы толькі падумайце!

Ці не вінаваты ў гэтым паэт?

Ці вінаваты белы крумкач у тым, што астатнія — чорныя?

Ён зьнёс вам два цудоўныя, два мармуровай белі яйкі... То бок зборнікі, вядома ж. Абодва — на дзіва добра надрукаваныя. Адчуваецца густ паэта, што так і не дазволіў сп.Вішнёву зьняважыць яго самыя шчырыя пачуцьці.

Дый Скарына, канечне ж, — вельмі сучасны аўтар. Я б нават сказаў бы, у чымсьці сучасьнейшы ад самога Разанава.


Austrian
OE-LAM
У самалётах «Аўстрыйскіх авіяліній» пасажырам заўжды прапануюць
сьвежы нумар «Нашай Нівы».



апавесьць

# Шлях дробнай сволачы

ЕВА ВЕЖНАВЕЦ

*Праўда сякеры – хлусьня для камля.*
*Праўды ў сьвеце няма. Ля-ля.*

## I. Дажынкі

У той дзень я сядзела ў офісе й нікога не чапала, аж зззум! — пад сталом зазваніў мабільнік. Котка грызе правадок мае зарадкі, ён робіцца ўсё карацейшы, вось чаму тэлефон зараджаецца ў разэтцы пад сталом, а я лажу пад яго. Мая сястра ніколі б сабе гэтага не дазволіла — заміж падрэзваць правадок ды поўзаць пад сталом, яна б набыла новую зарадку. Уся талковасьць дасталася ёй, мне нічога не перапала. Ад яе быў і званок: кліча на абед. Сястрыца мая працуе ў газэце «Савецкая Беларусь» (ст.м. «Акадэмія навук») а я — на радыё «Вольная Беларусь» (ст.м. «Парк Сківіцоўцаў»). Калі правесьці рысу паміж нашымі канторамі, то акурат на сярэдзіне знаходзіцца дыетычная сталоўка, у якой мы зрэдку сыходзімся. Гэта недастаткова добрае месца для сястры, затое нэўтральная зямля, да якой ісьці пароўну, дый ейныя калегі не засьпеюць за крамольным кантактам. Сястра цэліць у начальніцы аддзелу. Яе завуць Віка, а мяне — Люба. Так нас назваў тата. У 1972 г. ён, вандроўны, пітушчы геоляг, які не разьведаў нічога, апрача палявога шпату, прыстаў у прымы да нашай маці, скончыў завочна на агранома і зрабіўся аседлым адмыслоўцам па кармавых культурах. Ягоныя гатункі ВДНГ прайшлі. Бацька часта кажа, што Віка названая ў гонар вікі, я — у гонар лубіну. Можа, і жартуе. Прынамсі, два гатункі ягонай рэдзькі — нашыя цёзкі. Бацька і цяпер падпрацоўвае, вырошчвае гатунковую бульбу. Ён — Герой сацыялістычнай працы. У вёсцы яго так і клічуць — Герой, нашу маці — Героіха, а нас адпаведна — героевы дзеці. Калі я зайшла ў дыетычку, Віка ўжо нэрвавалася, зьвінела пярсьцёнкамі па шклянцы.

— Ну, і чаго звала? — запыталася я.

Апошнія гады, працуючы ў розных «Беларусях», мы сустракаліся рэдка, нават да бацькоў езьдзілі паасобку. Мне здавалася, што столік падзяляе нябачная мяжа, і паветра на баку Вікі цяжкае, і рукі ў яе цяжкія і, напэўна, халодныя, па самыя пазногці налітыя здрадаю і хлусьнёй. Віка, пэўна, думае пра мяне тое ж самае. Некалькі сэкундаў мы глядзелі адна на адну зь цікаўнай агідаю.

— Бацька званіў, — нарэшце сказала Віка. У яго радыкуліт. Сена ня грэбленае. Трэба паехаць, парабіць.

— Вічка-сунічка, ды ты здурнела са сваім бацькам! Я паслала нядаўна грошай, хайноймуць каго! Я не паеду грэбці ніякае атавы. Ды ён мяне і не запрашаў.

— Ён папрасіў, каб я табе перадала. Ён табе ня звоніць, бо ведае, што ты будзеш раўсьці.

Бацька мог бы без усялякай атавы жыць на геройскую пэнсію й належаць да чыстае публікі. А калі ён унадзіўся ў сялянства, не разумею, чаму я павінна гуляць у ягонае хобі.

— Сьвінкоўскія ўчадзелі. Трэба нам ехаць, — дадала сястра. Маці й сын Сьвінкоўскія памагалі бацькам на палетку за пляшку й ежу.

— Учадзелі?

— Паставілі бражку ў печ і накрылі коўдрай.



**Ева Вежнавец** — пісьменьніца. Жыве ў Менску.

Сястрыца мая працуе ў газэце «Савецкая Беларусь» (ст.м. «Акадэмія навук») а я — на радыё «Вольная Беларусь» (ст.м. «Парк Сківіцоўцаў»).

Вэранда згарэла, а яны патруціліся дымам.

— Ой, ну хай ноймуць іншых. Калі няма грошай, я пашлю.

— Грошы я пасылала, і сумку пасылала аўтобусам. Тата просіць прыехаць. Дарэчы, там на Востраве дажынкі, я буду пісаць для «СБ» — на лічбавы. Магла б падкінуць табе запісы, ананімна, натуральна. Калярыт, лічбы, цёмнае сялянства, галасы кіраўнікоў. Табе ж ніхто слова ня скажа, сама ведаеш.

Ня скажа, каштавана ўжо. А Віцы — з дарагой душой. Яна жаданы госьць — у выканкамах, у калгасах, шпіталёх і школах, куды мяне могуць і не пусьціць, а як пусьцяць, дык няплятуць кашалёў. Дый голас не заўжды дазволяць запісаць. Але раней Віка мне ніколі не прапаноўвала падкінуць запісы — на тым яе кар’ера і стаіць. Ды і я яе не хачу падстаўляць — я ня Паўлік Марозаў.

Так і выйшла, што напрыканцы жніўня мы прыкацілі на роварах да бацькавага ўрочышча, разышліся мэтраў на дзьвесьце і пачалі зграбаць хвасьцістае сена ды насіць у копы. Я перакананая, што бацька мае на ўвазе нейкі іншы сэнс, чымся нарыхтоўка харчоў карове. Нешта кшталту выхаваньня пакорлівасьці й любові да зямлі. Віка, трыццацігадовая баба з пазногцямі ў кветачкі, цягае сена! Дый я тут не прышый кабыле хвост. Але я хоць бунтую — дастала з заплечніка плястыкоўку «джынтона». Адкрыю вам: паднявольную працу нельга выконваць без алькаголю. Усе вяскоўцы ведаюць гэтую вялікую таямніцу. Усе, апрача Вікі. Я і ня бачачы адчувала, што яна няўхвальна глядзіць на маё прыхлёбваньне. Ну й хай. Я грэбла і насіла, насіла й грэбла, пастанавіўшы, што падыму галаву толькі на сярэдзіне дзялкі. Усё было скончана за нейкія чатыры гадзіны. Месца было глухое, толькі пару разоў праехалі камбайны з дальняга поля. Мы сабраліся ехаць назад. Сястрыца акуратна навязала сахор ды граблі на багажнік ды стырно. Я закруціла шпагат абы-як. Руль не варочаўся. Спыніліся, перавязала. Я нічога ніколі не раблю як след, калі мяне прымушаюць. У Паўночнай Карэі ёсьць панятак «праца любові». Гэта бясплатная работа на карысьць грамадзтва. Ніхто не пытаецца, ці хачу я выконваць працу любові. Можа, я лічу за лепшае адкупіцца? За такімі роздумамі я не заўважыла, як мы праехалі кілямэтры з два. Мае сахор і граблі бэрсаліся. Урэшце сахаровы зуб — п-шшш! — праклюнуў мне камэру. Давядзецца ісьці пешкі. Да дому было далёка.

— Ох! — застагнала Віка. — Як я стамілася з табою, ты, вярэпаўка. Што нам цяпер, пяць кілямэтраў пешкадрала ісьці?

— Цябе ніхто ня просіць. Я павяду ровар, а ты едзь сабе наперад, праз гадзінкі паўтары дачэпаю. На прыроду палюбуюся.

Аднак Віка сьпешылася, і мы моўчкі пайшлі мераць кілямэтры.

Быў той самы час, як лета перакідваецца ў восень. Цішком змыліся стрыжы і ластаўкі, рэзкія сьвісты, крыклівыя сьцізорыкі. На кожным слупе ўздоўж дарогі парамі сядзелі буслы. Конскія каштаны яшчэ не палопаліся. Добра кінуць неаблуплены каштан за каўнер ворагу, а аблуплены, цёплы й гладкі — сябру. Зацьвіў плюшч, у ягоныя кветкі, бы п’янюжкі ў кубак, торкаліся апошнія пчолы. Мы ўвайшлі ў закінутую вёску. Ціха-глуха, як гітляроўцаў страчаюць. Жывых засталося хат дзесяць. Глогавы жываплот ля праваленай крамы. На старой бярэзіне, што працягнула галіну праз дарогу, вецер калоціць бляшаную таблічку:

«Автолавка приезжает по средам и пятницам с 15 до 17. 00. Остановка у магазина».

(На галіне б’ецца шпарка
сэрца вёсачкі Татарка :)

На такім жа дроце татарскія мужчыны вешалі старых сабак. Бывала, пойдзеш увосень па грыбы — знойдзеш шкілет на дроце.

— Ля Палавейкі можна напіцца. Помніш, у яе калодзеж на вуліцы? — кажа сасьмяглая Віка. Дый мне мласнавата пасьля хімічнага «джынтону».

Калодзеж быў на месцы, але ні аглоблі, ні вядра на жораве не было. Мы трохі парыкалі ў студню і пайшлі далей. Татарка складалася з аднае вуліцы, што цягнецца кілямэтры на чатыры. Хаты паваліліся хто куды, з паблізкага лесу па-пластунску напаўзала ажына. Аднак сады зьдзічэць не пасьпелі.

— Давай залезем у які гародчык ды наямося яблык ці якіх сьліваў, — прапанавала я. — Яйкі, млеко, курка, шпэк!

Мы загналі ровары ў густы сьліўняк, пералезьлі пахілы плот, паплецены з крапівою, ды вярнуліся ў тыя часы, калі былі сястрычкамі Любай і Вікай, хадзілі ў адну клясу й мелі адно жыцьцё на дваіх. Віка выцірала нямытыя сьлівы аб штаны. Я — банданаю.

— А сумна, што дзічэе вёска. Помніш, колькі разоў нас тата сюдою вазіў — людзей было! Дзяцей таўклося! — завяла яна катрынку.

— Няма нічога сумнага, — сказала я. — Празь дзесяць год зьнікнуць і сады, вырасьце ажыньнік і алешнік, будуць малінаўкі гнёзды віць ды ваўкі лазіць. Людзі й лясы проста ваюють зь пераменным посьпехам — то там задысьлякуюцца, то сям. Дый як тут жылі ў гэтай Татарцы — ні лазьні, ні крамы, ні садка, ні школы. Па ўсё трэба ў Дамашаны цягнуцца.

Ветраны перадвосеньскі дзень, сонца і пыл, крапіва й сьлівы. Рай, бездум, сама пасьвіцца. Мы нават ажынаў трохі знайшлі. І тут цішу парваў жаночы енк:

— Пірат, Мухтар, фас, фас! Бач, абселі, не нажаруцца ніяк!

*Працяг будзе*

## НОВЫЯ КНІГІ

**Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісьліцкі. Пруская вайна:** На лац. і бел. мовах / Укл., пер., камэнт. Жанны Некрашэвіч-Кароткай. — Менск: Прапілеі, 2005. — 234 с.

Першае ў Беларусі выданьне збору твораў беларускага лацінамоўнага паэта XVI ст. Тэксты друкуюцца паралельна: на лацінскай мове і ў перакладзе на беларускую. Да таго ж факсымільна ўзнаўляюцца першадрукі твораў Вісьліцкага. Паэма «Пруская вайна» — гераічны эпас, напісаны дыдактычным гекзамэтрам.

«Толькі ж ваюйце, прашу, бо прызначана нам перамога».

**Palyga, Artur. Kolchoz imienia Adama Mickievicza.** — Бельска-Бяла, 2005. — 160 с.

Кніга рэпартажаў польскага журналіста з падарожжа па Беларусі — па мясьцінах, апетых Адамам Міцкевічам: да возера Сьвіцязь, у Завосьсе, Туганавічы, Навагрудак… У гэтых мясьцінах, як кажа аўтар, раман 200-гадовай даўніны, што паяднаў Марылю Верашчаку й Адама Міцкевіча, у аповедах старых людзей дагэтуль мае смак скандалу. Аўтар паказвае таксама, як успрымаюць жыхары Беларусі цяперашняе жыцьцё: гутарыць з жыхарамі вёсак і гарадоў, зуброўцамі і аселымі ў Беларусі расейцамі.

**АДз**



# Знакі прыпынку

**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

Карпаратыўнасьць — вось зьява насамрэч інтэрнацыянальная.

Амаль праз дваццаць гадоў пасьля ядзернага выбуху ў Чарнобылі высокапастаўлены чыноўнік з МАГАТЭ даводзіць, што Чарнобыль — ня тое што не найвялікшая тэхнагенная катастрофа XX ст., а наагул ніякая не трагедыя. Так, драбяза, якая калі не на карысьць пайшла, дык ва ўсякім разе ня ў шкоду…

У здатнай да ўсяго прызвычайвацца чалавечай сьвядомасьці Чарнобыль усё больш пераўтвараецца ў нейкі сымбаль, вобраз, мэтафару. Але рэальны Чарнобыль — гэта ўсё ж ядзерны выбух, выкід у жывое асяродзьдзе радыяактыўных элемэнтаў, узьдзеяньне якіх вядзе да фізычнай і псыхічнай паразы людзей. У гэтым сваім узьдзеяньні Чарнобыль ня можа сам скончыцца, неяк там суцішыцца і супакоіцца — ад яго можна абараніцца толькі наступам найноўшых тэхналёгій, а калі іх няма, а іх няма, бо нямашака на іх сродкаў, грошай, дык спосаб абароны застаецца адзін — адступленьне… Што і робіцца, каб заманіць ворага як мага глыбей на сваю тэрыторыю. Гэта традыцыйная наша стратэгія, у выніку якой толькі ў адной сям’і маіх блізкіх знаёмых, Анатоля і Натальлі, сталася так, што чарнобыльскую пухліну знайшлі спачатку ў малодшага сына, а пасьля ў старэйшай дачкі. Пухліны выразалі, а дзяцей прызначылі ў інваліды. І пры гэтым на дзяржаўным узроўні (ва ўнісон з чыноўнікамі з МАГАТЭ) не саромеюцца даводзіць, нібы Чарнобыль, як той чорт, не такі ўжо страшны, як яго малююць, а асобным людзям радыяцыя можа пайсьці нават на карысьць. Ну, відаць, маецца на ўвазе тое, што ўсе беларусы — людзі нейкія асобна-асаблівыя.

Так ёсьць — і не магло, і ня можа быць іначай у Беларусі, якая насьледуе дзяржаўныя традыцыі той краіны, у якой машыны, зброя, наагул любое жалеза мела свой кошт, сваю цану, і толькі чалавечае жыцьцё не каштавала нічога. Ну, загіне дзесяць, дваццаць, трыццаць мільёнаў, пакладзецца трыста тысяч — зь іх, дарэчы, палова беларусаў — у самым канцы вайны на нікому ўжо не патрэбных Зэелаўскіх вышынях, ну дык што — бабы новых народзяць. Затое першымі ў Бэрлін увайшлі, амэрыканцам клізму ўставілі.

У траўні 1986 году, калі я прыехаў у Чарнобыль, там тварыўся суцэльны бардак: усё нібыта ахоўвалася — і не было ніякай аховы, можна было залезьці хоць у сам рэактар. Яшчэ нават не пазьбіраныя былі, выбухам выкінутыя з рэактара, кавалкі графітавых стрыжняў — і ўбачыў я не жалезных робатаў, а жывых людзей, апранутых у халаты хімабароны (нібыта супрацьрадыяцыйныя), маладых салдацікаў, сьмертнікаў, якія звычайнымі шчыпцамі з падоўжанымі ручкамі тыя графітавыя кавалкі зьбіралі. Яны зьбіралі сваю сьмерць, але не разумелі, што рабілі, а тыя, хто разумеў і пасылаў іх на гэта, — разумелі, пасылалі і маўчалі. Маўчалі доўга, а калі ўжо вымушаны былі нешта казаць, дык казанка тая ў вуснах самага *галоснага* кіраўніка дзяржавы Гарбачова скіравалася да Захаду, да перапалоханых немцаў, французаў, бэльгійцаў, але не да сваіх.

Убачыўшы ўвесь гэты жах, я спытаўся ў акадэміка Веліхава, які кіраваў тады (разам з акадэмікам Лягасавым) усімі і ўсім у Чарнобылі: ну як, скажыце, такое можа быць?! І ён даволі доўга тлумачыў мне сутнасьць закону вялікіх лічбаў… Пасьля тлумачэньняў я сказаў яму, што зразумеў-такі сутнасьць гэтага складанага закону: бабы новых народзяць.

Пазьней, ужо пад восень, я паехаў у Чарнобыль з кінагрупай, і мы зьнялі там фільм, у якім цэнзары зь Міністэрства сярэдняга машынабудаваньня — назву ж якую прыдумалі для атамнай прамысловасьці! — пакінулі толькі тое, што сьведчыла пра гераізм і патрыятызм (што, безумоўна, было), але без аніякіх салдацікаў са шчыпцамі… Перад гэтым былі зьнішчаны стужкі, зьнятыя групай, у якую ўваходзіў мой сябар Анатоль Ярась — ён памёр ад раку.

Наш фільм ніякавата было глядзець, але і нічога ўжо нельга было ў ім выправіць: адзьнятыя матэрыялы ў нас пазабіралі. Тады зь іншай творчай групай я сабраўся ў Маскву, каб зрабіць тэлепраграму з акадэмікам Лягасавым, але, пакуль мы зьбіраліся, ён скончыў жыцьцё самагубствам, павесіўся. Нехта казаў, што менавіта праз тое, што сталася ў Чарнобылі (Лягасаў быў адным з праектоўшчыкаў рэактару), нехта называў іншыя прычыны…

Зьнялі мы ўрэшце тэлеінтэрвію з акадэмікам Веліхавым, які, усяляк зацямняючы сутнасьць праблемы, усё стараўся пераскочыць на высакалобую балбатню… Але ўсё ж на некаторыя пытаньні быў змушаны адказаць наўпрост. Я спытаў: «Калі б нават не ў 30-кілямэтровай зоне, а ў 100-кілямэтровай аддаленасьці ад яе, дзе-небудзь на Магілёўшчыне ці Гомельшчыне, жыў нехта з вашай сям’і, што б вы зрабілі?..» І ён, пакруціўшыся трохі вакол розназўзроўневых дозаў радыяцыі, усё ж адказаў: «Вывез бы, бо жыць там нельга. Калі, вядома, жыць, а не паміраць…»

А мы вось, хто не памёр, жывём… І карумпаваныя чыноўнікі з МАГАТЭ разам з нашымі дзяржаўнымі кіраўнікамі даводзяць, як і ад пачатку даводзілі, што Чарнобыль нам зусім ня ў шкоду, калі не на карысьць.

## Ляксей Папоў

МАЯ РОЛЯ

Мне гэтай ролі не забыць,
Такі мой лёс, такі мой боль —
Ісьці за праўдай у агонь,
Ісьці па сьвет... ды цемрай жыць.

Такіх мільёны нас ідзе —
Усе па лепшы лёс у ноч,
Усе па смагу ў моцны дождж.

Бязьлітасна натоўп бяжыць,
Абцасы жудасна гучаць,
Бягуць усе сябе хаваць
...А костка пад нагой хрусьціць.

Такая роля у мяне —
Бегчы ад іх... ды ад сябе.

## Анатоль Трафімчык

З ВАСІЛЯ СІМАНЕНКІ

* * *

Я не памру ад роспачнае скрухі,
Адно самотнай ноччу па вясьне
Прысьню: тваё абдымуць рукі
І сіні, ясны погляд ахіне.

Ты будзеш побач кожнае імгненьне,
Ты застанесься ў яве, а ня ў сьне.
Зацьміш вачыма зорачак зіхценьне,
Паліцьмеш жарсьцю прагнаю мяне.

І дзень за днём чакаю і такую,
І дзе б ні быў, усюды лёс малю
Сустрэць цябе — адзіную такую,
Пяшчотную дзяўчыначку маю.

## Сяржук Жыцень

лепш
піць са сваіх начовак
чымся з чужога
калодзежу
ды хадзіць ва ўласным рызьзі
чым у анучах
з сэканд хэнду
адно насіць
з сабою заўжды
не чужую але сваю
душу ды
глядзецца ў свае
старыя дзіравыя ад галоты
але
начышчаныя боты
і бачыць адлюстраваньне
ўласнай усьмешкі

адсутнасьць…
ад сутнасьці
пахне вадою
калі зазіраеш
за небакрай
шпацыруючы
адбіткамі сонечных косаў
лябірынтамі
ненароджаных
думак

бяздоньне…
думаць пасьля
сутоньня
зоры ў вочы
вочы ў зоры
шляхам ісьці
малочным
ці ехаць возам
малым вялікім
за Сонцам
за Ліхам

## Юзік Дзенісюк

МАРЫ БАМЖА

Сяджу ў закутку,
Саплямі граю.
Ў чужым абутку
З чужога краю.

Ў чужой адзежы
З таннага шопу.
Чужая ежа…
Віват, Эўропа!

Сваю хаціну
Заклаў у банку
І, як дзяўчыну,
Спадобіў шклянку.

Прапіў ўсе грошы
І хату страціў.
Пасу я вошы
У цеплатрасе.
І там, дзе сьметнік,
Дзе ёсьць шклатара,
Парою летняй —
Мае Канары.

Зімой дык горшай —
Сьнег замятае.
Мне як бы ў Польшчу,
А там… ў Ізраіль.

Людцы там кемяць
Ў кашэрным мясе
І пасьвяць kemel
Ня ў цеплатрасе.

Там і зімою
Рунее траўка.
Лыгнуў напою —
Ляжы, ня гаўкай.

Ну а шклатары
Ад «белабрысай»
Ля шопаў, бараў —
Хоць заваліся.

Ой, мары-мары —
Хоць цешаць старасьць,
Ды ні паўкроку
Да той Эўропы!

## Віталь Рыжкоў

СПРАВАЗДАЧА ПА РОСПАЧЫ

Мне сумна.
Шпурнутая ў сьпіну сьнежка — мэтафара сумы
атрыманых ведаў у барацьбе са звыкласьцю:
зьмяшалася ўсё ў адну біблейскую суну,
зьліплася…

Зьліліся
разуменьні сэнсаў *існаваньня* ды *існасьці* —
вось так перастанем
    адрозьніваць з часам
    адценьні.
І ня ў вочы будзем глядзець,
а крываваць: «Зьлітуйся!» —
і не чалавеку,
а — ценю.

Па адзеньні,
як павялося, мяне сустрэнуць,
    праводзяць па розуме:
нехта прыме маё, нехта скрывіць сківіцы…
Мы ўсе пражываем жыцьцё па-рознаму:
бог глядзіць на нас —
    толькі дзівіцца.



# Капітан Джанатан

Капітан Джанатан,
Малалетні хуліган,
Лавіў птушак.
Пэлікан
Трапіў да яго ў капкан.

Зьнёс яйко той пэлікан,
Не яйко, а цэлы збан.
Зь яго — бачыць капітан —
Лезе другі пэлікан.

А той другі пэлікан
Зьнёс яйко, як цэлы збан.
Зь яго — бачыць капітан —
Лезе трэці пэлікан!..

Так бы й лезьлі без канца
Тыя пэліканы вечна,
Калі б з трэцяга яйка
Не зрабілі мы яечні, —
Цок!

**З францускай паводле Рабэра Дэсноса і з украінскай паводле Дмітра Паўлычка перапяяў Мікола Бугай**

# Вясёлая партыя

Кожнаму шашысту бывае крыўдна атрымаць пазыцыю, калі яго шашка (або некалькі шашак, радзей дамка) ня маюць куды рухацца. У шахматах такое становішча завецца патам і дае нічыю слабейшаму боку, аднак у шашках адсутнасьць руху тоесная паразе. Для запёртага матэрыялу ёсьць народнае азначэньне — «сарцір». Але, мабыць, этымалёгія ўзыходзіць да французскага «выйсьці» (sortir). Гэткі адмысловы гумар: як суперніку няма куды хадзіць, гулец падахвочвае яго да нейкага там выхаду…

У пачатку партыі белыя і чорныя маюць па 12 шашак. Здавалася б, які-кольвечы пільны шашыст не дазволіць паставіць сабе аж 12 «сарціраў». Аднак, як сьведчыць менскі трэнэр Анатоль Аніська, на клясычны кручок трапляюцца ня толькі пачаткоўцы. Партыя была згуляна ў першынстве Маскоўскага раёну сталіцы сярод жанчын.



1. e3-d4 d6-e5 2. a3-b4 h6-g5 3. g3-h4 b6-a5 4. b2-a3 g7-h6 5. b4-c5 g5-f4 6. f2-g3 c7-b6 7. g1-f2 b8-c7 8. a3-b4 h6-g5. Малпаваньне гульні партнэркі не зашкодзіла чорным. У шахматах яно абышлося б значна даражэй. 9. f2-e3? Трэ было ісьці на разьмены: 9. d2-e3 f4:d2 10. c1:e3 e7-d6 11. c5:e7 f8:d6 12. g3-f4 e5:g3 13.h2:h6 і г.д. 9…c7-d6 10. c1-b2 f8-g7 11. b2-a3 g7-h6 12. a1-b2 h8-g7 13. e1-f2 d8-c7. Усё! (Гл. дыяграму.) З прычыны ўласнага пройгрышу белыя здаліся.

**ВР**

## Вечарына Някляева

12 студзеня а 18.30 паэт Уладзімер Някляеў разам з Саюзам беларускіх пісьменьнікаў ладзіць вечарыну паэзіі і прэзэнтуе сваю кнігу «Так».

Паэта віншуюць пранікнёнымі словамі, вершамі і песьнямі вядомыя творцы, барды і грамадзкія дзеячы.

У сувязі з пашырэньнем дэмакратыі замест уваходных білетаў ласкавая просьба захапіць пашпарты.

**Дом літаратара (Менск, вул.Фрунзэ, 5).**

## 19 студзеня

у Чырвоным касьцёле

адбудзецца чарговае паседжаньне клюбу каталіцкай інтэлігенцыі імя сьв. Кірылы Тураўскага. Ксёндз пробашч Радашковіцкае парафіі Аляксандар Тарасэвіч чытае лекцыю «Каталіцка–праваслаўны дыялёг».

**Пачатак паседжаньня а 19:30.**

# «Песьні свабоды»: складзем дыск разам!

Увага! Рыхтуецца да выданьня альбом беларускай музыкі «Песьні Свабоды».

Выдаўцы зьвяртаюцца да чытачоў «Нашай Нівы» з просьбай прапанаваць пяць песень, якія найбольш вартыя для гэтай складанкі.
Просьба запоўніць купон і даслаць на адрас: **а/с 5, 220085 Менск, (для Віталя). Таксама можна скарыстацца e-mail: pesni2006@tut.by.**

Кожны, хто дашле купон, атрымае ў ПАДАРУНАК кампакт–дыск! Дасылайце купон да 15 студзеня. Выканаўцы, што жадаюць прапанаваць свае творы, могуць зьвяртацца па вышэй пазначаных кантактах.

| **Назва гурту** | **Назва песьні** |
| --- | --- |
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |
| **Імя** | **Кантакт (e-mail, тэлефон)** |



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зрабі з газэты кнігу

«Нашу Ніву» ў новым фармаце зручна пераплятаць у квартальнікі ці гадавікі.



**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284–68–18, 284–72–17, 284–81–07,
8–029–6–400–100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284–81–84,
284–32–72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285–79–29,
8–029–645–99–54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284–37–07,
8–029–622–83–01,
8–029–622–83–04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22–77–133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8–029–388–40–82,
8–029–570–74–11,
8–029–400–48–55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8–029–758–06–16, 774–62–13,
8–029–341–17–29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211–00–63/64/65, 226–45–48,
8–029–643–80–77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*(На сцэне Цэнтральнага Дому афіцэраў)*
**14** (сб) — вечар аднаактавых опэр: «Рыта, альбо Піpацкі трохкутнік», «Нататкі вар'ята».
**15** (ндз) — «Князь Ігар».
**17** (аўт) — «Іялянта».
**20** (пт) — «Багема».
*(На сцэне Белдзяржфілярмоніі)*
**18** (ср) — «Лючыя ды Лямэрмур».

**Купалаўскі тэатар**
**14** (сб) — «Чычыкаў».
**15** (ндз) — «Я не пакіну цябе...».
**16** (пн), 20 (пт) — «Сымон-музыка».
**18** (ср) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».

**Малая сцэна**
**15** (ндз) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**19** (чц) — «Адчыніце кантралёру!».

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**Паўночная зямля**
Драма, ЗША, 2005, рэж. **Нікі Кара**.
У ролях: **Шарліз Тэран**, **Фрэнсіс Макдорманд**.
Каб пракарміць двух дзяцей, гераіня наймаецца ў шахту. У мужчынскім калектыве свае законы.
**Менск, Кісялёва 12, т.643-21-08.**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Дыкенз сустрэў Паланскага

**Олівэр Твіст (Oliver Twist)**

**Вялікабрытанія—Чэхія—Францыя, 2005, каляровы, 135 хв.**

Жанр: **сямейная мэлядрама паводле аднайменнага раману Чарлза Дыкенза**.

Адзнака: **6,5** (з 10).

Калісьці Эйзэнштэйн назваў Чарлза Дыкенза найкінэматаграфічным пісьменьнікам і на прыкладзе «Олівэра Твіста» даказаў, як трапна ангелец стварае саспэнз. Ня дзіва, што майстар саспэнзу Раман Паланскі і Дыкенз нарэшце сустрэліся.

Саспэнз туманам разьліты ў кадры, чвякае гразь пад разьбітымі нагамі, камэра ловіць лахманы жабракоў і страшныя фізіі. Пэрсанажы раману ў фільме набылі гратэскныя рысы з «Жыльца» — але не настолькі, каб палохаць дзяцей. А мэлядраматычны сюжэт не засалодкі, каб адшурхнуць дарослых.

Годнае, касьцюмнае й стрыманае відовішча. Толькі крыху грувасткае — празь вернасьць першакрыніцы. А Бэн Кінгсьлі зьзяе ў ролі злодзея Фэджына.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 14 студзеня

**НТВ, 20.35**
«Вам ліст».
ЗША, 1998, рэж. Нора Эфран.
Рамантычная камэдыя.

Кэтлін (Мэг Раян) знайшла Джо (Том Хэнкс) у сеціве. Юнак дасьціпны й абыходлівы. Адначасова гераіня знаёміцца з кніжным магнатам, непрыемным тыпам і канкурэнтам, які пагражае зьнішчыць яе працу…

### Нядзеля, 15 студзеня

**НТВ, 21.05**
«Сонная лагчына».
ЗША, 1999, рэж. Цім Бёртан.
Містычны трылер паводле твору Вашынгтона Ірвінга.

Канстэбль паліцыі прыяжджае ў мястэчка, дзе містычны коньнік адсякае галовы месьцічам… У галоўнай ролі — харызматычны Джоні Дэп.

**БТ, 22.20**
«Скарб».
ЗША, 2003, рэж. Эндру Дэвіс.
Прыгоды паводле аднайменнай кнігі Луі Сашара.

Над сям'ёй Стэнлі Ілнэтса вісіць праклён: усіх мужчынаў ягонага роду чакаюць прыгоды. Вось і сам Стэнлі трапіў у лягер па ілжывым абвінавачаньні ў злачынстве.

### Аўторак, 17 студзеня

**НТВ, 21.40.**
«Афэра Томаса Краўна».
ЗША, 2002, рэж. Джон Макціpнан.
Рамантычны трылер.

Міліянэр Томас Краўн дзеля азарту крадзе карціну з музэя. Сэксапільная страхавы агент спрабуе адправіць Краўна ў турму. Гульня прафэсій, вайна полаў. У ролях: Пірз Броснан, Рэнэ Русо.

### Чацьвер, 19 студзеня

**НТВ, 21.40.**
«Глыбокае блакітнае мора».
ЗША, 1999, рэж. Рэні Харлін.
Трылер жахаў.

У лябараторыі акулам павялічваюць мозг. Але паразумнелым драпежніцам няволя не даспадобы... Камэрцыйныя акуліны жахаўкі, расквечаныя камэдыйным кухарам-недарэкам.

**БТ, 00.10**
«Люстэрка».
Расея, 1974, рэж. Андрэй Таркоўскі.
Філязафічны фільм-сон, споведзь.
Абсалютны шэдэўр Андрэя Таркоўскага.

**Андрэй Расінскі**


ЯКУБ КОЛАС
Сымон–музыка
містэрыя ў 2–х дзеях
16, 20, 30 студзеня
пн., пт., пн.
Купалаўскі тэатар
вул.Энгельса, 7

## У НУМАРЫ

### Чаргінца падвяло славалюбства



Брытанскае пасольства выкрыла генэрала Мікалая Чаргінца. **Старонка 5**.

### Маці і айчым забітай журналісткі



Веранікі Чаркасавай атрымалі ліст ад унука Антона Філімонава, арыштаванага па падазрэньні ў падробцы грошай. **Старонка 13**.

### Геаграфія падпісчыкаў «НН»



Статыстыка па гарадах і рэгіёнах. **Старонка 9**.

### Белы крумкач на сьнезе



Наша бяда ў тым, што Разанаў памыляецца прынцыпова. Піша Аляксандар Фядута. **Старонка 36**.

### Шлях дробнай сволачы

Сястрыца мая працуе ў газэце «Савецкая Беларусь» (ст.м. «Акадэмія навук») а я — на радыё «Вольная Беларусь» (ст.м. «Парк Сківіцоўцаў»). Калі правесьці рысу паміж канторамі, то акурат на сярэдзіне знаходзіцца дыетычная сталоўка, у якой мы зрэдку сыходзімся… Вострасюжэтная аповесьць Евы Вежнавец. **Старонка 40**.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КНІГІ, МУЗЫКА, ВІДЭА

**Прапануем** распаўсюднікам шырокі асартымэнт айчыннай музыкі розных стыляў (Данчык, Сокалаў-Воюш, Равенскі, Забэйда-Суміцкі, «Guda», «Яр», «Троіца», «N.R.M.», «Сьвяты вечар», «Я нарадзіўся тут». а/с 5, 220085 Менск; Тэл.: 649-08-88; e-mail: w1979@tut.by

**Маю польскую кнігу** аб беларускім нацыянальным руху 1928 г. выданьня. E-mail: btclub @tut.by. Алег

**Набуду падручнік** «Беларуская мова» Нісьневіча для ВНУ, пажадана канца 1960-х. E-mail: kardonski@tut.by

**Прадам кнігі:** Л.Геніюш «Споведзь», «Беларуска-расейскі слоўнік» (1926) Байкова, Некрашэвіча, «Тэўтонскі ордэн», М.Ткачоў «Абарончыя збудаваньні заходніх зямель Беларусі 13—18 ст.», Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» 1924 г. «Граматыка» Б.Тарашкевіча, «Энцыкляпэдыя беларускай мовы», Кацар «Беларускі арнамэнт» ды шміат іншага. Т.: 753-70-05

**Альбом «Менск — горад СОНца»**, пераклады: кнігі, перакладзеныя з польскай, ангельскай, нямецкай, расейскай моваў, у тым ліку «Дзяды», «Санэты» Міцкевіча, літаратура беларусаў Польшчы XV—XIX ст., падручнікі па журналістыцы. Т.: 753-91-96

**«Наша Ніва»**, часопісы «Arche» ды «Спадчына», кнігі, відэа ды аўдыё для дзяцей, беларускія ды літоўскія слоўнікі, замежная клясыка па-беларуску, навуковая літаратура, фільмы ды музыка на CD, шалікі, сьцягі, значкі, паштоўкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (14:30—19:30). Т.: 707-40-01

**«Крывіцкія руны. Беларускія пісьменнікі Латвіі»** — К.Езавітаў, В.Ластоўскі, П.Мядзёлка — яшчэ ёсьць у «Акадэмкнізе»

**Беларускі кнігазбор**. Новыя кнігі: Р.Крушына, Ф.Аляхновіч, Я.Скрыган, — найлепшы падарунак

**Шукаем тэрмінова відэафільмы**: «Данчык», «Вяртаньне Міхася Забэйды», пра Міколу Равенскага, Ларысу Геніюш і інш. Т.: 649-08-88, 249-08-88

**Кнігі Севярынца** — на Ўправе БНФ (Варвашэні, 8)

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ЖАРТЫ

Натальля Пяткевіч журналістам: Ёсьць меркаваньне, што пасьля выбараў таварыш Шэйман, як чалавек вайсковы, можа зноў узначаліць Раду бясьпекі…

Журналіст да Пяткевіч: А што, ён ужо знайшоў працоўнае паразуменьне з Аляксандрам Уладзімеравічам Мілінкевічам?..

* * *

Маці корміць маленькага сыночка кашай.

«Ну, зьеж, калі ласка, яшчэ лыжачку. Вырасьцеш, будзеш такім... — глядзіць на мужа, які сядзіць насупраць — і з агідай кідае лыжку на падлогу: Бог зь ёй, сынку, з тэй кашай».

**Постмадэрн!**

*Пытайцеся ў кнігарнях кнігу Сяргея Балахонава «Імя грушы»*




## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Міколу Я. з Чудзенічаў, Лагойскі раён.** Дашліце матэрыял пра аграгарадкі ў Мінсельгасхарч. Хай разьбіраюцца. А мы будзем рыхтаваць да друку кавалкі зь яго.

**Сяргею М. зь Вялейкі, Галіне С. з Глыбокага.** Газэта аддае перавагу матэрыялам, прысьвечаным 25, 50, 75-гадовым юбілеям і г.д. Крок календара 25 гадоў — наша традыцыя. Калі хочаце пісаць пра К.Акулу, якога мы любім і шануем (дарэчы, ён застаецца падпісантам «НН»), мусіце шукаць новыя факты й сюжэты зь ягонага багатага жыцьця. Напісанае Вамі не інфарматыўна.

**Алесю з Гомелю.** Няхай Новы год прынясе Вам болей беларускамоўных сяброў. Хай Вам трапяцца таксама такія скарбы беларускія культуры, якія зачаруюць таксама Вашых сямейнікаў.

**Віктару Ж. з Баранавічаў.** Каб набыць відэакасэты з мультфільмамі па-беларуску, патэлефануйце 8-029-643-57-33. www.knihi.net.

**Мікалаю Б. з Малой Беліцы, Сеньненскі раён.** У вершах ёсьць радкі, што высякаюць іскры. Але для абранага Вамі жанру «народнае паэмы» — складана пішаце. Такія вершы будуць пераказваць з вуснаў у вусны, калі яны максымальна ясныя і простыя.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**В. Пасадцы,** Віл. губ. Вялейск. пав. Здарылася сёлета, што даў я майму таварышу ў мястэчку Вязынь (Вялейск. пав.) некалькі нумароў «НН». Праз колькі тыдняў ізноў мы ўбачыліся, ажно ён просіць яшчэ газэты. Аказалася, што ён даў іх штырніку, каторы ганяе плыты па Нёмане ў Коўну і Вільню. Гэты чалавек, сабраўшы сваю хеўру штырнікоў — каля 30 чалавек, у ночы на беразе Нёману ля вогнішча чытаў ім «НН». «Шмат гарэлкі, — казаў ён, — выпілі б яны за гэту пару, але знайшлося лякарства!..»

**Зьмітрок Бядуля**

**«НН». 1911. №2. 13 студзеня**